Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Беларуская мова і літаратура

5-6 *класы*

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

2012/2013
навучальны год

Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Беларуская мова і літаратура

5-6 *класы*

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
«Аверсэв»
2012

УДК 373.5.016:811.161.3+821.161.3.09
ББК 74.268.0(4Беи)
Я40

Серыя заснавана ў 2006 годзе

Язерская, С. А.

Я40 Беларуская мова і літаратура. 5—6 кл. : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / С. А. Язерская, Л. К. Цітова. — Мінск: НІА : Аверсэў, 2012. — 123 с. — (Бібліятэка настаўніка).

ISBN 978-985-559-102-4 (НІА)
ISBN 978-985-19-0154-4 (АВЕРСЭВ)

УДК 373.5.016:811.161.3+821.161.3.09
ББК 74.268.0(4Беи)

Вучэбнае выданне
БІБЛІЯТЭКА НАСТАЎНІКА

Язерская Святлана Анатольеўна
Цітова Людміла Канстанцінаўна

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА
5—6 класы
Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне
Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

Адказны за выпуск *Д. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк 17.05.2012. Фармат 60×84 1/16. Папера друкарская.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 5,35. Тыраж 3100 экз. Заказ 3928

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494469 ад 08.04.2009.
Вул. Караля, 16, 220004, Мінск.

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
ЛИ № 02330/0003944 ад 03.02.2009. Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск.
E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78.
Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП № 02330/0494165 ад 03.04.2009.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, Віцебск.

ISBN 978-985-559-102-4 (НІА)
ISBN 978-985-19-0154-4 (АВЕРСЭВ)

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2012

Прадмова

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне распрацавана ў адпаведнасці з праграмамі па беларускай мове і літаратуры для 5-х і 6-х класаў, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2012 годзе. У планаванні рэалізуюцца патрабаванні адукацыйнага стандарту па прадмеце, вызначаецца паслядоўнасць урокаў, у тым ліку і ўрокаў развіцця маўлення і пазакласнага чытання.

У аснову планавання ўрокаў беларускай мовы пакладзены сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны і лінгвакультуралагічны падыходы, а таксама прынцып сістэматычнага паўтарэння і паглыблення ведаў вучняў, які прадугледжвае зварот да пройдзенага ў папярэдніх класах.

Планаванне па беларускай літаратуры прапануе размеркаванне вучэбнага матэрыялу (у адпаведнасці са зместам і структурай праграмы і вучэбнага дапаможніка) па раздзелах, у кожным з якіх — свае пазнавальныя, дыдактычныя, выхаваўчыя задачы.

Выданне мае на мэце дапамагчы настаўніку ў наладжванні навучальнага працэсу, але не павінна стрымліваць яго ініцыятыву і творчы падыход да выкладання прадмета. Настаўнік можа размеркаваць вучэбны матэрыял па-іншаму, улічваючы асаблівасці кожнага класа.

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне падрыхтавалі:
Беларуская мова. 5-ы, 6-ы класы — С. А. Язерская.
Беларуская літаратура. 5-ы, 6-ы класы — Л. К. Цітова.

Беларуская мова
5 клас

(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень, з іх 13 гадзін — на пісьмовыя работы)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка:
Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 1 / В. П. Красней [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. — 144 с.
Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 2 / В. П. Красней [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2008. — 160 с.
(Урокі 1—45 — Ч. 1; урокі 46—103 — Ч. 2.)

Нумар урока і дата правядзення	Тэма раздзела, урока	Мэты і задачы ўрока	Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дамашняе заданне
1	2	3	4
І чвэрць (27 урокаў) Мова — найважнейшы сродак зносін (2 гадзіны)			
1	Чалавек і мова. Адрасат	Дапамагчы вучням асэнсаваць ролю мовы ў жыцці чалавека і грамадства; пазнаёміць з мэтай і адрасатам маўлення. Паглыбіць паняцце пра тэму і асноўную думку тэксту, удасканальваць уменне перадаваць змест тэксту згодна з планам. Вучыць устанаўліваць эмацыянальны і моўны кантакт з суразмоўцамі; пазнаёміць са структурай і зместам вучэбнага дапаможніка. Выпрацоўваць уменне арыентавацца ў вучэбнай кнізе, выхоўваць беражлівыя адносіны да яе	§ 1, практ. 1—4 **Д/з:** § 1, практ. 5 (пісьмовы адказ на пытанне 6)

Працяг

1	2	3	4
2	Вусная і пісьмовая формы маўлення. Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо. Умовы, неабходныя для ўспрымання і стварэння выказвання	Пазнаёміць вучняў з вуснай і пісьмовай формамі маўлення; садзейнічаць знаёмству вучняў з відамі маўленчай дзейнасці, іх задачамі і ўмовамі выкарыстання; навучыць адрозніваць іх у маўленчай практыцы; удасканальваць уменне чытаць тэксты, перадаваць змест вершаванага твора празаічнай мовай, асэнсавана карыстацца інтанацыяй, адрозніваць моўныя сродкі (слова, інтанацыя, націск), правільна і дарэчна карыстацца нормамі маўленчага этыкету пры размове па тэлефоне і ў грамадскіх месцах; пераказваць вучэбны тэкст: асэнсоўваць змест праз вызначэнне тэмы, апорныя словы і словазлучэнні	§ 2, практ. 6 (чытанне тэксту па ролях), 7, 8 **Д/з**: § 2, практ. 9
Паўтарэнне вывучанага ў 1–4 класах (12 гадзін, з іх 2 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
3 4	Тэкст, яго будова. Тэма і асноўная думка тэксту. Сувязь сказаў у тэксце. Загаловак	Паглыбіць паняцце пра тэкст як цэласнае выказванне, у якім сказы аб'яднаны тэмай, сэнсам і граматычна; пазнаёміць са спосабамі і сродкамі сувязі сказаў. Выпрацоўваць уменне вызначаць тэму і асноўную думку тэксту, раскрываць сэнс загалоўка, падбіраць загалоўкі, аб'ядноўваць сказы ў тэкст, дзяліць тэкст на сказы, пераказваць змест, правільна вымаўляючы гукі і іх спалучэнні; раскрываць тэму і асноўную думку тэксту; вучыць дзяцей паводзіць сябе ў час вуснага выказвання: гаварыць адпаведным тонам, гледзячы на слухачоў, трымацца так, каб не адцягваць іх увагу	§ 3, 4, практ. 10–19, 21–27, 52–56 **Д/з**: § 3, 4, практ. 20, 28

1	2	3	4
5 6	Назоўнік. Род, лік, склон назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў у адзіночным і множным ліку	Актуалізаваць веды і ўменні вучняў па тэме. Удасканальваць уменне вызначаць назоўнікі ў тэксце, групаваць па сэнсавых, граматычных прыметах, папаўняць групы ўласнымі прыкладамі, правільна ставіць да назоўнікаў склонавыя пытанні, вызначаць род, лік і склон, спалучаць назоўнікі з іншымі часцінамі мовы, будаваць сказы; правільна ўжываць назоўнікі першага, другога і трэцяга скланенняў у адзіночным і множным ліку. Праводзіць частковы разбор назоўнікаў (агульнае значэнне, род, лік, склон)	§ 5, практ. 29–34, 36–44 Д/з: § 5, практ. 35, 45
7 8	План тэксту. Вусны і пісьмовы падрабязны пераказ тэксту па плане	Удасканальваць уменне вучняў вусна і пісьмова пераказваць мастацкі тэкст з выразнай кампазіцыяй па плане, складзеным з дапамогай настаўніка, захоўваючы будову, агульны настрой, вобразна-выяўленчыя сродкі, ужытыя ў тэксце	§ 6, практ. 46–50, 52 (падрабязны пераказ) Д/з: практ. 51
9 10	Прыметнік. Сувязь прыметніка з назоўнікам. Асаблівасці змянення прыметніка па родах, ліках і склонах	Сістэматызаваць і падагульніць веды і ўменні вучняў па тэме. Удасканальваць уменне вылучаць са сказаў словазлучэнні, у склад якіх уваходзіць прыметнік, групаваць прыметнікі па сэнсавых і граматычных прыметах; правільна ставіць пытанне да прыметніка, адрозніваць ад іншых часцін мовы, вызначаць род, лік і склон, дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў. Удасканальваць навыкі правапісу канчаткаў прыметнікаў у пачатковай і іншых склонавых формах, будаваць з прыметнікамі сказы і невялікія тэксты (сачыненне «Восенню ў лесе»); праводзіць частковы разбор (агульнае значэнне, род, лік, склон)	§ 7, практ. 53–57, 59, 60–62 Д/з: § 7, практ. 58, 63

1	2	3	4
11	Займеннік. Асабовыя займеннікі, іх змяненне	Садзейнічаць удасканаленню ўмення вучняў распазнаваць займеннікі ў тэксце, скланяць іх, вызначаць асобу, лік і склон, правільна карыстацца займеннікамі як сродкам сувязі сказаў і частак тэксту, правільна ўжываць займеннікі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 8, практ. 64–70 **Д/з**: § 8, практ. 71
12 13 14	Дзеяслоў. Неазначальная форма дзеяслова. Часы дзеяслова. Змяненне дзеяслова па асобах і ліках, правапіс канчаткаў. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах, правапіс канчаткаў. Правапіс ***не*** з дзеясловамі	Спрыяць паглыбленню ведаў вучняў па тэме і ўдасканальваць уменне знаходзіць дзеясловы ў тэксце, ставіць да іх пытанні, групаваць па семантычных прыметах, адрозніваць дзеясловы ад дзеяслоўных назоўнікаў і прыметнікаў, ставіць дзеясловы ў пачатковую форму, вызначаць агульны сэнс, час, асобу і лік, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні ў цяперашнім, будучым і прошлым часе, удасканальваць уменне пісаць ***не*** з дзеясловамі	§ 9, практ. 72–78, 80–87, 89, 90, 92–95 **Д/з**: § 9, практ. 79, 88, 91
Сінтаксіс і пунктуацыя (23 гадзіны, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
15 16	Словазлучэнне. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні	Пазнаёміць вучняў з функцыяй і будовай словазлучэння як сінтаксічнай адзінкі, растлумачыць неабходнасць і абгрунтаванасць выкарыстання словазлучэнняў у маўленні, сфарміраваць уяўленне пра спалучальныя магчымасці слоў розных часцін мовы. Выпрацоўваць уменне выяўляць пары слоў, звязаных па сэнсе і граматычна, ставіць пытанні ад галоўнага да залежнага слова, вызначаць граматычныя сродкі сувязі, класіфікаваць і ўтвараць назоўнікавыя і дзеяслоўныя словазлучэнні, абстрагавацца ад канкрэтных	§ 10, практ. 96–100, 102–105 **Д/з**: § 10, практ. 101, 106

1	2	3	4
		лексічных значэнняў моўных з'яў і выяўляць агульныя граматычныя значэнні. Удасканальваць правапіс канчаткаў прыметнікаў у мужчынскім, жаночым і ніякім родзе адзіночнага і множнага ліку, развіваць навыкі карыстання словазлучэннямі ў вусным і пісьмовым маўленні	
17 18	Знаёмства са стылямі маўлення (мэта і сфера выкарыстання, жанры)	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з ужываннем у маўленні тэкстаў розных стыляў і жанраў, замацаваць у свядомасці дзяцей сувязь кожнага стылю маўлення з тыповай маўленчай сітуацыяй; даць паняцце маўленчай сітуацыі. Сітуацыя маўлення → дзе гаворым? → у афіцыйных абставінах; у неафіцыйных абставінах Сітуацыя маўлення → з кім? → з адным чалавекам; з многімі людзьмі Сітуацыя маўлення → з якой мэтай? → суразмоўніцтва; паведамленне; уздзеянне Выпрацоўваць уменне вызначаць стыль тэматычна аднародных і выразных у стылёвых адносінах тэкстаў, самастойна падбіраць невялікія тэксты таго ці іншага стылю, адзначаць узаемасувязь паміж стылем тэксту і сферай, якую ён абслугоўвае; складаць невялікія тэксты пэўнага стылю і жанру. Удасканальваць уменні знаходзіць у сказах словазлучэнні, вызначаць іх сэнсавую ролю, абгрунтоўваць неабходнасць ужывання	§ 11, практ. 107—108, 110—114 **Д/з:** § 11, практ. 109, 115

Працяг

1	2	3	4
19	Сказ як адзінка маўлення	Фарміраваць у вучняў уяўленне пра сказ як камунікатыўную і сінтаксічную адзінку мовы, паказаць адрозненне паміж словам і словазлучэннем, якія называюць прадмет, дзеянне, прымету, і сказам, які паведамляе пра нейкую падзею, сітуацыю, факт. Пазнаёміць з прызначэннем сказа (паведамленне пра падзею, факт, выражэнне пытання, выражэнне пабуджэння); граматычнымі паказчыкамі (наяўнасць галоўных членаў сказа або аднаго з іх, інтанацыя канца сказа); роляй інтанацыі як сродку абазначэння межаў сказаў у вусным маўленні, спосабу ўдакладнення прызначэння сказаў і выражэння адносін да зместу выказвання; фарміраваць уяўленне пра сінтаксічныя сінонімы. Удасканальваць уменне вызначаць межы сказаў у тэксце, будаваць сказы на аснове слоў і словазлучэнняў, выбіраць сінтаксічную канструкцыю з улікам умоў суразмоўніцтва, узбагачаць граматычны лад мовы вучняў	§ 12, практ. 116–119 **Д/з**: § 12, практ. 120
20	Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з групоўкай сказаў паводле мэты выказвання, з асаблівасцямі інтанацыі ў такіх сказах (рух тону, лагічны націск і месца паўзы). Навучыць знаходзіць у тэкстах сказы, якія адрозніваюцца мэтай выказвання і інтанацыяй, правільна чытаць іх. Выпрацоўваць уменне ствараць сказы розных відаў і карыстацца імі, ставіць знакі прыпынку ў канцы сказа	§ 13, практ. 121–124 **Д/з**: § 13, практ. 125
21	Клічныя і няклічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа (паўтарэнне)	Спрыяць знаёмству вучняў з падзелам сказаў па эмацыянальнай афарбоўцы на клічныя і няклічныя; навучыць размяжоўваць простыя сказы па мэце выказвання і па адносінах да сэнсу выказвання. Выпрацоўваць уменне карыстацца заклікальнай інтанацыяй, карыстацца названымі тыпамі сказаў у вусным і пісьмовым маўленні, правільна ставіць знакі прыпынку ў канцы сказа	§ 14, практ. 126–129 **Д/з**: § 14, практ. 130

1	2	3	4
22	Будова сказа. Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік (паўтарэнне). Неразвітыя сказы	Фарміраваць у вучняў уяўленне пра будову простага неразвітага сказа, пра яго ролю ў тэкстах пэўных тыпаў і жанраў маўлення, садзейнічаць асэнсаванню ролі галоўных членаў сказа для абазначэння прадмета маўлення і яго характарыстыкі. Выпрацоўваць уменне выяўляць граматычныя асновы сказаў, ставіць сэнсавыя пытанні да дзейніка і выказніка, вызначаць спосаб іх выражэння, тэкстаўтваральную ролю ў выказванні. Навучыць ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў назоўным склоне; фарміраваць уменне асэнсавана ўжываць простыя сказы ў маўленні	§ 15, практ. 131–137 Д/з: § 15, практ. 138
23	Даданыя члены сказа: дапаўненне, азначэнне, акалічнасць. Развітыя сказы	Паглыбіць веды вучняў пра будову простага развітага сказа і мэту яго ўжывання ў маўленні. Сфарміраваць паняцце аб відах даданых членаў сказа: дапаўненні, азначэнні, акалічнасці. Удасканальваць уменне ставіць ад галоўных членаў да даданых сэнсавыя пытанні, будаваць простыя развітыя сказы і ўжываць іх у маўленні, выпрацоўваць уменне будаваць вертыкальныя і лінейныя схемы розных па мэце выказвання сказаў; развіваць граматычны лад мовы вучняў	§ 16, практ. 139, 140 Д/з: практ. 141
24	Дапаўненне	Фарміраваць уяўленне пра ролю дапаўнення ў саставе сказа і ўменне вызначаць, якімі часцінамі мовы яно выражана, пазнаёміць з графічным абазначэннем. Навучыць адрозніваць дапаўненне ад дзейніка; удасканальваць навыкі пабудовы назоўнікавых і дзеяслоўных словазлучэнняў, вучыць будаваць вертыкальныя і лінейныя схемы розных па мэце выказвання сказаў, асэнсавана ўжываць простыя развітыя сказы з даданымі членамі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 17, практ. 142–144 Д/з: практ. 145

1	2	3	4
25	**Кантрольны дыктант**	Выявіць узровень арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці, аналітыка-сінтэтычных моўных і маўленчых уменняў вучняў	
26	Азначэнне	Фарміраваць уяўленне пра ролю азначэння ў саставе сказа і ўменне вызначаць, якімі часцінамі мовы яно выражана. Пазнаёміць з графічным абазначэннем. Навучыць асэнсавана ўжываць азначэнні ў простых развітых сказах з даданымі членамі ў вусным і пісьмовым маўленні, удасканальваць навыкі пабудовы назоўнікавых і дзеяслоўных словазлучэнняў	§ 18, практ. 146—149 Д/з: практ. 150
27	Акалічнасць	Стварыць умовы для фарміравання ўяўлення пра ролю акалічнасці ў саставе сказа, выпрацоўваць уменні вызначаць, якімі часцінамі мовы яна выражана, звязна расказваць пра вывучаныя моўныя з'явы, пазнаёміць з графічным абазначэннем. Навучыць асэнсавана ўжываць акалічнасці ў простых развітых сказах з даданымі членамі ў вусным і пісьмовым маўленні, развіваць граматычны лад мовы вучняў	§ 19, практ. 151—154
II чвэрць (21 урок) **Сінтаксіс і пунктуацыя (працяг) (10 урокаў)**			
28 29	Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі, з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах і без іх), знакі прыпынку	Сфарміраваць у вучняў уяўленне пра будову сказаў з аднароднымі членамі і іх ролю ў тэкстах, пазнаёміць з прыметамі аднародных членаў, спосабамі іх выражэння. Удасканальваць уменне выяўляць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную і сэнсава-граматычную ролю ў тэксце, вымаўляць у маўленчай плыні з інтанацыяй пералічэння; раздзяляць коскай, ставіць двукроп'е і працяжнік, карыстацца сказамі з аднароднымі членамі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 20, 21, практ. 155—157, 159—163 Д/з: § 20, 21, практ. 158, 164

1	2	3	4
30	Сказы са зваротκамі, інтанаванне, знакі прыпынку	Дапамагчы вучням асэнсаваць функцыю зваротκаў у маўленні (прымусіць суразмоўцу слухаць, засяродзіць увагу на паведамленні, назваць адрасата, даць яму характарыстыку); пазнаёміць са спосабамі выражэння і месцам у сказе. Удасканальваць уменне знаходзіць звароткі ў сказах, адрозніваць назоўнікі ў назоўным склоне ў ролі дзейніка і звароткa; правільна інтанаваць сказы са зваротκамі і афармляць на пісьме; ужываць звароткі ў разнастайных маўленчых сітуацыях (у тым ліку пры напісанні лістоў сябрам і дарослым)	§ 22, практ. 165–167, складанне сказаў са зваротκамі па схемах: З. ... . З! ... . , З, ... ? ... , З! Д/з: § 22, практ. 168
31 32	Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы, іх інтанаванне. Коска паміж часткамі ў складаным сказе	Сфарміраваць у вучняў уяўленне пра складаны сказ, яго сэнсавыя магчымасці і будову: перадаюцца два і больш звязаных паведамленняў, мае дзве і больш граматычных асноў. Выпрацаваць уменне адрозніваць простыя і складаныя сказы ў тэксце, вызначаць структуру, граматычныя асновы частак, ставіць коску паміж часткамі складанага сказа, будаваць сказы па схемах, будаваць лінгвістычны тэкст паводле пытанняў; узбагачаць сінтаксічны лад мовы вучняў, вучыць ужываць складаныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 23, практ. 170–172, 174–176 Д/з: § 23, практ. 173, 177
33	Простая мова, інтанаванне і афармленне на пісьме	Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі структуры, стылістычных асаблівасцей сказаў з простай мовай. Выпрацоўваць уменне вызначаць такія сказы ў тэксце, адрозніваць у іх словы аўтара і простую мову, правільна інтанаваць, ставіць знакі прыпынку, у тым ліку пры аднародных членах і зваротку, складаць сказы з простай мовай па схемах, дарэчна ўжываць простую мову ў вусным і пісьмовым маўленні. Узбагачаць слоўнікавы запас дзеясловамі гаварэння	§ 24, практ. 178–182 Д/з: § 24, практ. 183

1	2	3	4
34	Дыялог. Афармленне дыялогу	Пазнаёміць вучняў з ужываннем маналогу і дыялогу ў вусным і пісьмовым маўленні. Выпрацоўваць уменне вызначаць маналагічную мову і дыялог, правільна чытаць тэксты з дыялогам, афармляць на пісьме, карыстацца дыялагічнай мовай пры пабудове вусных і пісьмовых выказванняў. Удасканальваць навыкі маўленчага этыкету	§ 25, практ. 184—187 **Д/з**: § 25, практ. 188
35 36	Патрабаванні да падрабязнага пераказу. Падрабязны пераказ тэксту з простай мовай	Пазнаёміць школьнікаў з патрабаваннямі да падрабязнага пераказу. Навучыць складаць план апавядання, перадаваць змест блізка да тэксту паводле плана (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў), захоўваючы будову, агульны эмацыянальны тон, характэрныя вобразна-выяўленчыя моўныя сродкі	§ 26, практ. 189, 190 **Д/з**: практ. 190 (рэдагаванне ўласнага тэксту)
37	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле	Выпрацоўваць уменне рабіць вуснае паведамленне на лінгвістычную тэму, карыстаючыся прапанаванымі пытаннямі, ілюстраваць свае думкі прыкладамі; удасканальваць моўныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя ўменні вучняў	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 113, практ. 191—193 **Д/з**: практ. 194
Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія (28 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)			
38	Гукі беларускай мовы	Паглыбляць у вучняў уяўленне пра сістэму гукаў беларускай мовы, паказаць іх ролю ў мове як кампанентаў слоў і сродкаў іх адрознення. Выпрацоўваць уменне чуць, вылучаць гукі, абазначаць іх літарамі, удасканальваць навык літаратурнага вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў у маўленчай плыні	§ 27, практ. 165—200 **Д/з**: § 27, практ. 201

1	2	3	4
39	Літара як знак гука	Дапамагчы ўсвядоміць суадносіны паміж гукамі і літарамі; выпрацоўваць уменне свядома і дакладна размяжоўваць іх, праводзіць гука-літарны аналіз слоў. Удасканальваць навыкі літаратурнага вымаўлення і правільнай перадачы гукаў на пісьме ў розных пазіцыях	§ 28, практ. 202–206 **Д/з**: § 28, практ. 207
40	Прызначэнне літар ***е*, *ё*, *ю*, *я*, *і***	Паглыбіць паняцце пра двайную ролю літар ***е*, *ё*, *ю*, *я*, *і***, садзейнічаць засваенню тэрмінаў, якія называюць фанетычныя паняцці. Выпрацоўваць уменні адрозніваць на слых гукі, якія на пісьме абазначаны з удзелам літар ***е*, *ё*, *ю*, *я*, *і***; запісваць два гукі адной літарай, пераводзіць адпаведныя літарныя абазначэнні ў гукавыя, вызначаць гукавы склад слоў з гэтымі літарамі	§ 29, практ. 208–212 **Д/з**: § 29, практ. 213
41	Беларускі алфавіт. Назвы літар	Садзейнічаць засваенню вучнямі алфавіта, правільных назваў літар; навучыць карыстацца алфавітам у практычнай дзейнасці. Пазнаёміць вучняў з задачамі, структурай і зместам арфаграфічнага слоўніка. Выпрацоўваць уменне хутка і правільна называць літары па алфавіце, размяшчаць словы ў алфавітным парадку, карыстацца слоўнікам	§ 30, практ. 215–219 **Д/з**: § 30, практ. 220
42	Склад. Націск	Паглыбіць веды вучняў пра ролю складападзелу і націску ў словах; узнавіць і развіць уменне дзяліць словы на склады, адрозніваць націскныя і ненаціскныя склады. Удасканальваць навык вызначэння пазіцыі складу адносна націскнога; праверыць, наколькі вучні валодаюць гэтымі ўменнямі; садзейнічаць запамінанню і выпрацоўцы правільнага вымаўлення слоў, у якіх вучні робяць памылкі ў націску	§ 31, практ. 221–227 **Д/з**: § 31, практ. 228

1	2	3	4
43	Правілы пераносу слоў	Стварыць умовы для засваення правілаў пераносу слоў, выпрацоўваць уменні дзяліць словы на склады і для пераносу, развіваць маўленчыя ўменні і навыкі	§ 32, практ. 229–234 **Д/з:** § 32, практ. 235
44	Знаёмства з тыпамі маўлення: апавяданне, апісанне, развагажанне (прызначэнне і будова)	Актуалізаваць і паглыбіць веды вучняў пра тыпы маўлення, іх прыметы, практычна паказаць і растлумачыць лагічныя схемы. **Апавяданне** Пачатак дзеяння → Развіццё дзеяння → Канец дзеяння **Апісанне** Агульнае ўражанне → Пералік розных прымет → Агульная ацэнка **Развражанне** Тэзіс → Доказы, прыклады → Высновы Дапамагчы вучням усвядоміць залежнасць тыпу маўлення ад зместу выказвання. Выпрацоўваць уменні вызначаць тып выразных па змесце і будове тэкстаў, самастойна падбіраць тэксты таго ці іншага тыпу, адзначаць узаемасувязь паміж зместам і тыпам маўлення, называць лагічныя часткі, самастойна складаць невялікія тэксты рознага тыпу	§ 33, практ. 236–239 **Д/з:** § 33, практ. 240
45	**Кантрольны дыктант**	Выявіць узровень сфарміраванасці арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці, аналітыка-сінтэтычных моўных і маўленчых уменняў вучняў	

1	2	3	4
46	Галосныя гукі	Сістэматызаваць веды вучняў пра галосныя і зычныя гукі, асаблівасці іх вымаўлення і перадачы на пісьме. Удасканальваць літаратурнае вымаўленне, пазнаёміць з правіламі фанетычнага разбору слова. Праца над памылкамі ў дыктанце	§ 1, практ. 1—4 (ч. 2 вучэбнага дапаможніка) **Д/з**: § 1, практ. 5
47 48	Вымаўленне і правапіс галосных ***о, э, а***	Удасканальваць уменне вызначаць націскны склад у словах, прымяняць правілы вымаўлення і напісання галосных ***о, э, а*** ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах. Замацоўваць уменне складаць і пісьмова афармляць дыялог	§ 2, практ. 6, 7, 9—11, вуснае паведамленне на лінгвістычную тэму паводле плана **Д/з**: § 2, практ. 8
III чвэрць (31 урок) Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія (працяг) (17 урокаў)			
49 50	Вымаўленне і правапіс галосных ***е, ё, я***	Садзейнічаць засваенню правілаў вымаўлення і напісання галосных ***е, ё, я*** ў спрадвечна беларускіх і запазычаных словах. Удасканальваць уменне вызначаць націскны, першы і другі пераднаціскныя, паслянаціскныя склады, адрозніваць каранёвае ***я***, словы іншамоўнага паходжання. Вучыць ужываць новыя словы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 3, практ. 12, 13, 15—19 **Д/з**: § 3, практ. 14, 20
51	Вымаўленне і правапіс спалучэнняў ***іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах	Садзейнічаць засваенню вучнямі вымаўлення і правапісу слоў іншамоўнага паходжання са спалучэннямі ***іё (ыё), іе (ые), ія (ыя)***. Выпрацоўваць уменне вымаўляць такія словы, адпаведна перадаваць на пісьме, пры неабходнасці правяраць напісанне па арфаграфічным слоўніку	§ 4, практ. 21—24 **Д/з**: § 4, практ. 25

1	2	3	4
52 53	Зычныя гукі. Глухія, звонкія і санорныя, свісцячыя і шыпячыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс	Сфарміраваць паняцце аб парных і няпарных звонкіх, глухіх і санорных гуках, свісцячых і шыпячых зычных гуках, іх вымаўленні і абазначэнні на пісьме. Пазнаёміць з сэнсаадрознай роляй зычных, з азванчэннем глухіх перад звонкімі, аглушэннем звонкіх перад глухімі і на канцы слова, прыпадабненнем свісцячых да шыпячых, шыпячых да свісцячых. Выпрацоўваць уменне вымаўляць гэтыя гукі і іх спалучэнні ў маўленчай плыні, адрозніваць і правільна перадаваць на пісьме. Удасканальваць уменне ствараць вуснае выказванне на лінгвістычную тэму	§ 5, 6, практ. 26–32, 34–37 **Д/з**: § 5, 6, практ. 33, 38
54	Цвёрдыя і мяккія зычныя, іх вымаўленне і правапіс	Замацоўваць паняцце «цвёрдасці-мяккасці» зычных гукаў, садзейнічаць асэнсаванню сэнсаадрознай ролі цвёрдасці-мяккасці, пазнаёміць са з'явай асіміляцыі цвёрдых зычных, са спосабам абазначэння мяккасці зычных на пісьме, са знакам абазначэння мяккасці зычных у транскрыпцыі. Удасканальваць уменне адрозніваць на слых цвёрдыя, зацвярдзелыя і мяккія зычныя ў слабай пазіцыі ў маўленчай плыні і на пісьме	§ 7, практ. 39–48 **Д/з**: § 7, практ. 49
55 56	Мяккі знак і апостраф	Садзейнічаць засваенню вучнямі правапісу мяккага знака для абазначэння мяккасці зычных на канцы і ў сярэдзіне слова, раздзяляльнага мяккага знака і апострафа. Удасканальваць навык вымаўлення і напісання слоў з мяккім знакам і апострафам (з улікам мясцовых фанетычных асаблівасцей)	§ 8, 9, практ. 50–53, 55–58 **Д/з**: § 8, 9, практ. 54, 59
57	Зычныя [д] – [дз'], [т] – [ц'], іх вымаўленне і правапіс	Удасканальваць уменні правільна вымаўляць і пісаць словы з чаргаваннем гукаў [д] – [дз'], [т] – [ц'], адрозніваць гук [дз'] ад спалучэння гукаў [д] і [з'], дзяліць словы з аднаведнымі літарамі для пераносу, вымаўляць гукі [д] і [т] перад [в'] і перадаваць на пісьме ў прыстаўках і суфіксах, ужываць [д] і [т] у словах іншамоўнага паходжання	§ 10, практ. 60–63 **Д/з**: § 10, практ. 64

1	2	3	4
58	Гутарковы стыль, яго выкарыстанне, моўныя асаблівасці, жанры (гутарка)	Пазнаёміць з тыповымі маўленчымі сітуацыямі ўжывання гутарковага стылю, яго моўнымі прыметамі (нязмушанасць, эмацыянальнасць, суб'ектыўнасць, вобразнасць), асаблівасцямі ўжывання лексікі, граматычных формаў і канструкцый у адпаведнасці са зместам і часткова формай выказванняў. Фарміраваць уменні вызначаць тэксты гутарковага стылю, выяўляць іх прыметы, складаць і запісваць дыялогі на бытавыя тэмы; называць фанетычныя і лексічныя асаблівасці мясцовай гаворкі	§ 11, практ. 65–71 **Д/з:** § 11, практ. 72
59 60	Правапіс ***у, ў***	Удасканальваць навыкі вымаўлення і засваення правапісу ***у, ў*** (нескладовага) у спрадвечна беларускіх словах і словах іншамоўнага паходжання. Выпрацоўваць уменне рабіць звязнае паведамленне на лінгвістычную тэму	§ 12, практ. 73–75, 77 **Д/з:** § 12, практ. 76, 78
61	Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс	Паглыбіць веды вучняў пра падоўжаныя зычныя як характэрную асаблівасць гукавой сістэмы беларускай мовы. Развіваць уменне правільна вымаўляць падоўжаныя зычныя, успрымаць іх на слых, вылучаць і перадаваць на пісьме, размяжоўваць падаўжэнне як вынік гукавых змен у слове і падваенне гукаў як вынік словаўтварэння	§ 13, практ. 79–82 **Д/з:** § 13, практ. 83
62	Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс	Паглыбіць веды вучняў аб прыстаўных гуках як спецыфічнай асаблівасці гукавой сістэмы беларускай мовы. Развіваць уменне вымаўляць зычныя і галосныя прыстаўныя гукі ў адпаведнай пазіцыі, успрымаць іх на слых, вылучаць і перадаваць на пісьме ў маўленні, размяжоўваць прыстаўныя і каранёвыя гукі	§ 14, практ. 84–89 **Д/з:** § 14, практ. 90
63 64	**Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту**	Праверыць уменне вучняў пісьмова пераказваць мастацкі тэкст з выразнай кампазіцыяй, захоўваючы будову, агульны настрой, вобразна-выяўленчыя сродкі	Работа над памылкамі

1	2	3	4
65	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях фанетыкі і арфаэпіі, графікі і арфаграфіі. Удасканальваць уменні пазнаваць моўныя з'явы, групаваць іх, устанаўліваць лагічныя сувязі, выконваць фанетычны разбор слоў	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 50, прапануюцца практыкаванні з дадатковай вучэбна-метадычнай літаратуры
Лексіка. Фразеалогія (18 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
66 67	Словы як назвы рэчаў, з'яў, паняццяў. Лексічнае значэнне слова	Фарміраваць у вучняў уяўленне пра самабытнасць і непаўторнасць беларускай мовы, унікальнасць і разнастайнасць яе слоўнікавага складу. Выпрацоўваць уменне адрозніваць словы і прадметы (прыметы, дзеянні, колькасці, якія гэтымі словамі называюцца), раскрываць значэнне слова рознымі спосабамі, адрозніваць граматычнае і лексічнае значэнне слоў; вызначаць лексічнае значэнне слоў у тлумачальным слоўніку і ў тэксце, ужываць словы ва ўласным маўленні ў адпаведнасці з іх значэннем. Выхоўваць цікавасць да слоўнікаў і выпрацоўваць звычку карыстацца імі; пазнаёміць вучняў з энцыклапедычнымі і асноўнымі лінгвістычнымі слоўнікамі, выпрацоўваць уменне карыстацца імі, даць паняцце пра слоўнікавы артыкул. Развіваць уменне ўспрымаць у працэсе чытання навуковы (вучэбны, лінгвістычны) тэкст, складаць план, вызначаць апорныя словы і перадаваць змест, падмацоўваючы ўласнымі прыкладамі	§ 15, практ. 91, 92, 93 (заданне 1), 94, 95 Д/з: § 15, практ. 93 (заданне 2), 96
68	Адназначныя і мнагазначныя словы	Фарміраваць уяўленне пра мнагазначнасць слоў. Выпрацоўваць уменні вызначаць лексічнае значэнне мнагазначных слоў у тэкстах, знаходзіць адназначныя і мнагазначныя словы ў тлумачальным слоўніку, самастойна раскрываць іх лексічнае значэнне; складаць з імі словазлучэнні і сказы, ужываць мнагазначныя словы ва ўласных выказваннях	§ 21, практ. 133–136 Д/з: § 21, практ. 137

Працяг

1	2	3	4
69	Прамое і пераноснае значэнне слова	Паглыбіць веды вучняў пра лексічную спалучальнасць слоў, іх ужыванне ў прамым і пераносным значэнні. Развіваць уменні адрозніваць спалучэнні слоў, якія не адпавядаюць сапраўднасці, вызначаць у кантэксце ўжыванне слоў у прамым і пераносным значэнні, пазнаёміць са спосабам абазначэння такіх слоў у тлумачальным слоўніку; складаць словазлучэнні, сказы і тэксты, у якіх словы ўжываліся б у прамым і пераносным значэнні; знаходзіць і выпраўляць памылкі ва ўжыванні слоў з прамым і пераносным значэннем	§ 22, практ. 138—142 **Д/з:** § 22, практ. 143
70	Сінонімы	Фарміраваць уяўленне пра сінонімы, іх семантыка-стылістычныя асаблівасці і разнастайнае выкарыстанне ў маўленні. Выпрацоўваць уменні знаходзіць сінонімы ў тэксце, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю, фармуляваць агульнае лексічнае значэнне сінанімічнага рада, падбіраць сінонімы да прапанаванага слова, адрозніваць сінонімы ад мнагазначных слоў і паміж сабой. Развіваць уменне групаваць моўныя з'явы; ужываць сінонімы ва ўласным маўленні ў адпаведнасці з іх семантыка-стылістычнымі асаблівасцямі, выкарыстоўваць сінонімы як сродак сувязі суседніх сказаў, з дапамогай сінонімаў пераадольваць неапраўданы паўтор слоў	§ 24, практ. 148—156 **Д/з:** § 24, практ. 157
71	Антонімы	Фарміраваць уяўленне пра антонімы і іх ролю ў маўленні (антонімы – сродак стварэння кантрасту, які дазваляе вобразна, выразна перадаць думкі, антытэза ў прыказках, мастацкіх творах, сродак сувязі сказаў у тэксце ці частак сказа, сродак тлумачэння лексічнага значэння слоў у тлумачальным слоўніку). Выпрацоўваць уменне падбіраць антонімы, групаваць з'явы, якія вывучаюцца, знаходзіць у тэксце, вызначаць агульнае семантычнае значэнне антанімічных пар	§ 25, практ. 158—166 **Д/з:** § 25, практ. 167

1	2	3	4
		слоў, вызначаць сэнсава-стылістычную ролю антонімаў у тэкстах; ужываць ва ўласным маўленні з пэўнымі стылістычнымі задачамі	
72	Амонімы (знаёмства)	Фарміраваць уяўленне пра амонімы і іх ужыванне ў маўленні. Выпрацоўваць уменні знаходзіць амонімы ў тлумачальным слоўніку і тэкстах, адрозніваць амонімы ад мнагазначных слоў, вызначаць сэнсава-стылістычную ролю амонімаў у тэкстах; развіваць уменні абгрунтоўваць сваё меркаванне; ужываць амонімы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 26, практ. 168—172 Д/з: § 26, практ. 173
73 74	Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку	Фарміраваць уяўленне пра агульнаўжывальную лексіку сучаснай беларускай літаратурнай мовы і словы абмежаванага ўжытку. Выхоўваць павагу да роднага слова як своеасаблівай і адметнай моўнай з'явы і крыніцы папаўнення літаратурнай мовы. Выпрацоўваць уменні адрозніваць у тэкстах гутарковага, мастацкага, публіцыстычнага стыляў, а таксама ў мове роднай гаворкі агульнаўжывальныя і дыялектныя словы; тлумачыць ролю дыялектных слоў у мастацкіх творах, правільна ўжываць ва ўласным маўленні. Пазнаёміць з дыялектнымі слоўнікамі беларускай мовы і формай падачы дыялектнай лексікі ў тлумачальным слоўніку, вучыць знаходзіць дыялектныя словы ў тлумачальных слоўніках. Фарміраваць уяўленне аб прафесійных словах і навуковых тэрмінах. Выпрацоўваць уменне адрозніваць такія словы ў тэкстах розных стыляў, вызначаць сферу іх ужывання, падбіраць прафесійныя словы і навуковыя тэрміны на зададзеную тэму і ўжываць іх пры складанні адпаведных сказаў і тэкстаў	§ 16, 17, практ. 97—103, 105—110 Д/з: § 16, 17, практ. 104, 111

1	2	3	4
75 76	Устарэлыя словы і неалагізмы	Фарміраваць уяўленні пра шляхі развіцця літаратурнай мовы. Пазнаёміць вучняў з паняццямі і тэрмінамі «ўстарэлыя словы» і «неалагізмы», сферай іх ужывання і роляй у літаратурнай мове. Развіваць уменні знаходзіць устарэлыя словы ў слоўніках і тэкстах і абгрунтоўваць сваё меркаванне; пазнаёміць з «Гістарычным слоўнікам беларускай мовы», навучыць правільна ўжываць устарэлыя словы і неалагізмы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 18, практ. 112—114, 116—118 **Д/з:** § 18, практ. 115, 119
77	Запазычаныя словы, іх ужыванне і правапіс	Паглыбляць у вучняў уяўленне аб унікальнасці, самабытнасці і непаўторнасці беларускай мовы як сродку, што на працягу шматлікіх стагоддзяў дазваляе абменьвацца думкамі, духоўнымі каштоўнасцямі, дапамагае разумець адзін аднаго і ўзаемадзейнічаць у працы. Пазнаёміць з паняццямі і тэрмінамі «спрадвечна беларускія» і «запазычаныя словы», з роляй запазычаных слоў у беларускай мове, са «Слоўнікам іншамоўных слоў», «Этымалагічным слоўнікам беларускай мовы». Выпрацоўваць уменні па пэўных прыметах пазнаваць запазычаныя словы, вызначаць іх лексічнае значэнне, карыстаючыся тлумачальным або іншамоўным слоўнікам, падбіраць да запазычаных слоў спрадвечна беларускія сінонімы, дарэчна ўжываць запазычаныя словы ва ўласным маўленні	§ 19, практ. 120—125 **Д/з:** § 19, практ. 126
78	Паглыбленне паняцця пра мастацкі і навуковы стылі	Фарміраваць уяўленне пра сферу і мэту выкарыстання, асноўныя прыметы мовы навуковага стылю. Выпрацоўваць уменні параўноўваць і адрозніваць тэксты навуковага і мастацкага стыляў, вызначаць моўныя прыметы навуковага стылю (дакладнасць і сцісласць выказвання, наяўнасць запазычаных слоў, прафесійных слоў і навуковых тэрмінаў,	§ 20, 23, практ. 127—130, 144—146 **Д/з:** § 20, 23, практ. 132

1	2	3	4
		адсутнасць слоў з пераносным значэннем і слоў, якія перадаюць адносіны аўтара), складаць тэксты ў навуковым стылі на даступную тэму, карыстацца навуковым стылем ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях на ўроках па розных прадметах	
79	Пераклад з рускай мовы на беларускую вучэбнага тэксту	Выпрацоўваць уменне перакладаць тэксты навуковага стылю: правільна ўспрымаць змест прачытанага на рускай мове і адэкватна перадаваць гэты змест на беларускай мове (па магчымасці найбольш дакладна перадаць лагічную структуру арыгінала), карыстацца перакладным слоўнікам; заўважаць у тэксце перакладу памылкі і недахопы, выпраўляць іх, рабіць самаацэнку выкананага перакладу	Практ. 131
IV чвэрць (26 урокаў)			
80	Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні	Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў паняцця пра фразеалагізмы (лексічнае значэнне, будова, сінтаксічная роля ў сказе і функцыя ў маўленні). Пашырыць уяўленне пра багацце слоўнікавага складу беларускай мовы, пра гістарычныя змены, што адбываюцца ў мове, узбагаціць мову вучняў фразеалагізмамі. Пазнаёміць з «Фразеалагічным слоўнікам» і спосабам абазначэння фразеалагізмаў у тлумачальным слоўніку. Выпрацоўваць уменні знаходзіць фразеалагізмы, адзначаць падабенства і адрозненне фразеалагізмаў ад слоў і словазлучэнняў, называць лексічнае значэнне, падбіраць да фразеалагізмаў сінонімы і антонімы (фразеалагізмы); знаходзіць фразеалагізмы ў сказах, тлумачальных і фразеалагічных слоўніках, выяўляць ролю ў тэкстах мастацкага стылю і гутарковым маўленні; складаць з фразеалагізмамі сказы, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 27, практ. 174–183 (на выбар) Д/з: § 27, практ. 178, 184 (на выбар)

1	2	3	4
81 82	**Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту**	Праверыць уменне вучняў пісьмова пераказваць мастацкі тэкст з выразнай кампазіцыяй, захоўваючы будову, агульны настрой, вобразна-выяўленчыя сродкі, ужытыя аўтарам	
83	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле	Сістэматызаваць і замацаваць набытыя веды па лексіцы і фразеалогіі. Удасканальваць лексікалагічныя вучэбнамоўныя ўменні і навыкі па наступных напрамках: асноўныя лексічныя паняцці; слова і яго лексічнае значэнне (лексічнае значэнне, адназначнасць і мнагазначнасць слова, амонімы, сінонімы, антонімы, прамое і пераноснае значэнне слова); папаўненне слоўнікавага складу беларускай мовы словамі, утворанымі па правілах беларускай мовы, актуалізацыя запазычаных слоў; функцыі вывучаных лексічных з'яў у мове і маўленні; слова і фразеалагізм; слоўнікі беларускай мовы. Выпрацоўваць уменне самастойна папаўняць веды па мове	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 99, прапануюцца практыкаванні са зборнікаў дыдактычных матэрыялаў па беларускай мове для 5-га класа
Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія (17 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)			
84	Змяненне і ўтварэнне слоў	Дапамагчы вучням асэнсаваць сутнасць паняццяў «лексічнае і граматычнае значэнне слова». Выпрацоўваць уменні вызначаць лексічнае і граматычнае значэнне слова, вучыць размяжоўваць паняцці «словазмяненне» і «словаўтварэнне», адрозніваць формы аднаго і таго ж слова і розныя словы з адным коранем	§ 28, практ. 185–189 **Д/з:** § 28, практ. 190
85	Марфемная будова слова. Аснова і канчатак	Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі сутнасці паняццяў асновы і канчатка як часткі слова і сродку сувязі слоў у словазлучэннях і сказах; спрыяць усведамленню ролі асновы як носьбіта лексічнага значэння слова. Выпрацоўваць уменні вылучаць аснову і канчатак, у тым ліку нулявы,	§ 29, практ. 191–195 **Д/з:** § 29, практ. 196

1	2	3	4
		у зменных словах; адрозніваць словы з нулявым канчаткам ад нязменных слоў, выяўляць граматычныя формы слоў і адпаведныя граматычныя значэнні, што выражаюць канчаткі; тлумачыць у зменных і нязменных словах лексічнае значэнне, што заключаецца ў аснове; даваць азначэнне паняццяў асновы і канчатка, ствараць вуснае выказванне на адпаведную тэму	
86	Корань слова (паўтарэнне). Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова	Дапамагчы вучням асэнсаваць сутнасць кораня як значымай часткі асновы слова і носьбіта яго асноўнага значэння, што захоўваецца ва ўсіх роднасных словах. Замацаваць і ўдасканаліць уменні выдзяляць корань шляхам падбору аднакаранёвых слоў, аналізаваць аднакаранёвыя словы, вылучаць у іх афіксы і агульную непадзельную частку, супастаўляць розныя па значэнні словы, карані якіх гучаць аднолькава, групаваць словы з улікам значэння кораня, адрозніваць формы слоў і аднакаранёвыя словы, знаходзіць аднакаранёвыя словы ў прапанаваных тэкстах і дарэчы ўжываць ва ўласным маўленні	§ 30, практ. 202–207 **Д/з**: § 30, практ. 208
87	Прыстаўка – значымая частка слова	Спрыяць асэнсаванню вучнямі прыстаўкі як значымай часткі асновы слова. Удасканальваць уменні вылучаць прыстаўкі ў словах шляхам падбору аднакаранёвых слоў і слоў з аднолькавай прыстаўкай, тлумачыць значэнне прыставак, фармуляваць азначэнне, класіфікаваць словы на групы ў адпаведнасці са значэннем прыставак, тлумачыць іх лексічнае значэнне, утворанае пры дапамозе прыставак; падбіраць словы, складаць з імі словазлучэнні і сказы, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні; выконваць марфемны разбор слова	§ 29, практ. 197, дадатковы дыдактычны матэрыял па тэме **Д/з**: § 29, практ. 198

1	2	3	4
88	Суфікс — значымая частка слова	Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў паняцця пра суфікс як значымую частку асновы слова, словаўтваральную марфему. Вучыць выдзяляць суфіксы ў словах шляхам падбору аднакаранёвых слоў і слоў з аднолькавымі суфіксамі, выяўляць некаторыя даступныя для разумення дзяцей значэнні суфіксаў, фармуляваць азначэнне суфікса; класіфікаваць словы на групы па значэнні, што надае словам суфікс; падбіраць рады аднакаранёвых слоў, утвораных пры дапамозе розных суфіксаў, тлумачыць іх лексічнае значэнне, складаць з імі словазлучэнні і сказы, ужываць ва ўласным маўленні	§ 29, практ. 199, 200, дадатковы дыдактычны матэрыял [redacted] тэме **Д/з**: § 29, практ. 201
89	Чаргаванне зычных і галосных у аснове	Пазнаёміць вучняў са з'явамі чаргавання гукаў і бегласці галосных у аснове пры ўтварэнні і змяненні слоў. Выпрацоўваць уменне ўлічваць гэтыя з'явы пры марфемным разборы слоў. Замацоўваць уменне размяжоўваць паняцці «словаўтварэнне» і «словазмяненне», удасканальваць мастацкі і навуковы стыль маўлення школьнікаў	§ 32, практ. 213–215 **Д/з**: § 32, практ. 216
90 91	Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны (паўтарэнне)	Садзейнічаць засваенню вучнямі правілаў напісання зычных ***з, с, б, д*** на канцы прыставак, выпрацоўваць адпаведны арфаграфічны навык. Вучыць правільна вымаўляць спалучэнні зычных на стыку марфем. Удасканальваць уменне вылучаць у словах значымыя часткі, рабіць вуснае выказванне на лінгвістычную тэму, развіваць інтанацыйныя навыкі вучняў	§ 33, практ. 217–219, 221, 222 **Д/з**: § 33, практ. 220, 223
92	Правапіс ***й, ы*** пасля прыставак	Дапамагчы вучням асэнсаваць правапіс літар ***й, ы*** пасля прыставак, выпрацоўваць адпаведны арфаграфічны навык. Удасканальваць уменне вымаўляць такія словы, развіваць навык марфемнага разбору слоў	§ 34, практ. 224–228 **Д/з**: § 34, практ. 229

1	2	3	4
93 94	Утварэнне слоў. Утваральная аснова. Спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны; складанне слоў і асноў	Пазнаёміць вучняў з асноўнымі спосабамі ўтварэння слоў. Замацоўваць веды аб словаўтваральных паняццях. Развіваць уменне выконваць марфемны і словаўтваральны разборы; вызначаць сэнсава-стылістычную функцыю слоў пэўнай структуры ў тэкстах розных стыляў, ужываць такія словы ва ўласным маўленні	§ 35, практ. 230—236 Д/з: § 35, практ. 237
95	Пераклад з рускай мовы на беларускую мастацкага тэксту	Выпрацоўваць уменне ўспрымаць змест прачытанага тэксту, вызначаць яго тып, стыль, тэму і асноўную думку, бачыць асаблівасці моўнай арганізацыі, перакладаць, творча карыстаючыся словам, захоўваючы аўтарскую адметнасць арыгінала, яго стылістычныя і выяўленчыя магчымасці	
96	Утварэнне і правапіс складаных слоў (знаёмства)	Дапамагчы вучням асэнсаваць спосабы ўтварэння складаных і складанаскарочаных слоў. Фарміраваць уменні распазнаваць спосабы ўтварэння слоў, вылучаць словаўтваральную марфему — злучальны галосны, выпрацоўваць неабходныя арфаэпічныя і арфаграфічныя навыкі. Садзейнічаць засваенню навуковай тэрміналогіі, узбагачаць слоўнікавы запас школьнікаў адпаведнай лексікай, спрыяць актыўнаму ўжыванню складаных слоў з пэўнай сэнсава-стылістычнай роляй у вусным і пісьмовым маўленні	§ 36, практ. 238—241 Д/з: § 36, практ. 242
97	Складанаскарочаныя словы (знаёмства)	Дапамагчы вучням асэнсаваць спосаб утварэння складанаскарочаных слоў, выпрацоўваць неабходныя арфаэпічныя і арфаграфічныя навыкі. Садзейнічаць засваенню навуковай	§ 37, практ. 243—247 Д/з: § 37, практ. 248, 250

Заканчэнне

1	2	3	4
		тэрміналогіі, узбагачаць слоўнікавы запас школьнікаў адпаведнай лексікай, спрыяць актыўнаму ўжыванню складанаскарочаных слоў з пэўнай сэнсава-стылістычнай роляй у вусным і пісьмовым маўленні	
98 99	**Кантрольны дыктант** Работа над памылкамі	Выявіць узровень авалодання вучнямі моўнымі ўменнямі і навыкамі, неабходнымі для маўленчай дзейнасці, ступень сфарміраванасці арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці	Работа над памылкамі
100	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях структуры слова і словаўтварэння. Удасканальваць уменні вызначаць склад слова і рабіць словаўтваральны разбор. Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі: а) узаемасувязі, якая існуе паміж адзінкамі розных узроўняў мовы (словаўтваральнымі, з аднаго боку, і фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі — з другога); б) выяўленчай функцыі вытворных слоў, выразнасць якім надаюць адпаведныя афіксы. Выпрацоўваць арфаграфічныя навыкі, узбагачаць слоўнікавы запас вучняў	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 138, словаўтваральны разбор (с. 134—135), практ. 249, 251 **Д/з**: практ. 250
101 102 103	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год	Падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў па вывучаных раздзелах, садзейнічаць авалодванню вымаўленчымі, арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі, лексічнымі, граматычнымі, стылістычнымі нормамі беларускай мовы і іх варыянтамі, удасканальваць вуснае і пісьмовае маўленне вучняў	Практ. 252—255, 257—261, 263—274 **Д/з**: практ. 256, 262
104 105	Рэзервовыя гадзіны		

Беларуская мова
6 клас

(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень, з іх 14 гадзін — на пісьмовыя работы)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка: Красней, В. П. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль, С. Р. Рачэўскі. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. — 304 с.

Нумар урока і дата правядзення	Тэма раздзела, урока	Мэты і задачы ўрока	Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дамашняе заданне
1	2	3	4
I чвэрць (27 урокаў) **Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа (2 гадзіны)**			
1	Беларуская мова як адлюстраванне нацыянальнага бачання свету	Дапамагчы вучням усвядоміць ролю беларускай мовы як нацыянальнай, як каштоўнага сацыяльна-культурнага скарбу народа, які ў сваёй мове, вусна-паэтычнай творчасці, літаратуры адлюстраваў самабытную і непаўторную карціну бачання свету, выказаў сваё разуменне каштоўнага, разумнага і прыгожага. Спрыяць узбагачэнню слоўнікавага і фразеалагічнага складу мовы вучняў. Пазнаёміць са структурай і зместам вучэбнага дапаможніка. Выпрацоўваць уменне арыентавацца ў кнізе, выхоўваць беражлівыя адносіны да яе	Лінгвістычны тэкст на с. 3, вусны адказ на пытанні, § 1, практ. 1—4 Д/з: § 1, практ. 5

1	2	3	4
2	Літаратурная мова і народныя гаворкі. Нарматыўнасць — асноўная рыса літаратурнай мовы	Пазнаёміць вучняў з асноўнымі формамі існавання мовы — літаратурнай (вуснай і пісьмовай) і дыялектнай (вуснай), сферай і мэтаї іх выкарыстання, асаблівасцямі ў лексіцы, фанетыцы, граматыцы; навучыць адрозніваць гэтыя формы і правільна карыстацца імі ў маўленчай практыцы, выхоўваць паважлівыя адносіны да гаворкі сваіх бацькоў, дыялектнай мовы як крыніцы ўзбагачэння літаратурнай мовы. Спрыяць практычнаму знаёмству вучняў з асноўнымі нормамі беларускай літаратурнай мовы — лексічнымі, граматычнымі, арфаграфічнымі, арфаэпічнымі, стылістычнымі. Выпрацоўваць уменне чытаць і пераказваць тэксты розных стыляў і тыпаў, вызначаць іх тэму і асноўную думку, падбіраць загаловак, складаць план; папаўняць слоўнікавы склад мовы вучняў. Выпрацоўваць уменне бачыць парушэнні нормаў у вуснай і пісьмовай літаратурнай мове, захоўваць літаратурныя і этычныя нормы ва ўласным маўленні	§ 2, практ. 6—9 **Д/з**: § 2, практ. 10
Паўтарэнне вывучанага ў 5 класе (4 гадзіны)			
3	Тэкст, яго стылі і тыпы	Спрыяць узнаўленню і паглыбленню паняцця вучняў пра тэкст, яго стылі і тыпы; выпрацоўваць уменні ўспрымаць тэкст як цэласнае выказванне, аб' яднанае тэмай, сэнсам і граматычна; суадносіць кожнае выказванне з тыповай маўленчай сітуацыяй, вызначаць стыль выразных у стылёвых адносінах тэкстаў; усведамляць залежнасць тыпу тэксту ад зместу выказвання, вызначаць тып выразных па змесце і будове тэкстаў; чытаць мастацкія тэксты з элементамі апісання прадметаў, вызначаць ролю	§ 3, практ. 11—14 **Д/з**: § 3, практ. 15

1	2	3	4
		апісанняў у раскрыцці тэмы; самастойна складаць невялікія мастацкія тэксты з элементамі апісання прадметаў	
4	Словазлучэнне і сказ. Знакі прыпынку ў простых і складаных сказах	Актуалізаваць і сістэматызаваць веды і ўменні вучняў, атрыманыя на папярэднім этапе навучання. Спрыяць узнаўленню ведаў вучняў пра агульныя асаблівасці сэнсавай і граматычнай будовы словазлучэнняў, іх віды і функцыі: называць прадмет, дзеянне ці прымету і служыць састаўнымі часткамі для сказа. Удасканальваць уменні вылучаць назоўнікавыя і дзеяслоўныя словазлучэнні са сказаў, параўноўваць словазлучэнні з асобнымі словамі, вызначаць пры дапамозе пытанняў сэнсавыя адносіны паміж кампанентамі словазлучэння, называць галоўнае і залежнае словы, іх характэрныя марфалагічныя асаблівасці, вызначаць сродкі выражэння граматычнай залежнасці, праводзіць адэкватныя замены галоўнага і залежнага слоў іншымі аднакаранёвымі словамі, адрозніваць свабодныя словазлучэнні ад фразеалагізмаў, уласных назваў і тэрмінаў. Выпрацоўваць у шасцікласнікаў імкненне ўжываць разнастайныя словазлучэнні ва ўласным маўленні. Узнавіць веды пра агульныя прыметы сказа і яго функцыянальныя разнавіднасці, уяўленне пра члены сказа, іх падзел на галоўныя і даданыя, граматычную аснову, будову простых развітых, неразвітых і складаных сказаў, у тым ліку ўскладненых звароткамі і аднароднымі членамі; актуалізаваць уменні вучняў адрозніваць розныя віды сказаў у маўленні, праводзіць іх сінтаксічны разбор, свядома карыстацца разнастайнымі відамі сказаў у маўленні; удасканальваць інтанацыйныя і пунктуацыйныя навыкі	§ 4, практ. 16—22 Д/з: § 4, практ. 23

1	2	3	4
5	Гукі беларускай мовы. Іх вымаўленне і абазначэнне на пісьме. Слова, яго лексічнае значэнне	Садзейнічаць аднаўленню ў памяці вучняў і актуалізацыі найважнейшых палажэнняў, якія характарызуюць беларускую гукавую сістэму і яе ролю ў маўленні, даць магчымасць сфармуляваць гэтыя веды ў выглядзе звязнага выказвання з прывядзеннем неабходных прыкладаў; удасканальваць уменні чуць, вылучаць, вымаўляць гукі і іх спалучэнні, абазначаць літарамі ў маўленчай плыні; паўтарыць правілы літаратурнага вымаўлення і напісання запазычаных слоў. Арганізаваць паўтарэнне вучнямі асноўных паняццяў раздзела «Лексіка», спрыяць папаўненню і актуалізацыі слоўнікавага і фразеалагічнага складу мовы вучняў, выхоўваць павагу да роднага слова. Выпрацоўваць уменні характарызаваць тэксты паводле іх тыпу і стылю, слоўнікавага складу, ужываць словы ў адпаведнасці з іх лексічным значэннем і стылістычнай афарбоўкай ва ўласным маўленні, карыстацца рознымі відамі слоўнікаў	§ 5, 6, практ. 24—27, 28—32 **Д/з**: § 5, 6, практ. 33
6	Марфемная будова слова. Асноўныя спосабы словаўтварэння	Садзейнічаць узнаўленню і актуалізацыі асноўных словаўтваральных паняццяў, удасканальваць і развіваць уменні вучняў арыентавацца ў структуры слова, вычляняць у ім розныя тыпы моўных значэнняў, праводзіць структурны аналіз на ўзроўні словаўтваральных абагульненняў, рабіць словаўтваральны разбор, размяжоўваць з'явы словаўтварэння і словазмянення. Замацоўваць арфаграфічныя навыкі; папаўняць слоўнікавы склад мовы вучняў; развіваць навуковы стыль маўлення	§ 7, практ. 34—38 **Д/з**: § 7, практ. 39

1	2	3	4
		Марфалогія і арфаграфія	
7	Самастойныя і службовыя часціны мовы	Спрыяць засваенню вучнямі паняцця і тэрміна «марфалогія», пазнаёміць з прынцыпамі падзелу слоў на часціны мовы і іх групы, абазначыць тэкстаўтваральную ролю самастойных і службовых часцін мовы. Выпрацоўваць уменне пазнаваць і групаваць словы як часціны мовы, правільна вымаўляць і запісваць марфалагічныя тэрміны; развіваць лінгвістычнае мысленне і навуковы стыль маўлення школьнікаў	§ 8, практ. 40–45 **Д/з**: § 8, практ. 46
		Назоўнік (25 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)	
8	Назоўнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма	Дапамагчы вучням засвоіць асноўныя прыметы назоўніка як часціны мовы, сфарміраваць паняцце граматычнага прадмета, пашырыць уяўленне пра лексічныя межы назоўнікаў, паказаць розніцу ў значэнні і ўжыванні суадносных формаў назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў, папоўніць слоўнік новымі лексічнымі групамі слоў. Выпрацоўваць уменні фармуляваць азначэнне назоўніка, распазнаваць назоўнікі ў тэксце, у тым ліку ва ўскосных склонах, адрозніваць ад іншых часцін мовы, вызначаць сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце; класіфікаваць назоўнікі паводле пэўных лексіка-семантычных груп, вызначаць пачатковую форму, марфалагічныя прыметы (род, лік, склон), сінтаксічную ролю ў назоўным склоне і словазлучэннях; адрозніваць назоўнікі ў назоўным склоне ў ролі дзейніка і звароткa. Выпрацоўваць уменні выдзяляць коскамі зваротак, інтанаваць сказы са зваротакм, дзейнікам і выказнікам, выражанымі формай назоўнага склону назоўніка, ставіць на пісьме працяжнік, замацоўваць навык вызначэння граматычнай асновы сказа; складаць з назоўнікамі словазлучэнні, сказы і невялікія тэксты	§ 9, практ. 47–52 **Д/з**: § 9, практ. 53

Працяг

1	2	3	4
9	Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назваў (практычна)	Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі сутнасці падзелу назоўнікаў на агульныя і ўласныя, пазнаёміць з ужываннем уласных назоўнікаў у значэнні агульных і агульных у значэнні ўласных, спрыяць засваенню напісання вялікай літары і двукосся ва ўласных назвах. Выпрацоўваць уменне вызначаць у тэкстах агульныя і ўласныя назоўнікі, падбіраць да агульных назоўнікаў уласныя назвы, адрозніваць словы з аднолькавым гучаннем, якія ўжываюцца ў тэкстах як агульныя і ўласныя назоўнікі; правільна ўжываць у пісьмовым маўленні ўласныя назвы, у склад якіх уваходзяць агульныя назоўнікі або словазлучэнні; развіваць моўнае чуццё вучняў	§ 10, практ. 54—57 Д/з: § 10, практ. 58
10	Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя	Дапамагчы вучням усвядоміць паняцце адушаўлёнасці-неадушаўлёнасці назоўнікаў як пастаяннай марфалагічнай прыметы, абапіраючыся на сэнс і суаднесенасць граматычных формаў роднага і вінавальнага склонаў множнага ліку з назоўным, адрозніваць гэту катэгорыю ад біялагічнага паняцця «жывое-нежывое», папоўніць слоўнік вучняў новымі групамі слоў. Выпрацоўваць уменне адрозніваць у тэкстах адушаўлёныя і неадушаўлёныя назоўнікі, правільна ўжываць іх у вусным і пісьмовым маўленні	§ 10, практ. 59—64 Д/з: § 10, практ. 65
11	Назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя	Пазнаёміць вучняў з лексіка-граматычнымі разрадамі канкрэтных і абстрактных назоўнікаў, спрыяць засваенню адпаведных паняццяў і тэрмінаў. Выпрацоўваць уменне адрозніваць такія назоўнікі ў маўленні, правільна іх ужываць; пашыраць слоўнікавы склад мовы вучняў	§ 11, практ. 66—68 Д/з: § 11, практ. 69

1	2	3	4
12	Назоўнікі зборныя, рэчыўныя. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікамі	Пазнаёміць вучняў з лексіка-граматычнымі разрадамі зборных і рэчыўных назоўнікаў, асаблівасцямі іх ужывання ў маўленні, спрыяць засваенню адпаведных паняццяў і тэрмінаў. Выпрацоўваць уменне адрозніваць такія назоўнікі ў тэксце, правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні; ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікамі; пашыраць слоўнікавы склад мовы вучняў	§ 12, практ. 70—73, дадатковы дыдактычны матэрыял Д/з: § 12, практ. 74
13	Афіцыйны стыль маўлення, яго жанры, сфера выкарыстання	Садзейнічаць засваенню вучнямі паняцця пра афіцыйны стыль, пазнаёміць з тыповымі маўленчымі сітуацыямі яго ўжывання (вытворчая дзейнасць чалавека), мэтай (дакладная інфармацыя пра рэчаіснасць), асноўнымі стылёвымі рысамі (канкрэтнасць і дакладнасць, адсутнасць эмацыянальнасці, вобразнасці) і жанрамі. Выпрацоўваць уменні адрозніваць тэксты афіцыйнага стылю, вызначаць сферу і мэту іх выкарыстання, жанры, асноўныя стылёвыя рысы і некаторыя моўныя сродкі выражэння. Навучыць пісаць аб'явы на даступныя вучням тэмы, а таксама падпісваць адрас на канверце	§ 13, практ. 75—81 Д/з: § 13, практ. 82
14	Род назоўнікаў	Спрыяць узнаўленню ведаў вучняў пра пастаянную марфалагічную прымету роду назоўнікаў, пазнаёміць з асаблівасцямі ўжывання ў маўленні назоўнікаў мужчынскага роду, якія абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу. Удасканальваць уменні вызначаць род назоўнікаў, арыентуючыся на семантычныя і марфалагічныя паказчыкі, а таксама на семантычныя сувязі з іншымі часцінамі мовы (прыметнікамі, займеннікамі, дзеясловамі ва ўмоўным ладзе і прошлым часе абвеснага ладу, дзеепрыметнікамі),	§ 14, практ. 83—90 Д/з: § 14, практ. 91

Працяг

1	2	3	4
		правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні назоўнікі, пры вызначэнні роду якіх нярэдка дапускаюцца парушэнні нормаў літаратурнай мовы	
15	Назоўнікі агульнага роду	Пазнаёміць вучняў з назоўнікамі агульнага роду (іх лексічнай і сінтаксічнай адметнасцю, асаблівасцю ўжывання ў маўленні). Выпрацоўваць уменне пазнаваць такія назоўнікі ў тэкстах, правільна спалучаць займеннікі, прыметнікі, дзеясловы ў прошлым часе з іншымі словамі, вызначаць сінтаксічную і сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце, дарэчы ўжываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 15, практ. 92–95 **Д/з:** § 15, практ. 96
16 17	Змяненне назоўнікаў. Лік і склон назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку і роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах	Садзейнічаць асэнсаванню вучнямі формаў змянення назоўнікаў, узнавіць і пашырыць іх веды пра зменныя марфалагічныя прыметы ліку і склону назоўнікаў; пазнаёміць з групамі назоўнікаў, якія маюць форму толькі адзіночнага або толькі множнага ліку, узбагачаць слоўнік вучняў новымі семантычнымі групамі слоў. Выпрацоўваць уменне вызначаць лік і склон назоўнікаў, адрозніваць назоўнікі, якія маюць форму толькі аднаго з лікаў, правільна ўжываць такія назоўнікі ў маўленні. Дапамагчы вучням асэнсаваць, што ў беларускай і рускай мовах лік і род некаторых назоўнікаў не супадае, практычна пазнаёміць з такімі назоўнікамі, навучыць правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 16, практ. 97–105, практыкаванні са зборнікаў дыдактычных матэрыялаў па беларускай мове **Д/з:** § 16, практ. 106

1	2	3	4
18	Асновы назоўніка. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (у давальным і месным склонах адзіночнага ліку)	Дапамагчы вучням асэнсаваць сутнасць падзелу асноў назоўнікаў на 4 групы, залежнасць ужывання склонавых канчаткаў ад характару асновы назоўніка. Садзейнічаць засваенню вучнямі сістэмы канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення, усведамленню залежнасці правапісу канчаткаў у давальным і месным склонах адзіночнага ліку ад апошняга зычнага асновы або месца націску ў слове. Удасканальваць уменні вызначаць аснову і канчатак у формах прамога і ўскоснага склонаў назоўнікаў, хутка і правільна скланяць разнастайныя назоўнікі 1-га скланення і правільна ўжываць у вуснай і пісьмовай мове іх склонавыя формы, у тым ліку жаночыя прозвішчы на ***-а, -я, -ка***. Выпрацоўваць навуковы стыль маўлення вучняў	§ 17 практ. 107–111 *Д/з*: § 17, практ. 112
19 20	Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (у родным і месным склонах адзіночнага ліку)	Дапамагчы вучням засвоіць правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення, усвядоміць залежнасць канчаткаў назоўнікаў мужчынскага роду ў родным і месным склонах ад лексічнага значэння або характару апошняга зычнага асновы; пашырыць слоўнікавы склад мовы школьнікаў новымі групамі слоў. Выпрацоўваць уменні вызначаць назоўнікі 2-га скланення, правільна адносіць да груп адушаўлёных-неадушаўлёных, асабовых, зборных, прасторавых, рэчыўных, абстрактных; тлумачыць выбар канчаткаў пэўнага склону; правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні назоўнікі мужчынскага і ніякага роду ў родным і месным склонах, у тым ліку назоўнікі, якія абазначаюць лінгвістычныя тэрміны, імёны і прозвішчы людзей, назвы гарадоў; карыстацца пры неабходнасці тлумачальным, арфаграфічным і перакладным слоўнікамі	§ 18, практ. 113, 114, 116, 117 *Д/з*: § 18, практ. 115, 118

Працяг

1	2	3	4
21	Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (у творным склоне адзіночнага ліку)	Садзейнічаць засваенню вучнямі правапісу канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення, асэнсаванню імі залежнасці выбару канчаткаў у творным склоне ад апошняга зычнага асновы. Удасканальваць уменні вызначаць склон назоўніка па склонавых і сэнсавых пытаннях, перадаваць на пісьме падаўжэнне зычнага асновы назоўнікаў у творным склоне, правільна ўжываць назоўнікі 3-га скланення ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 19, практ. 119—122 **Д/з:** § 19, практ. 123
22	Правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (у родным і давальным склонах)	Дапамагчы вучням засвоіць сістэму канчаткаў назоўнікаў трох тыпаў скланення ў множным ліку, асэнсаваць адрозненне канчаткаў адушаўлёных і неадушаўлёных назоўнікаў у вінавальным склоне, асэнсаваць агульныя заканамернасці ўтварэння формаў назоўнікаў роднага склону множнага ліку. Удасканальваць уменні вызначаць лік, склон і скланенне назоўнікаў, характарызаваць аснову, тлумачыць правапіс канчаткаў, правільна ўжываць назоўнікі трох тыпаў скланення ў множным ліку ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 20, практ. 124—130 **Д/з:** § 20, практ. 131
23	**Кантрольны дыктант**	Выявіць узровень сфарміраванасці арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў вучняў	
24	Скланенне назоўнікаў, якія абазначаюць імёны, прозвішчы і назвы населеных пунктаў на ***-оў***, ***-ёў***, ***-аў***, ***-ын***, ***-ін***	Пазнаёміць вучняў з адрозненнямі ў змяненні ўласных назоўнікаў, якія абазначаюць прозвішчы і назвы населеных пунктаў, навучыць правільна ўтвараць формы творнага і меснага склонаў уласных назваў на ***-оў***, ***-ёў***, ***-аў***, ***-ын***, ***-ін***, ужываць такія назоўнікі ў вусным і пісьмовым маўленні. Пазнаёміць з парадкам і правіламі марфалагічнага разбору назоўніка	§ 21, практ. 132—134, складанне спісаў вучняў, і назваў населеных пунктаў сваёй мясцовасці **Д/з:** § 21, практ. 135

1	2	3	4
25	Рознасканяльныя назоўнікі	Дапамагчы вучням выразна акрэсліць і запомніць 4 групы рознасканяльных назоўнікаў: назоўнікі ніякага роду з канчаткамі ***-я***, ***-ё***; тры назоўнікі на ***-мя*** (*імя, племя, стрэмя*); назоўнікі мужчынскага роду з канчаткамі ***-а***, ***-я***; назоўнікі агульнага роду. Засвоіць асаблівасці змянення і ўжывання ў маўленні рознасканяльных назоўнікаў; выпрацоўваць уменні вызначаць і ўтвараць іх разнастайныя формы, правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 22, практ. 136—143 **Д/з**: § 22, практ. 144
26	Нескланяльныя назоўнікі	Пазнаёміць вучняў з лексічнымі групамі нескланяльных назоўнікаў, асаблівасцямі іх ужывання ў маўленні. Узбагачаць слоўнік вучняў новымі групамі слоў. Выпрацоўваць уменні вызначаць нескланяльныя назоўнікі ў тэксце, дакладна высвятляць значэнне іншамоўных назоўнікаў, выяўляць значэнне склону нескланяльных назоўнікаў па сувязі з іншымі словамі ў сказе (па дапасаваным прыметніку, выказніку, па слове, якое кіруе назоўнікам, па прыназоўніку); вызначаць род такіх назоўнікаў і ў сувязі з гэтым правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 23, практ. 145—148 **Д/з**: § 23, практ. 149
27	Спосабы ўтварэння назоўнікаў. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі ***-ак***, ***-ык***, ***-ік***, ***-ачк-***, ***-ечк-***	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з асноўнымі спосабамі ўтварэння назоўнікаў, спрыяць засваенню правапісу назоўнікаў з суфіксамі ***-ак***, ***-ык***, ***-ік***, ***-ачк-***, ***-ечк-***, правільна ўжываць такія назоўнікі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 24, 25, практ. 150—160

1	2	3	4
II чвэрць (21 урок) Назоўнік (працяг) (5 гадзін)			
28	Мяккі знак перад суфіксамі ***-к-***, ***-чык*** і ў суфіксах ***-аньк-***, ***-еньк-***	Спрыяць засваенню напісання мяккага знака перад суфіксамі ***-к-***, ***-чык*** і ў суфіксах ***-аньк-***, ***-еньк-***, правільна ўжываць такія назоўнікі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 26, практ. 161–165 **Д/з**: § 26, практ. 166
29	Складаныя назоўнікі, іх правапіс	Пазнаёміць вучняў з утварэннем, ужываннем і правапісам складаных назоўнікаў, папоўніць слоўнікавы запас вучняў новымі групамі слоў. Выпрацоўваць уменні знаходзіць такія назоўнікі ў тэкстах, выяўляць іх лексічнае значэнне і сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце, правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 27, практ. 167–171 **Д/з**: § 27, практ. 172
30	Правапіс ***не*** (***ня***), ***ні*** з назоўнікамі	Спрыяць засваенню вучнямі правапісу ***не*** (***ня***), ***ні*** з назоўнікамі. Выпрацоўваць уменні адрозніваць назоўнікі, якія без ***не*** (***ня***) не ўжываюцца, падбіраць да назоўнікаў сінонімы ці блізкія па значэнні выразы, адэкватна ўспрымаць сэнс сказаў з супрацьпастаўленнем ці адмаўленнем чаго-небудзь, правільна ўжываць назоўнікі з ***не*** (***ня***), ***ні*** ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 28, практ. 173–175 **Д/з**: § 28, практ. 176
31	Сачыненне-апавяданне ў мастацкім стылі па апорных словах	Садзейнічаць выпрацоўцы ў вучняў умення выказваць свае думкі на прапанаваную тэму, захоўваючы неабходны тып і стыль маўлення; вучыць творча асэнсоўваць аб'ём зместу і межы тэмы сачынення з улікам апорных слоў, падпарадкоўваць сваю работу асноўнай думцы, сістэматызаваць назіранні, вызначаць план выказвання, падбіраць неабходныя выяўленчыя моўныя сродкі для найбольш выразнага раскрыцця тэмы і асноўнай думкі; удасканальваць напісанае	

1	2	3	4
32	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме «Назоўнік»	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях тэмы. Удасканальваць уменні адрозніваць разнастайныя лексіка-семантычныя групы назоўнікаў у тэкстах, выяўляць іх сэнсава-стылістычную ролю, даваць поўную марфалагічную характарыстыку, правільна адбіраць назоўнікі пэўных тэматычных груп, выкарыстоўваючы іх сінанімічныя, антанімічныя, стылістычныя і экспрэсіўныя магчымасці для раскрыцця тэмы і асноўнай думкі ва ўласных выказваннях	Кантрольныя заданні на с. 92–94, поўны марфалагічны разбор назоўнікаў **Д/з:** падрыхтаваць вуснае паведамленне «Назоўнік як часціна мовы»
Прыметнік (17 гадзін, з іх 3 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
33	Прыметнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма	Дапамагчы вучням глыбей асэнсаваць спецыфіку прыметніка як часціны мовы, пашырыць уяўленне пра яго семантыку, граматычныя сувязі паміж прыметнікам і тым назоўнікам, да якога ён адносіцца ў складзе словазлучэння, сінтаксічную ролю ў сказе. Выпрацоўваць уменні фармуляваць азначэнне прыметніка, вылучаць прыметнікі з тэксту ў складзе словазлучэння, інтанацыйна правільна чытаць словазлучэнні з прыметнікамі ў сказах і тэкстах, выяўляць сэнсавую і граматычную сувязь паміж часцінамі мовы, праводзіць марфалагічны разбор, устанаўліваць пачатковую форму, вызначаць семантычную групу, ацэньваць сэнсава-стылістычную ролю прыметніка ў тэксце. Вучыць дарэчы ўжываць прыметнікі ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 29, практ. 177–183 **Д/з:** § 29, практ. 184

1	2	3	4
34	Паглыбленне паняцця пра апісанне: спосабы апісанняў. Апісанне прымет рэчаў, з'яў, людзей, жывёл, ландшафтаў, мясцовасці, памяшканняў	Садзейнічаць паглыбленню і пашырэнню ведаў вучняў пра апісальны тэкст як важнейшы элемент маўлення, які дазваляе ярка, зрокава наглядна, вобразна ўявіць прадмет, чалавека, падзею, з'яву. Пазнаёміць з асноўнай прыметай апісання — паказам шэрагу прымет, з'яў, прадметаў ці падзей, якія неабходна ўявіць сабе ўсе адначасова; замацоўваць паняцце лагічнай схемы (агульнае ўражанне, пералік асобных прымет, выснова); засяродзіць увагу школьнікаў на ролі прыметнікаў у апісанні. Выпрацоўваць уменні знаходзіць апісанні ў тэкстах мастацкага, навуковага і афіцыйнага стыляў, аналізаваць апісальныя тэксты, вызначаць тэму і асноўную думку, вылучаць кампазіцыйныя часткі, тлумачыць падзел на абзацы; складаць план, даваць часткам плана загалоўкі, пераказваць тэкст. Выпрацоўваць навык стварэння ўласных апісальных тэкстаў	§ 30, практ. 185–189 **Д/з:** § 30, практ. 190
35	Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні	Дапамагчы вучням засвоіць агульнае паняцце пра семантыка-граматычныя разрады прыметнікаў, пазнаёміць з іх сэнсавымі і граматычнымі асаблівасцямі, асобнымі семантычнымі групамі, раскрыць стылістычную своеасаблівасць і функцыю ў тэксце. Выпрацоўваць уменні адрозніваць якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі ў тэкстах, тлумачыць асаблівасці іх значэння, дапасоўваць да адпаведных назоўнікаў, падбіраць, па магчымасці, антонімы і сінонімы, складаць з імі сказы і тэксты, адзначаць выпадкі прамога і пераноснага ўжывання якасных прыметнікаў, пераходу адносных і прыналежных прыметнікаў у якасныя, пераноснага ўжывання прыналежных прыметнікаў у адносным і якасным значэннях	§ 31, практ. 191–195 **Д/з:** § 31, практ. 196

1	2	3	4
36	Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне. Поўная і кароткая формы	Садзейнічаць засваенню вучнямі асаблівасцей утварэння, значэння, сінтаксічнай і стылістычнай функцый формаў ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Пазнаёміць з ужываннем у мове словазлучэнняў «прым. + наз. з прыназ.». Выхоўваць лінгвістычнуюназіральнасць школьнікаў. Выпрацоўваць уменні вылучаць такія формы ў маўленні; вызначаць спосаб іх утварэння, адзначаць семантыка-стылістычныя асаблівасці ў тэкстах розных стыляў. Актывізаваць ужыванне вучнямі разнастайных формаў ступеней параўнання ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні. Дапамагчы вучням асэнсаваць семантыка-граматычную спецыфіку кароткіх формаў якасных прыметнікаў, іх фармальныя прыметы, спосаб утварэння, сінтаксічную і стылістычную функцыі ў маўленні. Практычна пазнаёміць з тэкстамі, у якіх ужываюцца кароткія формы прыметнікаў. Выпрацоўваць уменні бачыць кароткія формы прыметнікаў у тэксце, вызначаць сінтаксічную і стылістычную ролі; правільна перакладаць з рускай мовы на беларускую, дарэчна ўжываць ва ўласным маўленні	§ 32, практ. 197—201 (на выбар) § 33, практ. 203—206 (на выбар) Д/з: § 32, практ. 202, 207 (на выбар)
37 38	**Кантрольны пісьмовы пераказ мастацкага тэксту з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання**	Выявіць узровень выпрацоўкі ў вучняў уменняў аналізаваць апавядальны тэкст, вызначаць яго тэму і асноўную думку, тып і стыль, кампазіцыйныя асаблівасці, бачыць «тэхніку» яго стварэння; узнаўляць прапанаваны тэкст, карыстаючыся словам з улікам яго значэння, стылістычных выяўленчых магчымасцей, лексічнай спалучальнасці. Фарміраваць у вучняў эмацыянальныя адносіны да прадметаў апісання, уменне перадаваць іх адпаведнымі моўнымі сродкамі. Развіваць і ўмацоўваць адчуванне	

1	2	3	4
		стылю, узбагачаць маўленне вучняў лексічнымі, фразеалагічнымі і граматычнымі сродкамі мовы	
39	Скланенне якасных і адносных прыметнікаў	Садзейнічаць абагульненню вучнямі матэрыялу пра скланенне якасных і адносных прыметнікаў, вывучанага ў пачатковай школе. Паглыбіць разуменне залежнасці склонавых формаў прыметніка ад азначальнага назоўніка. Дапамагчы наглядна ўявіць агульную парадыгму скланення прыметнікаў з вылучэннем цвёрдага і мяккага варыянтаў. Забяспечыць трывалае і асэнсаванае запамінанне канчаткаў, якія з'яўляюцца цяжкімі для правапісу. Выпрацоўваць уменні вылучаць словазлучэнні «прым. + наз.», выяўляць у іх сэнсавую і граматычную сувязь, называць адпаведныя моўныя сродкі (інтанацыя, канчатак залежнага слова), асаблівую ўвагу засяродзіўшы на словазлучэннях, у якіх назоўнікі ўжыты з прыназоўнікам; скланяць прыметнікі разам з назоўнікамі, абапіраючыся на чуццё роднай мовы і пытанне ад азначальнага назоўніка да прыметніка; вычляняць канчаткі ў формах прыметніка і вызначаць іх ролю ў выражэнні сінтаксічнай сувязі прыметніка з назоўнікам. Інтанацыйна правільна чытаць словазлучэнні з прыметнікам у складзе сказаў і тэкстаў, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 34, практ. 208–218 Д/з: § 34, практ. 219
40	Скланенне прыметнікаў у множным ліку	Спрыяць засваенню вучнямі агульнай сістэмы скланення якасных і адносных прыметнікаў у множным ліку. Выпрацоўваць уменні дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў у множным ліку, адрозніваць асновы на цвёрды і зацвярдзелы зычны, *г, к, х* і мяккі зычны, вылучаць і характарызаваць	§ 35, практ. 220–223 Д/з: § 35, практ. 224

1	2	3	4
		словазлучэнні «прым. + наз.», тлумачыць правапіс канчаткаў прыметнікаў, ужываць прыметнікі ва ўласным маўленні	
41	Утварэнне, скланенне і правапіс прыналежных прыметнікаў	Дапамагчы вучням усвядоміць сутнасць прыналежнага значэння і спосаб утварэння прыналежных прыметнікаў, практычна авалодаць сістэмай скланення і правапісам склонавых формаў такіх прыметнікаў, раскрыць магчымасці іх пераноснага ўжывання ў адносным і якасным значэннях. Выпрацоўваць уменні вылучаць у тэксце і падбіраць прыналежныя прыметнікі і іх формы, тлумачыць сутнасць іх прыналежнага значэння, асаблівасці ўтварэння і марфемнай структуры, адзначаць выпадкі пераноснага ўжывання; пісаць вялікую літару ў прыналежных прыметніках, утвораных ад уласных імёнаў; дарэчы ўжываць ва ўласным маўленні	§ 36, практ. 225–228 Д/з: § 36, практ. 229
42	Асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з асноўнымі спосабамі ўтварэння прыметнікаў. Выпрацоўваць уменні адрозніваць невытворныя і вытворныя словы, вызначаць спосаб утварэння вытворных прыметнікаў і графічна фіксаваць яго па адпаведнай схеме, утвараць прыметнікі разнастайнымі спосабамі, развіваць навуковы стыль маўлення вучняў. Пазнаёміць вучняў з парадкам і правілам поўнага марфалагічнага разбору прыметніка; выпрацоўваць навуковы стыль маўлення вучняў	§ 37, практ. 230–233 Д/з: § 37, практ. 234

Працяг

1	2	3	4
43	Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання, правапіс	Садзейнічаць знаёмству вучняў з групамі ацэначных прыметнікаў, асаблівасцямі іх лексічнага значэння, спосабамі ўтварэння і сферай ужывання. Спрыяць засваенню вучнямі правапісу вытворных прыметнікаў. Выпрацоўваць уменні бачыць ацэначныя прыметнікі ў тэксце, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю, правільна ўтвараць і пісаць, дарэчы ўжываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 38, практ. 235—238 **Д/з:** § 38, практ. 239
44	Прыметнікі з суфіксам ***-ск-***, іх правапіс	Дапамагчы вучням засвоіць правілы вымаўлення і напісання адносных прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса ***-ск-***. Удасканальваць уменні ўстанаўліваць разрад прыметніка, утваральную аснову, канцавы зычны, тлумачыць умовы вымаўлення і напісання суфікса ***-ск-***, ужываць адносныя прыметнікі ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 39, практ. 240—243 **Д/з:** § 39, практ. 244
45	Правапіс ***-н-***, ***-нн-*** у прыметніках	Дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання ***-н-*** або ***-нн-*** у прыметніках. Выпрацоўваць уменні ўстанаўліваць утваральную аснову і словаўтваральны суфікс прыметніка, карыстацца правілам і адпаведным алгарытмам разважання пры напісанні ***-н-*** ці ***-нн-*** у прыметніках; папаўняць слоўнікавы склад мовы вучняў новымі групамі слоў; вучыць ужываць прыметнікі ва ўласным маўленні з пэўнымі выяўленчымі і стылістычнымі мэтамі	§ 40, практ. 245—248 **Д/з:** § 40, практ. 249
46	Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў	Дапамагчы вучням усвядоміць марфолага-сінтаксічную прыроду складаных прыметнікаў, вылучыць асноўныя разнавіднасці складання, стварыць умовы для трывалага засваення правілаў дэфіснага і злітнага напісання прыметнікаў, акрэсліць стылістычную сферу іх ужывання.	§ 41, практ. 250—254 **Д/з:** § 41, практ. 255

1	2	3	4
		Выпрацоўваць уменні адрозніваць утварэнне складаных прыметнікаў на аснове словазлучэнняў з удзелам і без удзелу спалучальных галосных і суфіксаў і на аснове аб'яднання слоў, звязаных спалучальнай сувяззю; падбіраць складаныя прыметнікі ад спалучэння слоў розных тыпаў і тэрміналагічных назваў, прымяняць алгарытм разважання для ўстанаўлення злітнага або дэфіснага напісання; ужываць складаныя прыметнікі ў вусным і пісьмовым маўленні	
47	Правапіс ***не*** (***ня***) з прыметнікамі	Дапамагчы вучням засвоіць правіла напісання ***не*** (***ня***) з прыметнікамі. Выпрацоўваць уменні прымяняць неабходны алгарытм разважання, адрозніваць прыметнікі, якія без ***не*** (***ня***) не ўжываюцца, падбіраць да прыметнікаў сінонімы ці блізкія па значэнні выразы, браць пад увагу наяўнасць у сказах супрацьпастаўлення або слоў *далёка не, зусім не, нічуць не*; правільна ўжываць прыметнікі з ***не*** (***ня***) у вусным і пісьмовым маўленні	§ 42, практ. 256–259 Д/з: § 42, практ. 260
48	Сачыненне-апавяданне ў мастацкім стылі з апісаннем прымет рэчаў, жывёл або памяшкання	Удасканальваць уменне вучняў ствараць тэксты ў мастацкім стылі з уключэннем у іх апісанняў прымет рэчаў, жывёл або памяшкання; папаўняць слоўнікавы склад мовы вучняў; вучыць творча выкарыстоўваць вобразна-выяўленчыя магчымасці прыметніка	Праца над асэнсаваннем тэмы і мэты тэксту, яго тыпу і стылю, складанне плана сачынення, вызначэнне месца апісання, падбор апорных словазлучэнняў і сказаў, самастойная праца над першым варыянтам тэксту, абмеркаванне некалькіх работ, рэдагаванне тэксту

1	2	3	4
III чвэрць (31 урок)			
49	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага	Паглыбляць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях раздзела. Удасканальваць уменні адрозніваць прыметнікі ў тэксце, даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыку, выкарыстоўваць сінанімічныя, антанімічныя, стылістычныя і выяўленчыя магчымасці прыметніка ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 138–140 **Д/з:** вуснае паведамленне аб прыметніку як часціне мовы
Лічэбнік (14 гадзін, з іх 1 гадзіна – на пісьмовую работу)			
50	Лічэбнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лічэбнікі колькасныя і парадкавыя, зборныя і дробавыя	Стварыць умовы для фарміравання ў вучняў агульнага ўяўлення аб лічэбніку як часціне мовы, яго лексіка-граматычным значэнні, марфалагічных прыметах і сінтаксічных асаблівасцях у структуры словазлучэння і сказа, разрадах лічэбнікаў па значэнні. Выпрацоўваць уменні фармуляваць азначэнне лічэбніка, распазнаваць лічэбнікі ў тэксце, адрозніваць ад вытворных назоўнікаў, прыметнікаў і прыслоўяў, характарызаваць іх марфалагічныя прыметы і сінтаксічную ролю ў словазлучэнні і сказе; ужываць лічэбнікі ва ўласным маўленні	§ 43, практ. 261–267 **Д/з:** § 43, практ. 268
51	Паглыбленне паняцця пра разважанне: асаблівасці разгортвання думкі ў тэкстах-разважаннях	Садзейнічаць паглыбленню ў вучняў паняцця пра разважанне: асаблівасці разгортвання думкі ў тэкстах-разважаннях; удасканальваць уменні аналізаваць тэксты-разважанні навуковага стылю, дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, складаць план	§ 44, практ. 272 **Д/з:** практ. 273

1	2	3	4
52	Пераклад з рускай мовы на беларускую тэксту навуковага стылю з элементамі разважання	Спрыяць паглыбленню ў вучняў паняцця пра лагічную структуру тэксту тыпу разважання. Выпрацоўваць уменне перакладаць тэкст навуковага стылю з элементамі разважання, дакладна перадаючы лагічную структуру арыгінала, навуковую тэрміналогію	
53	Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс	Садзейнічаць знаёмству вучняў са структурай лічэбнікаў, іх этымалогіяй і на гэтай аснове паглыбляць разуменне семантыкі і словаўтварэння часціны мовы. Выпрацоўваць у вучняў уменне адрозніваць простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі, тлумачыць іх структуру, адрозніваць колькасныя і парадкавыя лічэбнікі, замяняць на пісьме лічбавыя абазначэнні слоўнымі, правільна вымаўляць лічэбнікі, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 45, практ. 274–276 Д/з: § 45, практ. 277
54	Лічэбнікі, якія абазначаюць цэлыя лікі, іх ужыванне і правапіс. Скланенне лічэбнікаў ад *пяці* да *дваццаці* і лічэбніка *трыццаць*. Лічэбнікі *адзін*, *адна*, *адно*, *адны*	Стварыць умовы для знаёмства вучняў са спалучальнасцю колькасных лічэбнікаў, што абазначаюць цэлыя лікі, з назоўнікамі; паказаць іх сінтаксічную ролю ў сказе, а таксама своеасаблівасць тэкстаў з такімі лічэбнікамі. Выпрацоўваць уменні вымаўляць разнастайныя формы колькасных лічэбнікаў, запісваць словамі, змяняць па склонах, дапасоўваць да назоўнікаў; вызначаць марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю ў сказе і сэнсава-граматычную ролю ў тэксце, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 45, тэарэтычны матэрыял на с. 151, 153, практ. 280–285 Д/з: § 45, практ. 286

1	2	3	4
55	Колькасныя лічэбнікі *два, дзве, тры, чатыры* і зборныя *абое, абодва, абедзве*, іх ужыванне	Дапамагчы вучням засвоіць асаблівасці спалучэння з назоўнікамі, скланенне і правапіс колькасных лічэбнікаў названай групы. Выпрацоўваць уменні ўтвараць словазлучэнні з гэтымі назоўнікамі, змяняць іх па склонах, правільна афармляць на пісьме, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 45, тэарэтычны матэрыял на с. 155, практ. 282, дадатковы дыдактычны матэрыял **Д/з:** § 45, практ. 296
56	Змяненне і ўжыванне лічэбнікаў *сорак, сто, дзевяноста*; змяненне і правапіс складаных лічэбнікаў ад *пяцідзесяці* да *васьмідзесяці*, ад *двухсот* да *дзевяцісот*, а таксама лічэбнікаў *нуль, тысяча, мільён, мільярд*	Спрыяць засваенню вучнямі асаблівасцей скланення і спалучэння з назоўнікамі лічэбнікаў названых груп. Выпрацоўваць уменні выразна вымаўляць і пісаць лічэбнікі ва ўсіх склонавых формах у спалучэнні з разнастайнымі назоўнікамі, свядома і правільна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 45, тэарэтычны матэрыял на с. 158, 159, практ. 297–299 **Д/з:** § 45, практ. 300
57	Скланенне, ужыванне і правапіс састаўных колькасных лічэбнікаў	Дапамагчы вучням засвоіць асаблівасці змянення і спалучэння з назоўнікамі састаўных колькасных лічэбнікаў. Выпрацоўваць уменні выразна вымаўляць і пісаць лічэбнікі ў разнастайных склонавых формах, спалучаць з назоўнікамі, актыўна карыстацца ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 45, тэарэтычны матэрыял на с. 159, практ. 301, дадатковы дыдактычны матэрыял **Д/з:** § 45, практ. 302

1	2	3	4
58	Абазначэнне прыблізнай колькасці	Садзейнічаць знаёмству вучняў са спосабамі перадачы прыблізнай колькасці, паказаць разнастайнасць сродкаў: 1) парадак слоў (*тон сем, кіламетры тры*); 2) спалучэнні двух лічэбнікаў (*сем-восем метраў, трыста — чатырыста машын*); 3) словы і спалучэнні слоў (*каля, за, прыблізна, больш за, больш чым, больш як*); выпрацоўваць уменне перадаваць прыблізную колькасць у адпаведнасці са стылем маўлення	§ 45, тэарэтычны матэрыял на с. 161, практ. 303–307 **Д/з**: § 45, практ. 308
59	Скланенне, ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў	Садзейнічаць засваенню вучнямі значэння парадкавых лічэбнікаў, іх граматычнай суаднесенасці з аднослымі прыметнікамі і словаўтваральнай сувязі з колькаснымі лічэбнікамі, сінтаксічнай ролі ў сказе. Выпрацоўваць уменні выдзяляць словазлучэнні з парадкавымі лічэбнікамі, устанаўліваць іх значэнне, вызначаць род, лік і склон, спосаб утварэння, сінтаксічную ролю ў сказе; правільна змяняць разнастайныя групы парадкавых лічэбнікаў; ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 48, практ. 329–336 **Д/з**: § 48, практ. 337 або 338
60	Скланенне, ужыванне і правапіс дробавых лічэбнікаў	Стварыць умовы для паглыблення ўяўлення вучняў пра значэнне дробавых лічэбнікаў, засваення асаблівасцей іх змянення і ўжывання. Спрыяць засваенню вучнямі правілаў спалучэння лічэбнікаў *паўтара* і *паўтары* з назоўнікамі мужчынскага, ніякага і жаночага роду. Выпрацоўваць уменні чытаць, запісваць словамі, дапасоўваць да дробавых лічэбнікаў назоўнікі, выпраўляць памылкі ва ўжыванні гэтых лічэбнікаў, свядома карыстацца ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 46, практ. 309–319 **Д/з**: § 46, практ. 320

1	2	3	4
61 62	Скланенне, ужыванне і правапіс зборных лічэбнікаў	Дапамагчы вучням асэнсаваць значэнне зборных лічэбнікаў, якія перадаюць колькасць прадметаў як сукупнасць і маюць адценне сумеснасці; пазнаёміць з іх марфалагічнымі асаблівасцямі (не маюць роду і ліку) і абмежаваннямі ў спалучэнні з назоўнікамі (ужываюцца з назоўнікамі, якія абазначаюць парныя і састаўныя прадметы, асоб мужчынскага полу, маладых істот, са словамі *дзеці, людзі*, а таксама з асабовымі займеннікамі); паказаць сферу выкарыстання (пераважна ў гутарковым, мастацкім і публіцыстычным стылях), магчымасці сінанімічнай замены зборных лічэбнікаў пэўна-колькаснымі. Выпрацоўваць уменні адрозніваць зборныя лічэбнікі ў тэксце, спалучаць з адпаведнымі групамі назоўнікаў, утвараць скланавыя формы, адчуваць іх размоўны характар, выконваць пры неабходнасці сінанімічныя замены, ужываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні. Пазнаёміць з парадкам і правіламі поўнага марфалагічнага разбору лічэбніка	§ 47, практ. 321—326, 339 **Д/з**: § 47, практ. 328, 341
63	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме «Лічэбнік»	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях тэмы. Удасканальваць уменні адрозніваць лічэбнікі ў тэкстах, выяўляць іх сэнсава-стылістычную ролю, даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыку, ужываць ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях у адпаведнасці з літаратурнымі нормамі	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 177 **Д/з**: практ. 340, вуснае паведамленне пра лічэбнік як часціну мовы

Працяг

1	2	3	4
		Займеннік (12 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)	
64	Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні (знаёмства)	Дапамагчы вучням асэнсаваць асаблівасці займенніка як часціны мовы (агульнае значэнне ўказальнасці, адсутнасць здольнасці называць прадмет або прымету), засвоіць іх граматычныя прыметы, сінтаксічную ролю ў сказе і функцыю ў тэксце. Спрыяць знаёмству вучняў з падзелам займеннікаў на групы паводле значэння і граматычных функцый, забяспечыць практычнае засваенне стылістычнай своеасаблівасці ўжывання некаторых займеннікаў у маўленні. Выпрацоўваць уменні даваць азначэнне займенніка, бачыць займеннікі ў тэксце, вызначаць пачатковую форму, устанаўліваць іх марфалагічныя прыметы і сінтаксічную ролю ў простым і складаным сказах, функцыю ў тэксце; ужываць займеннікі ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 49, практ. 342–346 **Д/з**: § 49, практ. 347
65	Паглыбленне паняцця пра апавяданне (асаблівасці разгортвання думкі ў ім)	Садзейнічаць паглыбленню ведаў вучняў пра апавяданне, асаблівасці разгортвання думкі ў ім; выпрацоўваць уменне пазнаваць апавядальныя тэксты, вызначаць іх будову, тэму і асноўную думку, моўныя асаблівасці. Удасканальваць вуснае і пісьмовае маўленне вучняў	§ 50, практ. 348, 349 **Д/з**: § 50, практ. 350
66	Складаны план. Падрабязны пісьмовы пераказ апавядальнага тэксту па складаным плане	Выпрацоўваць уменне састаўляць складаны план апавядання, падрабязна пераказваць тэкст па плане, захоўваючы кампазіцыю і моўныя асаблівасці тэксту	§ 51, практ. 351 **Д/з**: § 51, практ. 352

1	2	3	4
67	Асабовыя займеннікі, іх змяненне, утварэнне і правапіс	Актуалізаваць і паглыбіць веды пра асабовыя займеннікі, удакладніць іх семантыку, асаблівасці склонавых формаў і іх ужывання ў дыялагічным і маналагічным маўленні. Удасканальваць уменні вылучаць займеннікі з тэксту, вызначаць іх разрад (з апорай на вучэбны дапаможнік), устанаўліваць семантыку асабовых займеннікаў, дарэчна ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні. Пазнаёміць з некаторымі правіламі маўленчага этыкету: няветліва гаварыць «ён», «яна» пра асобу, што прысутнічае пры размове; разгледзець выпадкі ўжывання займенніка *Вы* пры ветлівай форме звароту да аднаго суразмоўніка ў вуснай і пісьмовай формах	§ 52, практ. 353–359 Д/з: § 52, практ. 360
68	Зваротны займеннік *сябе*. Прыналежныя займеннікі, іх ужыванне і правапіс	Дапамагчы вучням асэнсаваць спецыфіку лексічнага значэння займенніка *сябе*, які можа ўказваць на любую з трох асоб; пазнаёміць з граматычнымі асаблівасцямі, магчымасцямі ўжывання зваротнага займенніка ў маўленні. Пазнаёміць з фразеалагізмамі, у склад якіх уваходзіць займеннік *сябе*. Выпрацоўваць уменні вызначаць займеннік *сябе* ў тэксце, яго адносіны да адпаведнай асобы, склон; раскрываць значэнне ўстойлівых словазлучэнняў з займеннікам *сябе*, самастойна ўводзіць прапанаваныя фразеалагізмы ў кантэкст; ужываць зваротны займеннік ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні. Стварыць умовы для асэнсавання вучнямі значэння прыналежных займеннікаў, устанавіць іх састаў, своеасаблівасці змянення, пазнаёміць з правіламі пабудовы сказаў з прыналежнымі займеннікамі, каб пазбегнуць двухсэнсоўнасці. Выпрацоўваць уменні вызначаць прыналежныя займеннікі, іх граматычныя прыметы, устанаўліваць, на якую асобу	§ 52, практ. 361–368 Д/з: § 52, практ. 369

1	2	3	4
		яны ўказваюць, правільна ўжываць прыналежныя займеннікі ў вусным і пісьмовым маўленні	
69	Указальныя займеннікі, іх змяненне, утварэнне і правапіс	Дапамагчы вучням асэнсаваць спецыфіку значэння ўказальных займеннікаў, іх марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю ў сказе і сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце. Прапедэўтычна пазнаёміць са складаназалежнымі сказамі, структурнымі кампанентамі якіх з'яўляюцца ўказальныя займеннікі. Выпрацоўваць уменні бачыць указальныя займеннікі ў тэксце, вызначаць, на што яны ўказваюць, змяняць па родах, ліках і склонах або толькі па склонах (*гэтулькі, столькі*), будаваць складаназалежныя сказы з указальнымі займеннікамі, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 52, практ. 370–373 **Д/з**: § 52, практ. 374
70	Азначальныя займеннікі, іх скланенне, утварэнне і правапіс	Спрыяць засваенню вучнямі агульнага значэння азначальнасці, што ўласціва займеннікам, пазнаёміць з адценнямі значэнняў, тыповымі для пэўных займеннікаў: *самы* (*самая, самае, самыя*) — мае выдзяляльна-ўзмацняльнае значэнне, можа ўказваць на максімальнае прыбліжэнне да прадмета; *кожны, любы, усякі* — сінонімы, але *кожны* абазначае «ўсе да аднаго», «усе без выключэння», *любы* — «які заўгодна, на выбар з усіх», *усякі* — «разнастайны», *іншы* — «не такі», паказвае на адрозненне прыметы, якасці прадмета. Дапамагчы засвоіць формы словазмянення азначальных займеннікаў, увесці ў актыўны слоўнікавы запас устойлівыя словазлучэнні з азначальнымі займеннікамі. Выпрацоўваць уменні бачыць азначальныя займеннікі ў тэксце, вызначаць іх марфалагічныя прыметы, сінтаксічную і сэнсавую ролю, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 52, практ. 375–384 **Д/з**: § 52, практ. 385

1	2	3	4
71	Пытальныя і адносныя займеннікі, іх змяненне, утварэнне і правапіс	Стварыць умовы для засваення вучнямі сэнсавых і функцыянальных асаблівасцей пытальных і адносных займеннікаў, іх граматычных формаў і сінтаксічнай ролі ў сказе. Выпрацоўваць уменні адрозніваць у тэксце займеннікі-амонімы, характарызаваць іх граматычныя формы, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 52, практ. 386—390 **Д/з:** § 52, практ. 391
72 73	Няпэўныя займеннікі, іх змяненне, утварэнне і правапіс. Адмоўныя займеннікі, іх змяненне, утварэнне і правапіс	Дапамагчы вучням пазнаёміцца з асаблівасцямі няпэўных займеннікаў, засвоіць семантычныя адрозненні паміж імі, усвядоміць спосаб утварэння, формы змянення, сінтаксічную ролю ў сказе, сэнсава-граматычную ролю ў тэксце. Выпрацоўваць уменні вызначаць няпэўныя займеннікі ў тэкстах, удакладняць іх семантыку, суадносіць з адпаведнымі часцінамі мовы, вызначаць будову, правільна вымаўляць і пісаць, дарэчы ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні. Стварыць умовы для асэнсавання вучнямі спецыфікі значэння адмоўных займеннікаў у кантэксце, дапамагчы засвоіць вымаўленне і правапіс, формы змянення, спосаб утварэння, сінтаксічную ролю ў сказе, сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце. Выпрацоўваць уменні вызначаць адмоўныя займеннікі ў тэксце, састаўляць сказы з адмоўнымі займеннікамі, вызначаць іх марфалагічныя прыметы, сінтаксічную і сэнсавую ролю ў сказе і тэксце; ужываць адмоўныя займеннікі ў маўленні; развіваць навуковы стыль маўлення вучняў	§ 52, практ. 392—401 **Д/з:** § 52, практ. 402
74	**Кантрольны дыктант**	Выявіць узровень сфарміраванасці арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў вучняў	

1	2	3	4
75	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па тэме «Займеннік як часціна мовы»	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях тэмы. Пазнаёміць з парадкам і правіламі поўнага марфалагічнага разбору займеннікаў. Удасканальваць уменні адрозніваць разрады займеннікаў паводле значэння, выяўляць іх сэнсавую і граматычную ролю ў тэксце, выкарыстоўваць іх сінанімічныя, антанімічныя, выяўленчыя магчымасці ва ўласных выказваннях	§ 53, кантрольныя заданні на с. 211, 212 **Д/з:** практ. 403
Дзеяслоў (26 гадзін, з іх 4 гадзіны – на пісьмовыя работы)			
76	Дзеяслоў як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля	Паўтарыць, паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра дзеяслоў як часціну мовы. Дапамагчы засвоіць асноўныя прыметы дзеяслова, канкрэтызаваць змест граматычнага тэрміна «дзеянне», пашырыць уяўленне пра лексічныя групы дзеясловаў, паказаць іх сэнсава-граматычную ролю ў тэксце, папоўніць слоўнік вучняў новымі лексіка-семантычнымі групамі слоў; выпрацоўваць уменне фармуляваць азначэнне дзеяслова, распазнаваць дзеясловы ў тэксце, адрозніваць іх ад іншых часцін мовы, вызначаць сэнсава-граматычную ролю ў тэксце, класіфікаваць паводле пэўных лексіка-семантычных груп, вызначаць зменныя марфалагічныя прыметы (час, асобу, лік, род), сінтаксічную ролю ў словазлучэнні і сказе	§ 54, практ. 404–411 **Д/з:** § 54, практ. 412
77	Правапіс ***не* (*ня*), *ні*** з дзеясловамі	Спрыяць засваенню вучнямі правапісу ***не* (*ня*), *ні*** з дзеясловамі; удасканальваць уменні вызначаць дзеясловы ў тэксце, адрозніваць дзеясловы, якія без ***не* (*ня*)** не ўжываюцца, падбіраць да дзеясловаў сінонімы ці блізкія па значэнні выразы, адэкватна ўспрымаць сэнс сказаў	§ 55, практ. 413–415 **Д/з:** § 55, практ. 417

1	2	3	4
		з супрацьпастаўленнем, адмаўленнем ці сцвярджэннем чаго-небудзь; узбагачаць мову вучняў беларускімі прыказкамі і прымаўкамі, правільна ўжываць дзеясловы з ***не* (*ня*)**, ***ні*** ў вусным і пісьмовым маўленні	
78	Неазначальная форма дзеяслова, яе сінтаксічная роля	Дапамагчы вучням зразумець асаблівасці значэння неазначальнай формы дзеяслова, усвядоміць яе граматычныя прыметы, сінтаксічную ролю ў сказе і прызначэнне ў маўленні; выпрацоўваць уменні правільна падбіраць інфінітыў да кожнай формы асабовага дзеяслова, вызначаць неазначальную форму дзеяслова ў тэксце па пытаннях, асаблівасцях значэння і граматычных прыметах; правільна пісаць і ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні, узбагачаць мову вучняў інфінітыўнымі канструкцыямі	§ 56, практ. 418—423
IV чвэрць (26 урокаў)			
79	Публіцыстычны стыль, яго жанры, сфера выкарыстання	Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў уяўлення пра сферу і мэту выкарыстання, асноўныя моўныя прыметы, жанры публіцыстычнага стылю; выпрацоўваць уменне вызначаць тэксты публіцыстычнага стылю, называць сферу і мэту выкарыстання, жанры, асноўныя моўныя прыметы, выдзяляць у іх апорныя словы і словазлучэнні; складаць вусныя і пісьмовыя тэксты віншаванняў, пісаць лісты	§ 57, практ. 430—434 **Д/з**: § 57, практ. 436

1	2	3	4
80	Асабовыя дзеясловы, іх ужыванне і правапіс канчаткаў	Актуалізаваць і пашырыць веды вучняў пра сэнсавае значэнне (паказвае на адносіны дзеяння і яго ўтваральніка да таго, хто гаворыць), граматычныя асаблівасці і ролю ў тэксце асабовых формаў дзеяслова; пазнаёміць з ужываннем дзеясловаў адной асобы ў значэнні іншай; выпрацоўваць уменне бачыць асабовыя формы дзеяслова ў тэксце, вызначаць іх лік і асобу ў цяперашнім і будучым часе, сінтаксічную ролю ў сказе і сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце; удасканальваць арфаграфічныя навыкі	§ 58, практ. 437—440 **Д/з:** § 58, практ. 441
81	Безасабовыя дзеясловы, іх ужыванне і правапіс канчаткаў	Дапамагчы вучням асэнсаваць значэнне безасабовых дзеясловаў, асаблівасці іх словазмянення, сінтаксічную ролю ў сказе, функцыянаванне ў маўленні; практычна пазнаёміць з усімі тыпамі безасабовых дзеясловаў і адпаведнымі безасабовымі канструкцыямі; выпрацаваць уменне выяўляць безасабовыя дзеясловы ў тэкстах, утвараць усе магчымыя формы, вызначаць сэнсава-стылістычную ролю, мэту ўжывання (жаданне падкрэсліць значнасць самога дзеяння; паказ дзеяння, якое адбываецца незалежна ад волі асобы; значэнне стыхійнасці, міжвольнасці дзеяння; апісанне стану прыроды); выкарыстоўваць безасабовыя дзеясловы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 59, практ. 442—446 **Д/з:** § 59, практ. 447

1	2	3	4
82	Зваротныя дзеясловы, іх ужыванне і правапіс	Дапамагчы вучням засвоіць сутнасць паняцця «зваротныя дзеясловы», практычна пазнаёміць з разнастайнымі семантычнымі групамі і іх значэннямі (аб'ектам дзеяння з'яўляецца сам утваральнік дзеяння: *апранацца*, *мыцца*, *галіцца*; дзеянне двух або некалькіх суб'ектаў, якія адначасова з'яўляюцца і аб'ектамі таго самага дзеяння: *вітацца*, *абдымацца*, *біцца*, *цалавацца*; дзеянне, якое перадае ўнутраны стан суб'екта: *весяліцца*, *злавацца*, *здзіўляцца*; дзеянне, утворанае суб'ектам на сваю карысць: *будавацца*, *запасацца*, *збірацца* і інш.); выпрацоўваць уменне пазнаваць зваротныя дзеясловы ў тэкстах, вызначаць сэнсава-граматычную ролю, утвараць разнастайныя формы і правільна пісаць фармальны паказчык зваротнасці – постфікс ***-ся*** (***-ца***, ***-цца***), ілюстраваць семантычныя групы зваротных дзеясловаў прыкладамі, вызначаць сінтаксічную ролю ў сказе, ужываць у вусным і пісьмовым маўленні	§ 60, практ. 448–452 Д/з: § 60, практ. 453
83 84	Трыванні дзеяслова. Утварэнне і ўжыванне дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання	Дапамагчы вучням асэнсаваць сутнасць трывальных адносін дзеясловаў, іх формы, значэнне і функцыю ў маўленні, пазнаёміць з сэнсавымі прыметамі трывальных пар (указваюць на абмежаванасць або неабмежаванасць дзеяння) і найбольш даступнымі прыёмамі распазнавання па пытаннях, устанавіць залежнасць формаў часу ад трывання, пазнаёміць са спосабамі выражэння трывальных адрозненняў; выпрацоўваць уменне захоўваць трыванне пры вызначэнні неазначальнай формы дзеяслова, практычна пазнаёміць вучняў з групай дзеясловаў, якія адначасова маюць значэнне незакончанага і закончанага трывання,	§ 61, практ. 454–458, 460, 461 Д/з: § 61, практ. 459, 462

1	2	3	4
		навучыць вызначаць трыванне такіх дзеясловаў у кантэксце. Спыніць увагу вучняў на разнастайных выпадках чаргавання галосных і зычных гукаў пры ўтварэнні формаў дзеясловаў, трывальных пар; выпрацоўваць адпаведныя арфаграфічныя навыкі; вызначаць мэту ўжывання дзеясловаў незакончанага і закончанага трывання ў тэкстах рознага тыпу і стылю; свядома карыстацца атрыманымі ведамі і ўменнямі ў вусным і пісьмовым маўленні	
85	Правапіс дзеясловаў з суфіксамі ***-ава-*** (***-ява-***), ***-ыва-*** (***-іва-***), ***-ва-***, ***-оўва-*** (***-ёўва-***)	Спрыяць засваенню вучнямі правапісу суфіксаў ***-ава-*** (***-ява-***), ***-ыва-*** (***-іва-***), ***-ва-***, ***-оўва-*** (***-ёўва-***) у дзеясловах незакончанага трывання, выпрацоўваць адпаведны алгарытм разважання; удасканальваць навыкі вызначэння трывання дзеясловаў, асабовых формаў, выдзяляць канчаткі і суфіксы ў дзеясловах, утвараць трывальныя пары пры дапамозе суфіксаў, прыставак і суфіксаў; правільна ўжываць такія дзеясловы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 62, практ. 463–467 Д/з: § 62, практ. 468
86	Апісанне моўных з'яў, знаходжанне апісання ў тэкстах навуковага стылю	Дапамагчы вучням засвоіць лагічную схему тыпу апісання ў тэкстах навуковага стылю, выпрацоўваць уменне аналізаваць выказванне ў кампазіцыйнай форме апісання, раскрываць тэму і асноўную думку, падрабязна перадаваць сутнасць прадметаў і іх прымет	Тэарэтычны матэрыял на с. 224, практ. 470, 515. Чытанне тэкстаў-апісанняў моўных з'яў, вызначэнне іх стылю і тыпу, тэмы і асноўнай думкі, вызначэнне адрасата і мэтанакіраванасці тэксту, характарыстыка

1	2	3	4
			структуры тэксту, асаблівасці разгортвання думкі; вызначэнне формы трывання і часу, сэнсава-стылістычнай ролі дзеясловаў у тэксце
87	**Кантрольны дыктант**	Выявіць узровень сфарміраванасці арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў вучняў	
88	Часы дзеясловаў. Утварэнне і ўжыванне формаў прошлага часу дзеяслова	Дапамагчы вучням, абапіраючыся на раней вывучанае, асэнсаваць наяўнасць у мове разнастайных формаў дзеясловаў (змяняюцца па ладах, ліках, часах, асобах, родах); асэнсаваць наяўнасць у мове формаў цяперашняга, прошлага і будучага часу дзеясловаў, выразна ўсвядоміць значэнні гэтых часоў, суадносаць паміж рэальным і граматычным часам, пазнаёміць з граматычнай мнагазначнасцю і стылістычным ужываннем формаў, са спосабамі выражэння часавых значэнняў, навучыць выяўляць часавыя значэнні на аснове канкрэтнага зместу тэксту; засвоіць правілы ўтварэння формаў прошлага часу дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання; пашырыць разуменне іх сэнсава-граматычный ролі ў тэксце (паўтор формаў прошлага часу незакончанага трывання дазваляе перадаць падзеі і з'явы, што адбываліся адначасова, а ўжыванне формаў прошлага часу закончанага трывання дае магчымасць расказаць пра падзеі, што адбываліся	§ 63, практ. 474—478, 480—483 Д/з: § 63, практ. 479 або 484

1	2	3	4
		паслядоўна). Выпрацоўваць уменне вызначаць і ўтвараць формы прошлага часу дзеяслова ў адзіночным і множным ліку, пазбягаючы змешвання трывання, асэнсавана ўжываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні пры падрыхтоўцы апісальных і апавядальных выказванняў; замацоўваць неабходныя арфаграфічныя навыкі	
89 90	Цяперашні і будучы час, іх утварэнне і ўжыванне	Паглыбіць веды вучняў пра спецыфіку ўтварэння формаў цяперашняга і будучага часу, практычна пазнаёміць з іх асноўнымі значэннямі і асаблівасцямі ўжывання ў маўленні (напрыклад, значэнне бліжэйшага будучага дзеяння, выражанае формай цяперашняга часу, пастаянства і заканамернасці пэўнага дзеяння, не аднесенага да пэўнага часу; ужыванне цяперашняга часу для «ажыўлення» мінулага, абагульненае значэнне будучага простага часу і інш.). Выпрацоўваць уменне вызначаць і ўтвараць формы цяперашняга часу ад дзеясловаў незакончанага трывання, формы будучага часу ад дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання; тлумачыць, якое значэнне перадаецца пэўнымі формамі ў тэксце, аналізаваць іх будову; паглыбляць і пашыраць разумовыя здольнасці вучняў, узбагачаць іх маўленне свядомым ужываннем формаў таго ці іншага часу дзеясловаў для дасягнення неабходнага выяўленчага эфекту	§ 64, практ. 165–170, 173–175, 182 **Д/з**: § 64, практ. 490 або 492

1	2	3	4
91 92	Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў	Прадоўжыць фарміраванне ў вучняў паняцця пра падзел дзеясловаў у залежнасці ад асабовых канчаткаў на два спражэнні, спрыяць засваенню вучнямі спецыфікі ўтварэння формаў цяперашняга і будучага часу і сістэмы асабовых канчаткаў I і II спражэнняў. Выпрацоўваць уменне вызначаць тып спражэння дзеясловаў, у тым ліку і з ненаціскнымі канчаткамі, правільна ўжываць формы асабовых дзеясловаў у вусным і пісьмовым маўленні, удасканальваць правапіс канчаткаў асабовых дзеясловаў	§ 65, практ. 493—498, 500—504, 506—510 **Д/з:** § 65, практ. 499, 505
93	Рознаспрагальныя дзеясловы	Садзейнічаць засваенню вучнямі асаблівасцей утварэння асабовых формаў дзеясловаў *бегчы*, *есці*, *даць* і іх прыставачных варыянтаў; папярэдзіць магчымыя дыялектныя і прастамоўныя памылкі. Выпрацоўваць уменне ўжываць гэтыя дзеясловы ў вусным і пісьмовым маўленні ў адпаведнасці з літаратурнай нормай; удасканальваць уменне рабіць паведамленне на лінгвістычную тэму	§ 66, практ. 512—514 **Д/з:** § 66, практ. 515
94 95	Патрабаванні да сціслага пераказу. Сціслы пераказ апавядальных тэкстаў	Пазнаёміць вучняў з патрабаваннямі да сціслага пераказу тэксту. Садзейнічаць выпрацоўцы ў вучняў умення сцісла пераказваць зыходны тэкст, захоўваючы стыль, тып і жанр маўлення, логіку і паслядоўнасць падзей, узаемаабумоўленасць тэм і падтэм тэксту, асаблівасці аўтарскага выкладу і яго адносін да зместу; дарэчна ўжываць у пераказе займеннікі	Тэарэтычны матэрыял на с. 266, 267, практ. 517, 518. Фармулёўка задачы сціслага пераказу; праца па асэнсаванні зместу тэксту, загалоўка, яго суадносінасці з тэмай ці асноўнай думкай, вызначэнне стылю, тыпу і жанру маўлення, логікі і паслядоўнасці

1	2	3	4
			выкладу, узаемаабумоўленасці тэм і падтэм, адметнасці аўтарскага выкладу і яго адносін да зместу; вызначэнне моўнага матэрыялу, які можна не выкарыстоўваць пры сціслым пераказе; вусны сціслы пераказ тэксту; узаемаацэнка выказванняў; напісанне пісьмовага варыянту; удасканаленне напісанага пасля праверкі **Д/з**: практ. 511
96	Лады дзеяслова. Абвесны лад, яго значэнне, утварэнне, ужыванне і правапіс	Дапамагчы вучням асэнсаваць граматычнае значэнне ладу дзеяслова, падагульніць і сістэматызаваць веды вучняў пра значэнне, утварэнне і асаблівасці ўжывання дзеясловаў абвеснага ладу; удасканальваць уменні вызначаць дзеясловы абвеснага ладу ў тэксце, даваць ім характарыстыку, правільна ўжываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні	§ 67, практ. 519–521 **Д/з**: § 67, практ. 522

Працяг

1	2	3	4
97	Умоўны лад, яго значэнне, утварэнне, ужыванне і правапіс	Дапамагчы вучням засвоіць асноўныя значэнні дзеясловаў умоўнага ладу (нерэальнае дзеянне як магчымае, пажаданае ці мяркуемае), пазнаёміць з асаблівасцямі ўжывання, утварэння і правапісу формаў, а таксама прапедэўтычна прэзентаваць адпаведныя тыпы простых і складаназалежных сказаў, у якіх ужываюцца дзеясловы ўмоўнага ладу; выпрацоўваць уменні вылучаць дзеясловы ўмоўнага ладу ў маўленні, правільна выпісваць для разбору, канкрэтызаваць значэнне, вызначаць род і лік, правільна ўжываць ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні. Пазнаёміць з парадкам і правіламі поўнага марфалагічнага разбору дзеяслова	§ 68, 70 практ. 523, 524, 541 Д/з: § 68, 70, практ. 525
98	Загадны лад, яго значэнне, утварэнне, ужыванне і правапіс. Спосабы ўтварэння дзеясловаў	Садзейнічаць знаёмству вучняў з асноўнымі формамі загаднага ладу і іх значэннямі, функцыяй у маўленні, асаблівасцямі ўтварэння і правапісу; пазнаёміць з выпадкамі ўжывання формаў загаднага ладу ў паэтычнай мове; выпрацоўваць уменні вылучаць формы загаднага ладу ў тэкстах, называць іх прыватныя адценні значэнняў, спосаб утварэння, асаблівасці ўжывання ў маўленні. Дапамагчы вучням пазнаёміцца з асноўнымі спосабамі ўтварэння дзеясловаў; выпрацоўваць уменні вызначаць вытворныя дзеясловы, спосаб іх утварэння, утваральную аснову ці слова, адрозніваць выпадкі словаўтварэння і формаўтварэння; удасканальваць арфаграфічныя навыкі, вучыць правільна ўжываць вытворныя дзеясловы ў вусным і пісьмовым маўленні	§ 69, практ. 526–533, 535 (на выбар), 539 § 71, практ. 542, 543 Д/з: § 69, 71, практ. 540, 544 (на выбар)

1	2	3	4
99 100	**Кантрольны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту**	Праверыць узровень умення вучняў падрабязна пераказваць змест прапанаванага тэксту па складаным плане, выкарыстоўваць аўтарскую кампазіцыю, лексіку, сінтаксіс, карыстацца словам, улічваючы яго стылістычныя і выяўленчыя магчымасці	
101	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага па раздзеле «Дзеяслоў»	Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў па асноўных пытаннях раздзела, удасканальваць уменні адрозніваць разнастайныя лексіка-семантычныя групы дзеясловаў, выяўляць іх сэнсава-стылістычную ролю ў тэксце, даваць поўную марфалагічную характарыстыку, выкарыстоўваць сінанімічныя, антанімічныя, стылістычныя і экспрэсіўныя магчымасці дзеясловаў ва ўласных вусных і пісьмовых выказваннях	Кантрольныя пытанні і заданні на с. 284, 285
Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год (2 гадзіны)			
102 103	Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год	Актывізаваць і сістэматызаваць веды вучняў па вывучаных раздзелах і тэмах. Садзейнічаць авалоданню вымаўленчымі, лексічнымі, граматычнымі, правапіснымі, стылістычнымі нормамі беларускай мовы. Удасканальваць вуснае і пісьмовае маўленне вучняў	Практ. 546–557
104 105	Рэзервовыя гадзіны		

Беларуская літаратура
5 клас

(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка: Цітова, Л. К. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 5-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / Л. К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009.

Нумар урока і дата правядзення	Тэма ўрока і асноўныя пытанні	Мэты і задачы ўрока	Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дамашняе заданне
1	2	3	4
1	**Уводзіны** Літаратура і жыццё. Тэматычная, змястоўная разнастайнасць фальклорных і літаратурных твораў. Пазнавальнае і выхаваўчае значэнне мастацкай літаратуры (1 гадзіна)	Узнавіць і паглыбіць набытыя вучнямі ў пачатковай школе эмпірычныя веды пра літаратуру як мастацтва слова, пра яе тэматычную і жанравую разнастайнасць, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Прыгадаць вядомыя народныя выслоўі і выказванні выдатных дзеячаў беларускай культуры пра ролю асветы і кнігі ў жыцці чалавека. Пазнаёміць пяцікласнікаў з вучэбным дапаможнікам па беларускай літаратуры (зместам, будовай, афармленнем, прызначэннем)	Артыкул «Дарагія сябры» Д/з. Паразважаць над сэнсам прыказак: «Вучэнне – свет», «Век жыві, век вучыся», «У каго веды, у таго і сіла», «Што ведаеш, насіць лёгка», «Ад навукі спрытнеюць розум і рукі», «На працягу ўсяго века кніга вучыць чалавека», «За аднаго вучонага дзесяць невукаў даюць», «Навука вочы адкрывае» і інш. Падрыхтаваць вуснае выказванне па адной з абраных прыказак

1	2	3	4
I. РОДНАЕ СЛОВА (4 гадзіны) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Мой чароўны беларускі край...»**			
2	Пятрусь Броўка. «Калі ласка» (1 гадзіна)	Выявіць шматграннасць чалавечых пачуццяў і думак, выказаных у вершы: захапленне аўтара меладычнасцю, трапнасцю, выразнасцю роднай мовы, гонар за высокія маральныя якасці беларускага нацыянальнага характару – гасціннасць, добразычлівасць, шчодрасць, спагадлівасць і інш. Вучыць пяцікласнікаў выразна чытаць лірычныя творы (адчуваць настрой, разумець аўтарскія перажыванні, спасцігаць паэтычныя вобразы і сродкі іх стварэння, расстаўляць лагічныя націскі і паўзы, адчуваць адметнасці рытму, мелодыку верша, перадаваць праз чытанне пачуцці аўтара і сваё стаўленне да верша)	Верш П. Броўкі «Калі ласка» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне твора і адказы на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку[1]
3	Вершы Петруся Броўкі «Калі ласка» і Яўгеніі Янішчыц «Мова»: параўнальны аналіз (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на выяўленні аўтарскай пазіцыі ў вершы Я. Янішчыц «Мова». Фарміраваць уменні супастаўляць тэматычна блізкія вершы (па змесце, настраёвасці, аўтарскіх пачуццях, мастацкіх вобразах, будове, інтанацыі і інш.), выказваць уласныя адносіны да твораў, абгрунтоўваць сваю ацэнку. Удасканальваць маўленчыя ўменні пяцікласнікаў	Вершы П. Броўкі «Калі ласка» і Я. Янішчыц «Мова» і метадычны апарат да іх **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша Я. Янішчыц «Мова» і вуснае выказванне на тэму «Чым, на думку паэтаў, з'яўляецца мова для народа?»

[1] Тут і далей пры вызначэнні канкрэтнага дамашняга задання настаўнік (з улікам канцэпцыі канкрэтнага ўрока) адбірае з метадычнага апарату, змешчанага ў вучэбным дапаможніку да кожнага твора, пэўныя пытанні і заданні і паведамляе іх нумары вучням.

1	2	3	4
4	Уладзімір Караткевіч. «Бацькаўшчына» (1 гадзіна)	Развіваць вобразнае ўяўленне вучняў пры ўспрыманні мастацкіх карцін прыроды ў паэтычным творы, выхоўваць уважлівае стаўленне да аўтарскага слова. Удасканальваць уменні школьнікаў узнаўляць карціны і вобразы, створаныя паэтам, вызначаць настрой і танальнасць верша, выяўляць аўтарскія пачуцці і перажыванні, перададзеныя праз адметную форму, вобразы, мастацкія тропы, мелодыку верша. Вучыць пяцікласнікаў успрымаць пейзаж, створаны мастаком, параўноўваць настраёвасць і вобразны лад літаратурнага тэксту і твора жывапісу	Верш «Бацькаўшчына» У. Караткевіча і метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыі карцін Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Зацвіла калужніца» і Эдуарда Рымаровіча «Свежая раніца» **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша, адказаць на пытанні вучэбнага дапаможніка. Разгледзець рэпрадукцыі жывапісных палотнаў (звярнуць увагу на іх сюжэты, кампазіцыю, палітру, аўтарскі настрой), выказаць свае ўражанні ад твораў
5	Анатоль Грачанікаў. «Дрымотна ціснуцца кусты...». Яўген Крупенька. «Ёсць у кожнага з нас...» (1 гадзіна)	Дапамагчы вучням зразумець аўтарскія думкі і пачуцці, іх суаднесенасць з апісаннямі карцін прыроды, спасцігнуць дасканаласць і арыгінальнасць мастацкіх вобразаў, багацце сродкаў мастацкага выяўлення. Фарміраваць эмпірычнае ўяўленне пяцікласнікаў пра мастацкі вобраз (на канкрэтных прыкладах, без знаёмства з дэфініцыяй паняцця)	Вершы А. Грачанікава «Дрымотна ціснуцца кусты...» і Я. Крупенькі «Ёсць у кожнага з нас...», метадычны апарат да іх **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне аднаго з вершаў (на выбар), адказаць на пытанні да твора, выканаць заданні да раздзела «Мой чароўны беларускі край...»

1	2	3	4
6	**Урок развіцця маўлення** Вуснае выказванне на адну з тэм: «Мой родны кут, як ты мне мілы!», «Наша мова — цудоўная, спеўная...», «Бацькаўшчына светлая мая...» (1 гадзіна)	Абудзіць патрыятычныя пачуцці вучняў (любоў да сваёй зямлі, захапленне яе прыродай, гонар за слаўную гісторыю, багатую культуру, векавыя традыцыі нашага народа). Абагульніць і сістэматызаваць веды і ўменні, набытыя пяцікласнікамі пры вывучэнні раздзела падручніка «Мой чароўны беларускі край...». Пазнаёміць вучняў з методыкай падрыхтоўкі вуснага выказвання з элементамі апісання і разважання. Вучыць аналізаваць пейзажныя творы жывапісу, супастаўляць іх з мастацкімі апісаннямі прыроды ў літаратурным творы	Творы, змешчаныя ў раздзеле вучэбнага дапаможніка «Мой чароўны беларускі край...». Рэпрадукцыі карцін Вітольда Бялыніцкага-Бірулі «Зацвіла калужніца» і Эдуарда Рымаровіча «Свежая раніца» Д/з. Падрыхтаваць да выставы ў класе «Мой чароўны беларускі край...» рэпрадукцыі карцін айчынных мастакоў, пейзажы з фотаальбомаў, уласныя малюнкі або фатаграфіі дарагіх сэрцу беларускіх краявідаў
II. ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ (11 гадзін) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «За смугою стагоддзяў»**			
7	Беларускія народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці (1 гадзіна)	Узнавіць, паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра вусную народную творчасць, пра фальклорныя казкі. Пазнаёміць з відамі народных казак (чарадзейнымі, бытавымі, казкамі пра жывёл) і іх жанравымі ўласцівасцямі. Навучыць вызначаць тэматычную дамінанту казкі, разумець асноўны канфлікт, заўважаць адметнасці будовы, своеасаблівую лексіку (багацце трапных выслоўяў, паўторы і інш.). Звярнуць увагу дзяцей на адсутнасць у народных казках мастацкіх апісанняў, псіхалагічных характарыстык герояў, на зададзенасць і статычнасць характараў. Садзейнічаць	Артыкулы вучэбнага дапаможніка «Вусная народная творчасць» і «Народныя казкі» і метадычны апарат да іх Д/з. Перачытаць згаданыя артыкулы, паразважаць над пытаннямі да артыкула «Народныя казкі». Прыгадаць любімыя казкі, падрыхтаваць пераказ адной з іх (на выбар), абгрунтаваць яе

1	2	3	4
		спасціжэнню вучнямі выхаваўчай скіраванасці фальклорных казак	прыналежнасць да пэўнага віду народных казак
8	Чарадзейная казка «Залаты птах» (1 гадзіна)	Прааналізаваць паводзіны казачных персанажаў паводле выяўлення маральных каштоўнасцей (працавітасці, смеласці, настойлівасці ў дасягненні мэты і пераадоленні жыццёвых нягод і выпрабаванняў, дабрыні і спагадлівасці, адданасці і вернасці ў сяброўстве і інш.). Развіваць уменні вучняў разумець сутнасць канфлікту і перадаваць напружанасць дзеяння пры чытанні, узнаўляць паслядоўнасць падзей пры вусным пераказе, выдзяляць эпізоды, важныя для характарыстыкі казачных герояў, аналізаваць адметнасці будовы казкі і выяўляць элементы чарадзейнага ў ёй	Тэкст народнай казкі «Залаты птах» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Перачытаць казку «Залаты птах», скласці яе план, адказаць на пытанні да твора. Намаляваць ілюстрацыю да аднаго з эпізодаў казкі (на выбар), падрыхтаваць каментарый да яе і падрабязны пераказ абранага эпізода
9	Бытавая казка «Разумная дачка» (1 гадзіна)	Удасканальваць уменні вучняў характарызаваць казачных персанажаў. Выпрацоўваць навыкі выразнага чытання казак, пабудаваных на дыялогах (звяртаючы ўвагу на індывідуалізацыю мовы герояў, стоены гумар і сродкі яго выяўлення ў бытавой казцы); вучыць інсцэніраваць фрагмент казкі, аналізуючы манеру герояў гаварыць і трымаць сябе, прадумваючы інтанацыю, жэсты, міміку выканаўцаў	Тэкст казкі «Разумная дачка» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Выразнае чытанне казкі «Разумная дачка» (асаблівую ўвагу звярнуць на дыялогі), прадумаць сцэнарый аднаго з эпізодаў казкі для інсцэніроўкі яго ў класе

1	2	3	4
10	Казкі пра жывёл «Музыкі» і «Воўк і сабака» (1 гадзіна)	Прааналізаваць паводзіны персанажаў казак «Музыкі» і «Воўк і сабака». Абагульніць веды вучняў пра народныя казкі, іх віды і жанравыя адметнасці (сюжэт, канфлікт, характары, будову, спецыфічную лексіку); паглыбіць уяўленне пяцікласнікаў пра мастацкую гіпербалу як сродак характарыстыкі казачных персанажаў	Тэксты беларускай народнай казкі «Музыкі» і рускай народнай казкі «Воўк і сабака», пытанні і заданні да іх **Д/з.** Падрыхтаваць пераказ казкі «Музыкі», выразнае чытанне казкі «Воўк і сабака»
11	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Аналіз народнай казкі, прапанаванай праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка)	
12	Фальклорныя легенды. Легенда «Нарач» (1 гадзіна)	Даць вучням агульнае ўяўленне пра легенду як фальклорны жанр (у пераважнай большасці твораў — наяўнасць элементаў фантастыкі: неверагодныя здарэнні, незвычайныя героі, дзівосныя прыгоды і інш.). Разгледзець легенду «Нарач», звярнуць увагу на выяўленне душэўнай чысціні і прыгажосці Найрыты і Васіля, іх вернасць у каханні, маральную перавагу над панам; прааналізаваць лексіку, адметнасць (лаканізм) мастацкіх сродкаў у абмалёўцы знешнасці герояў, раскрыцці іх характараў. Удасканальваць уменне вучняў расказваць легенды, карыстаючыся адпаведнай лексікай, захоўваючы іх эмацыянальнае гучанне, нетаропкасць (павольнасць) аповеду	Тэкст легенды «Нарач», метадычны апарат да твора. Артыкул «Легенды» **Д/з.** Падрыхтавацца выразна прачытаць легенду «Нарач» і пераказаць яе, карыстаючыся складзеным на ўроку планам. Стварыць вусную замалёўку пра галоўную гераіню твора — сіраціну Найрыту (апісаць яе знешні выгляд, распавесці, чым яна вылучалася сярод аднавяскоўцаў, як яны ставіліся да дзяўчыны, які жыццёвы выбар яна зрабіла, хто вінаваты ў яе трагічным лёсе)

1	2	3	4
13	«Пестунь» (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на мастацкай выразнасці легенды, багацці бытавых і сацыяльных рэалій, спосабах абмалёўкі вобразаў, даступнасці зместу і лаканізме формы. Дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць характары персанажаў, зразумець павучальны змест твора	Тэкст легенды «Пестунь» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Перачытаць легенду, адказаць на пытанні, падрыхтаваць вольны пераказ (як запомнілася)
14	Загадкі (2 гадзіны)	Аднавіць, сістэматызаваць і паглыбіць веды, набытыя вучнямі ў пачатковай школе, пра загадкі. Расказаць пра ўзнікненне загадак, іх першапачатковае прызначэнне; паказаць мастацкія адметнасці і ўласцівасці загадак (дасціпнасць, мудрасць, іншасказальнасць, лаканізм, дасканаласць формы, гумар), прынцыпы іх стварэння. Развіваць у вучняў назіральнасць, увагу, кемлівасць, пачуццё гумару, уменне супастаўляць з'явы і прадметы і бачыць у іх агульнае	Тэарэтычны артыкул «Загадкі», тэксты загадак, пытанні і заданні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку **Д/з.** Перачытаць артыкул «Загадкі», адабраць і запомніць (з ліку прапанаваных у вучэбным дапаможніку) некалькі старажытных і сучасных загадак. Паспрабаваць скласці адну-дзве ўласныя загадкі
15		Удасканальваць уменні вучняў асэнсоўваць, выразна чытаць (загадваць) загадкі і адгадваць іх, звяртаючы ўвагу на арыгінальнасць формы, адметную будову, вобразны лад. Даць уяўленне пра сучасныя літаратурныя загадкі і спосабы іх стварэння, вучыць пяцікласнікаў ствараць уласныя загадкі	Тэксты загадак і заданні да іх **Д/з.** Самастойна адшукаць і прачытаць літаратурныя загадкі, створаныя беларускімі пісьменнікамі (Н. Гілевічам, Р. Барадуліным, Е. Лось, В. Віткам, У. Паўлавым і інш.), і запомніць 2—3 з іх, каб загадаць на ўроку

1	2	3	4
16	Прыказкі (2 гадзіны)	Аднавіць і паглыбіць папярэдне набытыя вучнямі веды пра народныя прыказкі, даць уяўленне пра іх паходжанне і жанравыя асаблівасці (сціслаcць, выразнасць, трапнасць, афарыстычнасць, пераносны сэнс, павучальны змест, мастацкую дасканаласць, тэматычную разнастайнасць)	Тэарэтычны артыкул «Прыказкі», тэксты прыказак, пытанні да іх **Д/з**. Перачытаць артыкул «Прыказкі», тэксты прыказак. Падрыхтаваць паводле адной прыказкі (на выбар) вусную замалёўку
17		Навучыць выразна чытаць і асэнсоўваць прыказкі, разумець іх падтэкст, вызначаць тэматычную дамінанту, рыхтаваць вусныя выказванні з выкарыстаннем прыказак на вызначаную тэму, ствараць уласныя замалёўкі паводле прапанаванай прыказкі	Тэксты прыказак **Д/з**. Перачытаць прыказкі, згрупаваць іх па прапанаваных у вучэбным дапаможніку тэмах, запомніць як мага больш выслоўяў, каб пры нагодзе актыўна імі карыстацца
18	Прыкметы і павер'і (1 гадзіна)	Абагульніць і паглыбіць веды вучняў пра народныя прыкметы і павер'і, іх узнікненне, прызначэнне, асноўныя функцыі (дарадчую, перасцерагальную, забаронную). Дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць афарыстычнасць і трапнасць народных прыкмет і павер'яў, іх скіраванасць на паляпшэнне дабрабыту працоўнага чалавека; паказаць блізкасць прыкмет і павер'яў да загадак і прыказак	Тэарэтычны артыкул «Прыкметы і павер'і», тэкставы матэрыял і метадычны апарат да яго **Д/з**. Засвоіць змест артыкула «Прыкметы і павер'і», перачытаць тэксты прыкмет і павер'яў, запомніць некалькі выслоўяў, якія прадказваюць пэўнае надвор'е

1	2	3	4
19	**Урок развіцця маўлення** Абагульняльны ўрок-конкурс па раздзеле падручніка «За смугою стагоддзяў» (1 гадзіна)	Замацаваць і прывесці ў сістэму набытыя пяцікласнікамі веды пра фальклор і яго жанры. Прыўнесці ў навучальны працэс элементы займальнасці, творчасці, спаборніцтва (прапанаваць вучням расказаць уласную казку на аснове фальклорных сюжэтаў і вобразаў, пераказаць народную казку ці легенду, загадаць некалькі загадак, скласці вусную замалёўку па абранай прыказцы, падрыхтаваць інсцэніроўку асобнага эпізоду казкі і інш.). Наладзіць у класе выставу ілюстраваных зборнікаў казак, легенд, загадак, а таксама вучнёўскіх ілюстрацый да фальклорных твораў	**Д/з**. Адказаць на пытанні і выканаць заданні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку да ўсяго раздзела
III. ЛІТАРАТУРНЫЯ КАЗКІ І ЛЕГЕНДЫ (10 гадзін) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Казка – у жыцці падказка»**			
20	Максім Танк. «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы «Нарач») (1 гадзіна)	Дапамагчы вучням асэнсаваць змест паэтычнага ўвасаблення народнай легенды пра ўзнікненне возера Нарач, спасцігнуць вобразны лад мастацкага твора, яго сюжэт, будову, багацце моўных выяўленчых сродкаў, блізкіх да фальклорных. Паглыбіць веды вучняў пра жанравыя адметнасці легенды, пра адрозненне літаратурнай легенды ад легенды народнай (фальклорнай)	Артыкул «Вусная народная творчасць і мастацкая літаратура». Тэкст урыўка з паэмы М. Танка «Нарач», метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне твора, адказаць на пытанні, намаляваць ілюстрацыю да аднаго з эпізодаў

1	2	3	4
21	Легенды «Нарач» і «Ля вогнішч начлежных» (урывак з паэмы М. Танка «Нарач»). Параўнальны аналіз фальклорнага і літаратурнага твораў (1 гадзіна)	Параўнаць сюжэты народнай і літаратурнай легенды, характары галоўных герояў і спосабы іх паказу (апісанні прыроды, абмалёўка знешняга выгляду герояў, іх душэўнага стану, псіхалагічная матывіроўка паводзін, адносіны аўтара-апавядальніка і інш.). Прааналізаваць спосабы выяўлення аўтарскай пазіцыі ў літаратурнай легендзе М. Танка, вобразныя сродкі мовы	Тэксты народнай легенды «Нарач» і літаратурнай легенды «Ля вогнішч начлежных» (урыўка з паэмы М. Танка «Нарач») **Д/з.** Самастойна прачытаць беларускую народную легенду пра ўтварэнне ракі, возера, горада ці паселішча і ўмець расказаць яе
22	Якуб Колас. «Крыніца» (2 гадзіны)	Пазнаёміць вучняў з алегарычна-філасофскім зместам казкі, разгледзець маральна-этычныя праблемы твора. Удасканальваць аналітычныя ўменні пяцікласнікаў пры разглядзе празаічнага твора, скіраваць увагу на характары маці-гары і дачушкі-крынічкі і спосабы іх раскрыцця (аўтарскі погляд на падзеі жыцця і на саміх герояў, апісанні знешняга выгляду персанажаў, іх стасункаў, паводзін і перакананняў, клопатаў і перажыванняў)	Тэкст літаратурнай казкі Я. Коласа «Крыніца» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Скласці падрабязны план казкі Я. Коласа «Крыніца», падрыхтавацца да выразнага чытання яе ў класе, адказаць на пытанні да твора
23		Дапамагчы вучням спасцігнуць галоўную думку казкі, яе філасофскі падтэкст, алегарычны сэнс, звярнуць увагу на спалучэнне казачнага і рэальнага ў творы, на жанравыя адметнасці літаратурнай казкі. Развіваць уменні пяцікласнікаў дзяліць твор на сэнсавыя часткі і падбіраць да іх назвы, складаць план, рыхтаваць пераказ (з выкарыстаннем адпаведнай казачнай лексікі). Вучыць спасцігаць функцыянальную ролю апісанняў карцін прыроды ў мастацкім творы	Тэкст літаратурнай казкі Я. Коласа «Крыніца» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць падрабязны пераказ казкі, карыстаючыся планам, праілюстраваць адзін з эпізодаў твора (на выбар) і даць каментарый да ўласнай ілюстрацыі

1	2	3	4
24	Уладзімір Караткевіч. «Нямоглы бацька» (2 гадзіны)	Удасканальваць уменні пяцікласнікаў цэласна ўспрымаць сюжэт, вызначаць паслядоўнасць падзей, выяўляць ключавыя эпізоды, важныя для спасціжэння мастацкай ідэі твора і для характарыстыкі герояў; развіваць уменне суадносіць учынкі герояў і матывы іх паводзін, разумець ролю партрэта героя ў празаічным творы	Тэкст казкі У. Караткевіча «Нямоглы бацька» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Выразнае чытанне казкі, адказы на пытанні, вусная характарыстыка аднаго з герояў твора – Пятра або Гната
25		Спрыяць спасціжэнню вучнямі мастацкай ідэі твора, аўтарскай пазіцыі (без ужывання дэфініцый паняццяў), маральнай высновы казкі У. Караткевіча, якая гуманістычнага пафасу. Удасканальваць уменне вучняў характарызаваць герояў паводле іх паводзін і ўчынкаў	Тэкст казкі У. Караткевіча «Нямоглы бацька» **Д/з.** Падрыхтаваць пераказ ключавых эпізодаў казкі, параўнальную характарыстыку вобразаў Пятра і Гната
26	Георгій Марчук. «Чужое багацце» (2 гадзіны)	Звярнуць увагу вучняў на міфалагічную аснову казкі, выявіць непасрэдныя вучнёўскія ўражанні ад твора, асноўную ўвагу засяродзіць на аналізе вобразаў-антыподаў (Ганначка, Іванка, Бусел і Жаўрук – пан Майданскі, Кадук, Пачварнік і Русалка) і спосабах іх абмалёўкі ў творы	Тэкст казкі Г. Марчука «Чужое багацце» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Прачытаць вызначаную настаўнікам частку тэксту, адказаць на пытанні
27		Пашырыць уяўленні пяцікласнікаў пра літаратурную казку, якая падабенства да народнай (наяўнасць казачнай калізіі, чарадзейныя і фантастычныя элементы, падзел герояў на станоўчых і адмоўных, сутыкненне дабра і зла з абавязковай перамогай дабра, адметная будова, зачын і канцоўка, паўторы, спецыфічная казачная лексіка і інш.)	Тэкст казкі Г. Марчука «Чужое багацце» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Дачытаць тэкст казкі, адказаць на пытанні, падрыхтаваць вусную замалёўку пра аднаго з герояў

1	2	3	4
28	Пятро Сіняўскі. «Зачараваная гаспадарка» (1 гадзіна)	Дапамагчы спасцігнуць сюжэт казкі, яе будову, вобразны лад, багацце сродкаў мастацкага выяўлення, надзвычай блізкіх да фальклорных (звярнуць увагу вучняў на расстаноўку казачных герояў — бацькоўскі запавет Гаўрылы сваім сынам Нілу, Глебу і Алесю і спробы кожнага з іх выканаць волю бацькі падчас вандровак па свеце, на спосабы абмалёўкі персанажаў, казачную лексіку — надзвычай шырокае ўжыванне прыказак, трапных выслоўяў і інш.)	Тэкст казкі П. Сіняўскага «Зачараваная гаспадарка» і метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне казкі па ролях, адказы на пытанні да твора
29	Андрэй Федарэнка. «Падслуханая казка» (1 гадзіна)	Акрэсліць адрозненні літаратурнай казкі ад народнай: сюжэт, будова, ярка выяўленая аўтарская пазіцыя, індывідуалізацыя характарыстык персанажаў, наяўнасць мастацкіх апісанняў (прыроды, часу і месца дзеяння, знешнасці герояў), літаратурная мова, адсутнасць паўтораў, гіпербалы, зачыну і канцоўкі і інш.	Тэкст казкі А. Федарэнкі і метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць пераказ сну дзяўчынкі Марыйкі, паразважаць, як гэта мастацкае апісанне характарызуе саму гераіню
30	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка ці вучняў)	
IV. ВЫРАЗНАСЦЬ МАСТАЦКАГА СЛОВА (9 гадзін) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Прыроды вечная краса»**			
31	Максім Багдановіч. «Зімой» (1 гадзіна)	Выклікаць у вучняў пачуццё захаплення прыгажосцю і гармоніяй карцін прыроды, дапамагчы адчуць іх суладнасць з пачуццямі паэта, са станам яго душы (адчуваннем паўнаты і радасці жыцця, бадзёрасцю, усхваляванасцю, захапленнем казачнымі краявідамі і зімовым вечарам). Звярнуць увагу пяцікласнікаў на вобразны і інтанацыйны лад верша, пластычнасць і выразнасць	Верш М. Багдановіча «Зімой» і метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыя карціны Эдуарда Рымаровіча «Раўбічы» **Д/з**. Вывучыць верш на памяць. Разгледзець і прааналізаваць рэпрадукцыю карціны

1	2	3	4
		мовы, мастацкую дасканаласць формы. Удасканальваць уменне вучняў выразна чытаць паэтычныя творы	мастака Э. Рымаровіча «Раўбічы», параўнаць настраёвасць мастацкага палатна і паэтычнага твора
32	Вершы Максіма Багдановіча «Зімой» і Анатоля Грачанікава «Зоры спяваюць»: параўнальны аналіз (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на паэтычнай адухоўленасці прыродных з'яў, тонкасці паэтычнага светаадчування, суладнасці аўтарскіх пачуццяў і карцін прыроды. Выхоўваць эмацыянальную чуйнасць, развіваць вобразнае ўяўленне вучняў, здольнасць «бачыць» карціны прыроды, створаныя паэтам. Паглыбіць уяўленне пяцікласнікаў пра мастацкі вобраз і сродкі яго абмалёўкі ў паэтычным творы, пра спосабы выяўлення аўтарскага пачуцця. Выпрацоўваць уменне супастаўляць пейзажныя вершы розных аўтараў	Вершы М. Багдановіча «Зімой» і А. Грачанікава «Зоры спяваюць» Д/з. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша А. Грачанікава «Зоры спяваюць». Скласці вусную замалёўку пра зімовы вечар (паводле літаратурных апісанняў, рэпрадукцый мастацкіх пейзажаў і ўласных назіранняў)
33	Якуб Колас. «Песня ляснога жаваранка» (урывак з трылогіі «На ростанях»). Эпітэт у мастацкім творы (1 гадзіна)	Дапамагчы дзецям «угледзецца» ў апісанне прыроды на досвітку, «услухацца» ў песню ляснога жаваранка; развіваць творчае ўяўленне вучняў, вучыць бачыць сувязь апісанняў прыроды з настроем і характарам аўтара, адрозніваць нюансы ў выяўленні прыроды. Пашырыць і сістэматызаваць веды пяцікласнікаў пра эпітэт, спрыяць спасціжэнню функцыянальнай ролі эпітэтаў у мастацкім тэксце	Тэкст «Песні ляснога жаваранка» Я. Коласа. Артыкул «Пра эпітэт» Д/з. Падрыхтаваць выразнае чытанне «Песні ляснога жаваранка» Я. Коласа. Перачытаць артыкул «Пра эпітэт», знайсці эпітэты ў творы Я. Коласа і вызначыць іх мастацкую ролю

1	2	3	4
34	Якуб Колас. «На рэчцы» (урывак з паэмы «Новая зямля») (2 гадзіны)	Засяродзіць увагу вучняў на казачна-адухоўленым свеце твора, шматфарбнасці карцін, багацці вобразаў. Развіваць уменні вучняў узнаўляць карціны прыроды, створаныя паэтам з дапамогай вершаванай мовы і мастацкіх тропаў, сачыць за развіццём дзеяння, аналізаваць паводзіны героя, яго эмацыянальны стан, душэўнае ўзрушэнне	Я. Колас. «На рэчцы» (урывак з паэмы «Новая зямля») і метадычны апарат да яго **Д/з**. Выразнае чытанне твора, адказы на пытанні да твора. Падрыхтаваць вусную замалёўку пра *Мароз над усімі маразамі*
35		Садзейнічаць спасціжэнню паўнаты і радасці жыцця праз вобразны і інтанацыйны лад твора, прааналізаваць сродкі мастацкага выяўлення ў творы, удасканальваць навыкі выразнага чытання паэтычных прыродаапісальных тэкстаў. Вучыць пяцікласнікаў складаць цытатны план сюжэтнага вершаванага твора	Я. Колас. «На рэчцы» (урывак з паэмы «Новая зямля») і метадычны апарат да яго **Д/з.** Перачытаць тэкст твора Я. Коласа, вывучыць на памяць урывак (на выбар вучняў ці настаўніка)
36	Пятрусь Броўка. «Кропля». Параўнанне як мастацкі троп (1 гадзіна)	Развіваць рэпрадуктыўнае і творчае ўяўленне вучняў, спрыяць спасціжэнню імі настраёвасці верша П. Броўкі. Узнавіць, паглыбіць і сістэматызаваць веды пяцікласнікаў пра параўнанне і яго ролю ў стварэнні мастацкага вобраза. Пашырыць эмпірычныя ўяўленні вучняў пра мастацкі вобраз і сродкі яго стварэння ў паэтычным тэксце: тропы, вершаваны памер, рытм, рыфма, гукапіс і інш.	Верш П. Броўкі «Кропля» і метадычны апарат да яго. Артыкул «Пра параўнанне» **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша П. Броўкі «Кропля». Перачытаць артыкул «Пра параўнанне», знайсці параўнанні ў тэксце верша і патлумачыць іх ролю ў стварэнні вобразаў

1	2	3	4
37	Уладзімір Караткевіч. «Лісце» (1 гадзіна)	Спрыяць спасціжэнню вучнямі агульнай танальнасці і настраёвасці твора, вучыць заўважаць нюансы ў выяўленні аўтарскіх пачуццяў, развіваць увагу да слова і вобраза ў мастацкім тэксце. Удасканальваць уменні пяцікласнікаў аналізаваць пейзажную карціну жывапісу, супастаўляць жывапісны і літаратурны пейзажы, блізкія па тэме (асноўныя вобразы, перадача аўтарскага настрою сродкамі мастацкага выяўлення ў розных відах мастацтва — жывапісе і літаратуры (паэзіі))	Верш У. Караткевіча «Лісце» і метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыя карціны Уладзіміра Сулкоўскага «Бервянец. Восень» **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша У. Караткевіча «Лісце». Разгледзець рэпрадукцыю карціны У. Сулкоўскага «Бервянец. Восень». Параўнаць жывапісны пейзаж з паэтычнай карцінай восені ў вершы У. Караткевіча
38	Анатоль Грачанікаў. «Верасень» (1 гадзіна)	Выклікаць у вучняў эмацыянальнае ўзрушэнне, дапамагчы адчуць стан душы паэта, засяродзіць увагу на выяўленні лучнасці пачуццяў паэта са станам прыроды. Звярнуць увагу на паэтычнае адухаўленне прыроды ў вершы, на эмацыянальную пранікнёнасць, цеплыню, задушэўнасць выказвання	Тэкст верша А. Грачанікава «Верасень», метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша, намаляваць ілюстрацыю да яго
39	Вершы Уладзіміра Караткевіча «Лісце» і Анатоля Грачанікава «Як ападае ліст...»: параўнальны аналіз (1 гадзіна)	Выхоўваць у вучняў вобразную чуйнасць, творчае ўяўленне, дапамагаць у вызначэнні патрэбнай інтанацыі пры чытанні, абапіраючыся на зрокавыя і слыхавыя ўяўленні. Удасканальваць уменне вучняў аналізаваць лірычныя творы. Вучыць супастаўляць вершы розных аўтараў, блізкія па тэматыцы (звяртаючы ўвагу на танальнасць, аўтарскі настрой, вобразы, моўныя сродкі мастацкай выразнасці і інш.)	Вершы У. Караткевіча «Лісце» і А. Грачанікава «Як ападае ліст...» **Д/з**. Скласці вусную замалёўку на падставе ўласных назіранняў за асенняй прыродай (з апорай на літаратурнае — паэтычнае або празаічнае — апісанне ці твор жывапісу)

1	2	3	4
40	**Урок развіцця маўлення** Вусная замалёўка на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з'явамі (з апорай на літаратурныя пейзажныя творы і карціны жывапісу) (1 гадзіна)	Наладзіць завочную экскурсію ў асеннюю прыроду (з прыцягненнем рэпрадукцый карцін беларускіх мастакоў, краявідаў з фотаальбомаў). Развіваць рэпрадуктыўнае і творчае ўяўленне вучняў, вучыць назіраць за прыроднымі з'явамі, заўважаць у прыродзе падрабязнасці і дэталі, маляваць словамі цэласную карціну, перадаваць свае ўласныя ўражанні. Узбагачаць слоўнікавы запас пяцікласнікаў, удасканальваць уменне карыстацца выяўленчымі сродкамі мовы	Творы, змешчаныя ў раздзеле вучэбнага дапаможніка «Прыроды вечная краса». Рэпрадукцыі пейзажных карцін Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Эдуарда Рымаровіча, Уладзіміра Сулкоўскага і іншых беларускіх мастакоў
V. ЛІТАРАТУРНЫ ТВОР – СКЛАДАНАЕ І НЕПАДЗЕЛЬНАЕ МАСТАЦКАЕ АДЗІНСТВА (22 гадзіны) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Сцежкамі дзяцінства»**			
41	Якуб Колас. «Дарэктар» (урывак з паэмы «Новая зямля») (2 гадзіны)	Звярнуць увагу вучняў на рэальна-жыццёвую аснову твора, на паэтычнае асэнсаванне бытавога, паўсядзённага ў жыцці сялянскіх дзяцей; паглыбіць веды пра спосабы паказу характараў герояў (Яські Базылёва, Алеся, Костуся, Міхала); прааналізаваць сродкі стварэння вобразаў дзяцей у творы; удасканальваць навыкі пяцікласнікаў выразна чытаць сюжэтны паэтычны тэкст	Я. Колас. «Дарэктар» (урывак з паэмы «Новая зямля») і метадычны апарат да твора Д/з. Выразнае чытанне твора і адказ на пытанні. Падрыхтаваць вуснае паведамленне (з цытаваннем тэксту) «Якім уяўляецца мне Яська Базылёў?»

1	2	3	4
42		Дапамагчы пяцікласнікам спасцігнуць аўтарскую пазіцыю (цеплыню, сімпатыю, спачуванне, прыхільнасць, лёгкі гумар) у паказе сялянскіх дзяцей. Фарміраваць у вучняў паняцце пра гумар у мастацкім творы. Удасканальваць уменні малодшых падлеткаў аналізаваць пейзажныя творы жывапісу, супастаўляць іх з паэтычнымі прыродаапісальнымі замалёўкамі	Я. Колас. «Дарэктар» (урывак з паэмы «Новая зямля»). Рэпрадукцыі карцін Уладзіміра Сулкоўскага з серыі палотнаў «Радзіма Якуба Коласа» **Д/з.** Разгледзець рэпрадукцыі карцін «Мікалаеўская камора», «Высокі бераг», «Вапельная гара ў Новым Свержані», падрыхтаваць каментарый да іх
43	Алесь Гарун. «Датрымаў характар». Тэма і мастацкая ідэя літаратурнага твора (2 гадзіны)	Даць эмпірычнае ўяўленне пра жанравую спецыфіку драматычнага твора (звярнуць увагу дзяцей на вонкавыя атрыбуты п'есы: прызначаецца для пастаноўкі на сцэне; дзеянне адбываецца ў дадзены момант, нібы разыгрываецца перад чытачамі; характары дзейных асоб раскрываюцца праз іх рэплікі, дыялогі, маналогі, аўтарскія заўвагі-рэмаркі; падаецца афіша, апісваюцца дэкарацыі)	Тэкст абразка А. Гаруна «Датрымаў характар» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Самастойна перачытаць твор А. Гаруна «Датрымаў характар», прадумаць адказы на пытанні да твора, папрацаваць над выразным чытаннем дыялогаў
44		Паглыбіць і сістэматызаваць веды вучняў пра тэму і мастацкую ідэю літаратурнага твора. Даць уяўленне пра надтэкст у мастацкім творы, пра аўтарскі гумар і сродкі яго выяўлення ў драматычным творы; развіваць уменні пяцікласнікаў выразна чытаць дыялогі і маналогі, аналізаваць і супастаўляць характары герояў. Навучыць рыхтаваць для інсцэніроўкі фрагмент	Тэкст абразка А. Гаруна «Датрымаў характар». Артыкул «Пра тэму і ідэю літаратурнага твора» **Д/з.** Перачытаць артыкул «Пра тэму і ідэю літаратурнага твора», адказаць

1	2	3	4
		п'есы (выбраць эпізод, вызначыць асобныя дыялогі і скампанаваць іх, каб атрымалася кароценькая пастаноўка), прадумаць мізансцэны, касцюмы герояў, іх манеру гаварыць і трымацца на сцэне, падабраць дэкарацыі, асвятленне, музычнае афармленне і інш.	на пытанні да яго. Падрыхтаваць калектыўную інсцэніроўку аднаго з эпізодаў твора
45	Якуб Колас. «У старых дубах» (1 гадзіна)	Удасканальваць уменні вучняў характарызаваць героя па яго ўчынках, паводзінах, думках, перажываннях, параўноўваць характары і паводзіны герояў (Грышкі і Базыля) у межах аднаго твора, рабіць высновы, абгрунтоўваць свае ацэнкі. Дапамагчы вучням зразумець мастацкую ролю апісанняў прыроды ў пачатку і ў канцы апавядання, звярнуць іх увагу на паслядоўнасць разгортвання падзей у творы	Тэкст апавядання Я. Коласа «У старых дубах» і метадычны апарат да яго Д/з. Перачытаць апавяданне Я. Коласа «У старых дубах», адказаць на пытанні да твора, падрыхтаваць вольны пераказ
46	Міхась Лынькоў. «Васількі» (2 гадзіны)	Псіхалагічна падрыхтаваць вучняў да ўспрымання мастацкага твора, дзе гераічнае паўстае ў непарыўнай сувязі з трагічным; арганізаваць першаснае ўспрыманне твора (настаўнік абавязкова сам чытае тэкст цалкам), аналіз пажадана пачаць з кульмінацыі апавядання, пабудаванага спрэс на кантрасных супастаўленнях	Тэкст апавядання М. Лынькова «Васількі» і метадычны апарат да яго Д/з. Перачытаць апавяданне М. Лынькова «Васількі», прадумаць адказы на пытанні да твора
47		Прааналізаваць асноўныя эпізоды, у якіх раскрываецца характар Міколкі, адбываецца яго раптоўнае сталенне: з бесклапотнага вясковага хлопчыка ён ператвараецца ў мужнага змагара. Паказаць, як будова твора ўзмацняе драматызм, напружанасць дзеяння, звярнуць увагу вучняў на ролю мастацкай дэталі ў спасціжэнні ідэйна-мастацкага зместу твора	Тэкст апавядання М. Лынькова «Васількі» і метадычны апарат да яго Д/з. Падрыхтаваць вусны аповед пра Міколку — галоўнага героя твора

1	2	3	4
48	Рыгор Барадулін. «Бацьку» (1 гадзіна)	Пазнаёміць вучняў з жанравымі асаблівасцямі верша-звароту (дакладна названы адрасат, да якога звяртаюцца з эмацыянальнай прамовай); засяродзіць увагу на арганічным спалучэнні ў вершы глыбокага лірызму з патрыятычным пафасам (адпаведная лексіка, рытміка, наяўнасць паўз, клічных сказаў, сказаў з простай мовай); акрэсліць пачуцці, перажытыя аўтарам у дзяцінстве і сталым узросце; прадумаць інтанацыю чытання розных сэнсавых частак верша	Верш Р. Барадуліна «Бацьку» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Вывучыць верш на памяць, падрыхтаваць адказы на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку
49	Вершы Рыгора Барадуліна «Бацьку» і Васіля Зуёнка «Прыйдзі аднойчы...»: параўнальны аналіз (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на спасціжэнні ідэйна-мастацкага зместу верша В. Зуёнка «Прыйдзі аднойчы...», на сродках перадачы пачуццяў паэта (форма маналога-звароту, экспрэсіўнасць выказвання, своеасаблівы рытм, арыгінальная форма, шматлікія вобразы-параўнанні, рэфрэн). Развіваць уменне пяцікласнікаў супастаўляць вершы, блізкія па жанры і тэматыцы, звяртаючы ўвагу на выказаныя пачуцці, настраёвасць, форму, вобразны лад	Вершы Р. Барадуліна «Бацьку» і В. Зуёнка «Прыйдзі аднойчы...» **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша В. Зуёнка «Прыйдзі аднойчы...» і адказы на пытанні да яго. Падзяліцца сваімі ўражаннямі ад вершаў Р. Барадуліна і В. Зуёнка, прадумаць, што яднае гэтыя творы
50	Сяргей Грахоўскі. «Мама» (1 гадзіна)	Прааналізаваць душэўны стан лірычнага героя і спосабы яго выяўлення ў вершы. Пазнаёміць вучняў з жанравымі адметнасцямі лірычнай споведзі (наяўнасць сюжэтных элементаў, шчырасць і даверлівасць інтанацыі, непасрэднасць у перадачы пачуццяў, глыбокі лірызм, задушэўнасць); развіваць уменне выразна чытаць вершы падобнай танальнасці	Верш С. Грахоўскага «Мама» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша С. Грахоўскага. Прадумаць вусную замалёўку-разважанне пра ролю бацькоў у жыцці чалавека (на падставе вывучаных твораў і на прыкладзе сваёй сям'і)

1	2	3	4
51	Анатоль Кудравец. «Цітаўкі». Сюжэт літаратурнага твора (2 гадзіны)	Пазнаёміць вучняў са зместам апавядання, дапамагчы вызначыць ключавыя эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў, асэнсаваць этапы развіцця дзеяння, акрэсліць ланцужок падзей. Назапашваць матэрыял, неабходны для характарыстыкі Кастуся і дзеда Агея (звярнуць увагу вучняў на адносіны старога вартаўніка да хлапчукоў, на стасункі паміж сябрамі, на спосабы абмалёўкі персанажаў, адносіны аўтара да герояў апавядання і інш.). Даць уяўленне пра сюжэт літаратурнага твора	Тэкст апавядання А. Кудраўца «Цітаўкі» і метадычны апарат да яго. Артыкул «Пра сюжэт літаратурнага твора» **Д/з**. Скласці падрабязны план апавядання А. Кудраўца «Цітаўкі», вызначыць асноўныя этапы сюжэта (экспазіцыю, завязку, развіццё дзеяння, кульмінацыю, развязку), падрыхтаваць пераказ ключавых эпізодаў твора
52		Узгадаць асноўныя эпізоды апавядання, падсумаваць назіранні вучняў за паводзінамі герояў, звяртаючы ўвагу на раскрыццё душэўнага стану персанажаў. Удасканальваць уменне вучняў характарызаваць героя паводле яго паводзін і ўчынкаў. Паразважаць над магчымым далейшым лёсам Кастуся	Тэкст апавядання А. Кудраўца «Цітаўкі», метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць вусную характарыстыку аднаго з герояў твора — Кастуся або дзеда Агея
53	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка)	
54	Генрых Далідовіч. «Страта» (3 гадзіны)	Прааналізаваць першую і другую часткі апавядання, высветліць яго рэальна-жыццёвую аснову, пазнаёміць вучняў з галоўнымі героямі твора — Стасем і Міцем Бокуцем, назапашваць матэрыял для аналізу вобраза навічка-пяцікласніка Міці (падрабязнае дэталёвае апісанне яго знешнасці, паводзін на ўроках і дома,	Тэкст апавядання Г. Далідовіча «Страта», метадычны апарат да яго **Д/з**. Перачытаць першую і другую часткі апавядання, падабраць да іх назвы,

1	2	3	4
		размовы бацькоў Стася і вяскоўцаў пра сям'ю Бокуцяў і Міцеву хваробу і інш.)	скласці падрабязны план, падрыхтаваць адказы на пытанні да твора
55		Засяродзіць увагу вучняў на змесце дзвюх наступных (3—4) частак твора, звярнуць увагу на аўтарскае апісанне душэўнага стану Стася, яго хваляванняў, перажыванняў, пакут (рэўнасці, зайздрасці, першаснай непрыязнасці да Міці, усведамлення сваёй «мізэрнасці» ў параўнанні з навічком); прасачыць за эвалюцыяй узаемаадносін хлопчыкаў	Тэкст апавядання Г. Далідовіча «Страта», метадычны апарат да твора **Д/з.** Прачытаць апавяданне да канца, падабраць назвы да 3—6 частак твора. Падрыхтаваць вуснае паведамленне пра сяброўства Стася і Міці
56		Вылучыць эпізоды, важныя для характарыстыкі персанажаў, сачыць за маральным сталеннем Стася, яго высілкамі для самаўдасканалення. Прыгадаць асноўныя этапы сюжэта, прааналізаваць будову твора. Удасканальваць уменне характарызаваць герояў паводле іх паводзін	Тэкст апавядання Г. Далідовіча «Страта» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць вусную параўнальную характарыстыку вобразаў Стася і Міці
57	Хрысціна Лялько. «Касцы» (1 гадзіна)	Развіваць уменні вучняў супастаўляць перажыванні і ўчынкі герояў, аналізаваць іх жыццёвыя пазіцыі, звяртаючы ўвагу на псіхалагічную матывіроўку паводзін. Прааналізаваць, як сродкі моўнай выразнасці дапамагаюць у стварэнні мастацкага вобраза лугу ў творы, адчування Яськам Мамонавым сваёй лучнасці з зямлёй, з прыродай	Тэкст апавядання Х. Лялько «Касцы» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Перачытаць апавяданне, прааналізаваць паводзіны касцоў. Падрыхтаваць вусную параўнальную характарыстыку Яські, Паўла і Вінцуся

1	2	3	4
58	Уладзімір Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі». Літаратурны герой у мастацкім творы (3 гадзіны)	Звярнуць увагу вучняў на рэальна-жыццёвую аснову апавядання, займальнасць сюжэта. Пазнаёміць пяцікласнікаў з падзеямі, адлюстраванымі ў апавяданні У. Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі», і яго героямі. Увесці вучняў у непаўторны свет прыроды, спрыяць спасціжэнню гуманістычнага пафасу твора	Тэкст апавядання У. Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Прыгадаць смешныя здарэнні, што адбыліся з Бурыкам, і падрыхтаваць пераказ аднаго з іх
59		Прааналізаваць ключавыя эпізоды твора, засяродзіць увагу вучняў на ўзаемаадносінах Сяргея і Бурыка. Пашырыць уяўленні вучняў пра свет прыроды, яго непаўторнасць, багацце, шматфарбнасць, выхоўваць любоў і беражлівыя адносіны да сваёй зямлі. Развіваць эмацыянальную чуйнасць вучняў, увагу да слова і вобраза. Удасканальваць уменне сачыць за развіццём дзеяння, вызначаць эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў	Тэкст апавядання У. Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі». Артыкул «Пра літаратурнага героя» і пытанні да яго **Д/з.** Перачытаць артыкул «Пра літаратурнага героя». Падрыхтаваць вусную замалёўку «Сяргей і яго сябар Бурык»
60		Дапамагчы вучням усвядоміць значэнне вобраза Бурыка і гісторыі яго сяброўства з Сяргеем у раскрыцці галоўнай ідэі апавядання. Замацаваць і паглыбіць веды вучняў пра літаратурнага героя і спосабы яго паказу ў празаічным творы (думкі, перажыванні, учынкі, стасункі з другімі героямі, партрэт, пейзаж, інтэр'ер, мова, мастацкая дэталь, адносіны аўтара)	Тэкст апавядання У. Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Падрыхтаваць разгорнутае паведамленне пра першую сустрэчу Сяргея з Бурыкам

1	2	3	4
61	Максім Лужанін. «Добры хлопец Дзік» (3 гадзіны)	Засяродзіць увагу вучняў на рэальна-жыццёвай аснове твора. Прааналізаваць змест раздзелаў «Што ж за ён быў, той хлопец?», «Легенда пра паходжанне», «Як Брэх стаў Дзікам» – пазнаёміць з героямі твора, прааналізаваць жыццёвы ўклад сям'і Гаспадара, ацаніць паводзіны персанажаў. Даць першаснае ўяўленне пра жанравыя адметнасці аповесці	Тэкст раздзелаў «Што ж за ён быў, той хлопец?», «Легенда пра паходжанне», «Як Брэх стаў Дзікам» аповесці М. Лужаніна «Добры хлопец Дзік» і метадычны апарат да твора **Д/з**. Перачытаць вызначаныя раздзелы, падрыхтаваць вусную замалёўку «Як Дзік апынуўся ў сям'і Гаспадара»
62		Прааналізаваць раздзелы «Здарэнне ў завулку», «Сварка з рудым сабачкам», разгледзець стасункі, што склаліся паміж Гаспадаром і Дзікам, прыгадаць, як паводзіў сябе Дзік у розных жыццёвых сітуацыях, як выбіральна ставіўся да розных людзей	Тэкст раздзелаў «Здарэнне ў завулку», «Сварка з рудым сабачкам» **Д/з**. Прачытаць акрэсленыя раздзелы аповесці. Падрыхтаваць падрабязны пераказ аднаго з эпізодаў твора (на выбар)
63		Прааналізаваць раздзелы аповесці «Дзік і кот Хама», «Дзік адбірае аладку. Дзік гаворыць па тэлефоне», «Развітальнае слова». Высветліць уражанні вучняў ад твора, пракаменціраваць, як складваліся ў Дзіка адносіны з дзецьмі і дарослымі. Засяродзіць увагу вучняў на гуманістычным гучанні твора, асобе аўтара	Тэкст раздзелаў «Дзік і кот Хама», «Дзік адбірае аладку. Дзік гаворыць па тэлефоне», «Развітальнае слова» **Д/з**. Дачытаць тэкст аповесці, падрыхтаваць вусную замалёўку пра Дзіка (падмацаваць адказ фрагментамі з тэксту), выказаць свае адносіны да яго

1	2	3	4
64	**Урок развіцця маўлення** Разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя (па адным з папярэдне вывучаных твораў) (1 гадзіна)	Падагуліць веды вучняў пра літаратурнага героя і спосабы яго абмалёўкі ў мастацкім творы. Высветліць адносіны вучняў да абранага літаратурнага персанажа, іх уменні вылучаць галоўнае ў яго паводзінах, даваць ацэнку герою ў адпаведнасці з яго ўчынкамі і перажываннямі, рыхтаваць разгорнуты адказ на пастаўленае пытанне. Прыкладныя пытанні: «Заўчаснае сталенне Міколкі» (М. Лынькоў. «Васількі»); «Дружба Сяргея з Бурыкам» (У. Караткевіч. «Былі ў мяне мядзведзі»); «Дзік — надзейны сябар» (М. Лужанін. «Добры хлопец Дзік»)	Тэкст абранага мастацкага твора **Д/з**. Падрыхтаваць вусную замалёўку «Мой дамашні сябар» (пра хатнюю жывёліну)
65	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка)	
	VI. ПРЫГОДЫ І ПАДАРОЖЖЫ (5 гадзін)		
66	Міхась Лынькоў. «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (4 гадзіны)	Зацікавіць пяцікласнікаў прыгодніцкай аповесцю М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Прааналізаваць раздзелы «Пра Мішкава дзяцінства і аб тым, як ён маліцу любіў», «Пра Вясёлую Бараду і пра чорнага Жука». Звярнуць увагу вучняў на займальнасць дзеяння ў творы, на пейзажныя апісанні, аўтарскую характарыстыку герояў	Тэкст аповесці М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» і пытанні і заданні да згаданых раздзелаў **Д/з**. Перачытаць вызначаныя настаўнікам раздзелы аповесці, падрыхтаваць сціслае вуснае паведамленне пра Мішкава дзяцінства, яго гульні і забаўкі

1	2	3	4
67		Засяродзіць увагу вучняў на разглядзе раздзелаў «Як Мішка трапіў на вайсковую службу», «Дзіўны хворы». Удасканальваць навыкі вучняў выразна чытаць і пераказваць празаічны тэкст займальнага зместу, вучыць перадаваць пры чытанні стоены аўтарскі гумар, аўтарскую сімпатыю, добразычлівае стаўленне да герояў	Тэкст аповесці М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» і пытанні і заданні да згаданых раздзелаў **Д/з.** Перачытаць вызначаныя раздзелы, адказаць на пытанні, вывучыць на памяць урывак тэксту, вызначаны настаўнікам
68		Прааналізаваць вучнёўскае чытанне на памяць урыўка прозы. Арганізаваць разгляд наступных раздзелаў («Як Мішку скралі і што з таго выйшла», «Мішка-герой»). Абмеркаваць фінал аповесці, прапанаваць вучням акрэсліць далейшыя лёсы герояў. Разгледзець жанравыя адметнасці прыгодніцкай аповесці-казкі	Тэкст аповесці М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» **Д/з.** Дачытаць аповесць, адказаць на пытанні да ўсяго твора. Паразважаць, якія жыццёвыя пуцявіны можна выбраць для герояў пасля заканчэння вайны
69		Абагульніць уражанні вучняў ад усёй аповесці, прыгадаць камічныя сітуацыі і эпізоды, што лепш запомніліся, і пераказаць іх, падсумаваць назіранні за героямі твора, акрэсліць магчымы далейшы лёс кожнага з герояў	Тэкст аповесці М. Лынькова «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» **Д/з.** Падрыхтаваць замалёўку «Жыццё Мішкі (Барадатага, Жука) пасля вайны» (на выбар)

Заканчэнне

1	2	3	4
70	**Абагульняльны ўрок** (1 гадзіна)	Падвесці вынікі навучальнага года, высветліць уражанні вучняў ад курса літаратуры, акрэсліць будучыя перспектывы, даць парады для чытання ўлетку. Настаўнік выбірае форму правядзення ўрока (найлепш займальную — конкурс, КВЗ і інш.). Варта загадзя настроіць вучняў на чаканне свята і яго падрыхтоўку	

Беларуская літаратура
6 клас

(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень)

Размеркаванне вучэбнага матэрыялу прыводзіцца ў адпаведнасці са зместам і структурай вучэбнага дапаможніка: Бельскі, А. І. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Нумар урока і дата правядзення	Тэма ўрока, колькасць гадзін	Мэты і задачы ўрока	Матэрыял вучэбнага дапаможніка, дамашняе заданне
1	2	3	4
1	**Уводзіны** Кніга адкрывае свет (1 гадзіна)	Акрэсліць (з дапамогай вучняў) ролю літаратуры ў жыцці чалавека, значэнне кнігі — мудрага спадарожніка і дарадцы. Прыгадаць важнейшыя прыёмы і сродкі мастацкага адлюстравання ў літаратуры (аднавіць веды вучняў, набытыя ў 5 класе). Пазнаёміць шасцікласнікаў з вучэбным дапаможнікам (зместам, структурай, афармленнем, прызначэннем), прачытаць і абмеркаваць уступны артыкул «Кніга адкрывае свет»	Артыкул «Кніга адкрывае свет» **Д/з**. Паразважаць над сэнсам народных выслоўяў «Кніга — маленькае акенца, а праз яго ўвесь свет відаць», «Чалавек без кнігі — бяскрылая птушка», «Хто шмат чытае, той многа знае», «Дзе розумам не дайду, дык у кніжцы знайду» і інш. Падрыхтаваць вусную замалёўку пра ролю кнігі ў жыцці чалавека

1	2	3	4
I. МОЙ РОД. РОДНАЯ ЗЯМЛЯ. НАРОД (5 гадзін)			
2	Уладзімір Ліпскі. «Ад роду — да народу» (з кнігі «Я») (1 гадзіна)	Абудзіць у вучняў усведамленне таго, што чалавек — выключная, непаўторная асоба, якая наследуе якасці, рысы, прыкметы сваіх бацькоў і дзядоў, свайго роду, і кожны абавязаны ведаць і шанаваць сваіх продкаў. Дапамагчы падлеткам зразумець, што чалавек — маленькая часцінка свету — належыць да свайго народа і павінен годна яго прадстаўляць, ведаць сваю гісторыю і ганарыцца ёю, любіць і берагчы родную зямлю. Навучыць шасцікласнікаў складаць радаводнае дрэва	Тэкст твора У. Ліпскага «Ад роду — да народу» (з кнігі «Я») і метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыя фрагмента роспісу Эдуарда Рымаровіча «Дзяцінства» **Д/з.** Перачытаць твор, адказаць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку[1]. Паспрабаваць скласці радаводнае дрэва сваёй сям'і
3	Алесь Пісьмянкоў. «Продкі». Еўдакія Лось. «Продкі» (1 гадзіна)	Данесці да вучняў патрыятычны пафас вершаў; дапамагчы ўсвядоміць неабходнасць шанавання свайго роду, сваякоў, захавання іх памяці і традыцый. Выпрацоўваць уменні падлеткаў выразна чытаць і аналізаваць паэтычныя творы, супастаўляць творы, блізкія па жанры і тэматыцы. Вучыць аналізаваць творы жывапісу, супастаўляць палотны розных мастакоў, блізкія па тэматыцы	Вершы А. Пісьмянкова «Продкі» і Е. Лось «Продкі» і метадычны апарат да іх. Рэпрадукцыя карціны Эдуарда Белагурава «Партрэт бацькоў» **Д/з.** Выразнае чытанне вершаў, адказ на пытанні да іх. Верш А. Пісьмянкова вывучыць на памяць

[1] Тут і далей пры вызначэнні канкрэтнага дамашняга задання настаўнік (з улікам канцэпцыі канкрэтнага ўрока) адбірае з метадычнага апарату, змешчанага ў вучэбным дапаможніку да кожнага твора, пэўныя пытанні і заданні і паведамляе іх нумары вучням.

Працяг

1	2	3	4
4	Пятрусь Броўка. «Зямля Беларусі» (урывак з паэмы «Беларусь») (1 гадзіна)	Абудзіць патрыятычныя пачуцці вучняў (любоў да сваёй зямлі, захапленне яе прыгажосцю, гонар за слаўную гісторыю Бацькаўшчыны, шматвекавыя традыцыі, культуру свайго народа). Прааналізаваць вобразна-выяўленчыя сродкі мовы твора. Развіваць творчае ўяўленне вучняў пры ўспрыманні карцін прыроды, створаных паэтам, удасканальваць іх уменні вызначаць настраёвасць, танальнасць, пафас твора, спасцігаць аўтарскую пазіцыю (без ужывання дэфініцыі паняцця)	Тэкст урыўка з паэмы П. Броўкі «Беларусь» і метадычны апарат да твора. Рэпрадукцыя карціны Віктара Грамыкі «Ільны беларускія» **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне твора П. Броўкі. Прачытаць і прааналізаваць вершы Ю. Свіркі «Верны крэўнаму брацтву», Л. Якубовіча «О, Беларусь! Старонка дарагая...», Л. Тарасюк «Імя Айчыны»
5	Уладзімір Караткевіч. «Лебядзіны скіт» (2 гадзіны)	Дапамагчы вучням пераадолець моўныя цяжкасці пры чытанні твора, зарыентавацца ў змесце казкі-легенды, асноўную ўвагу засяродзіць на абмалёўцы двух вобразаў-антыподаў — паэта Юсуфі і хана Бату (знешні выгляд хана апісваецца падрабязна, з наглядньмі дэталямі-вобразамі, а паэта — вельмі лаканічна); звярнуць увагу на паводзіны герояў, іх размовы-спрэчкі паміж сабой, на манеру кожнага з іх выказвацца, трымацца на людзях, на іх разважанні, жыццёвую філасофію. Паказаць ролю вобраза старца ў раскрыцці мастацкай ідэі твора	Тэкст казкі У. Караткевіча «Лебядзіны скіт» і метадычны апарат да твора **Д/з**. Перачытаць казку «Лебядзіны скіт» У. Караткевіча (асаблівую ўвагу звярнуць на выразнае чытанне дыялогаў). Падрыхтаваць вуснае паведамленне пра хана Бату (звярнуць увагу на паводзіны, размовы са старцам і паэтам Юсуфі, на разважанні і мерavailable каванні Бату, на аўтарскую партрэтную характарыстыку)

1	2	3	4
6		Ахарактарызаваць старога дэрвіша (у якім увасобіліся лепшыя чалавечыя якасці — адданасць свайму народу, гатоўнасць ахвяраваць сваім жыццём дзеля выратавання іншых, нянавісць да ворагаў, душэўная прыгажосць і высакароднасць); спрыяць спасціжэнню высокага патрыятычнага гучання твора, яго паэтычнай рамантыкі, узнёсласці, вобразнасці. Дапамагчы вучням зразумець аўтарскую пазіцыю ў творы	Тэкст казкі У. Караткевіча «Лебядзіны скіт» і метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць вусны аповед пра старога дэрвіша і яго самаахвярны подзвіг — сведчанне маральнай перамогі над ханам
7	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка)	
II. ФАЛЬКЛОР І ЛІТАРАТУРА (12 гадзін) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Свет загадак і цудаў» (7 гадзін)**			
8	Узнікненне вобразнага, мастацкага слова. Міфы пра багоў (1 гадзіна)	Распавесці пра светаўспрыманне нашых продкаў, іх паэтычнае асэнсаванне жыцця, уяўленні пра прыроду і месца ў ёй чалавека; пазнаёміць вучняў з найбольш значнымі славянскімі язычніцкімі багамі, іх функцыянальнай роляй у прыродзе. Развіваць рэпрадуктыўнае і творчае ўяўленне шасцікласнікаў, удасканальваць іх уменне «маляваць» словамі (звярнуць увагу на апісанне знешняга выгляду багоў, іх характараў і звычак, заняткаў, паводзін, учынкаў і г. д.)	Артыкулы «Міфы», «Пра багоў» **Д/з**. Прачытаць артыкулы «Міфы» і «Пра багоў», адказаць на пытанні вучэбнага дапаможніка. Скласці вусную замалёўку пра аднаго з міфалагічных багоў (на выбар)

1	2	3	4
9	Міфы пра духаў (1 гадзіна)	Пазнаёміць шасцікласнікаў з вобразамі міфічных істот (духаў), іх звычаямі, схільнасцямі, характарамі; вучыць аналізаваць паводзіны і ўчынкі духаў, параўноўваць іх паводле стаўлення да чалавека. Развіваць вобразнае ўспрыманне, эмацыянальную чуйнасць, творчае ўяўленне вучняў, дапамагчы адчуць незвычайную фантазію нашых далёкіх продкаў, іх назіральнасць, уражлівасць, паэтычнае ўспрыманне свету	Артыкул «Пра міфічных істот (духаў)». Рэпрадукцыя ілюстрацыі Валерыя Славука «Волат» **Д/з.** Перачытаць артыкул «Пра міфічных істот (духаў)». Разгледзець рэпрадукцыю ілюстрацыі Валерыя Славука «Волат». Падрыхтаваць вусную замалёўку пра аднаго з міфалагічных духаў
10	Янка Купала. «Як у казцы...» (1 гадзіна)	Паглыбіць уяўленні вучняў пра светапогляд нашых прашчураў, іх характары, звычкі, традыцыі, распавесці пра паступовую эвалюцыю светаўспрымання і веры беларусаў, пракаменціраваць стаўленне аўтара да гэтых змен. Дапамагчы ўспрыняць мастацкую адметнасць твора (адсутнасць выразнага дзеяння, адкрытае выяўленне аўтарскай пазіцыі)	Тэкст твора Я. Купалы «Як у казцы...» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Перачытаць твор Я. Купалы «Як у казцы...», адказаць на пытанні да твора. Паразважаць над пытаннем: «Чаму нашы продкі прынялі *да сваіх багоў і новага Бога?*»
11	Ян Баршчэўскі. «Вужыная карона» (1 гадзіна)	Звярнуць увагу вучняў на міфалагічную аснову апавядання. Садзейнічаць спасціжэнню вучнямі галоўнай думкі твора, асэнсаванню спрадвечных маральных высноў жыцця, разуменню сапраўдных матываў паводзін панскага лоўчага. Звярнуць увагу шасцікласнікаў на падабенства і адрозненне міфалагічных	Тэкст фантастычнага апавядання Я. Баршчэўскага «Вужыная карона» і метадычны апарат да яго

1	2	3	4
		і літаратурных вобразаў; удасканальваць уменні вучняў вызначаць у творы сэнсавыя часткі, складаць план, пераказваць тэкст	**Д/з.** Прыгадаць фальклорную легенду пра Вужынага Караля. Перачытаць твор Я. Баршчэўскага «Вужыная карона», адказаць на пытанні, скласці план і падрыхтаваць сціслы пераказ апавядання
12	Максім Багдановіч. «Вадзянік» (1 гадзіна)	Пашырыць уяўленні вучняў пра вобразы міфалагічных істот і іх увасабленне ў літаратурных творах. Удасканальваць уменне шасцікласнікаў выразна чытаць вершы, суадносячы ўласную інтанацыю з агульным пафасам твора. Дапамагчы выявіць функцыянальную ролю тропаў, гукапісу ў перадачы пачуццяў аўтара і стварэнні вобраза вадзяніка. Вучыць супастаўляць вобразы міфалагічных і літаратурных герояў (што агульнае, чым розняцца іх выгляд, заняткі, характары, паводзіны)	Верш М. Багдановіча «Вадзянік» і метадычны апарат да яго. Тэкст легенды «Дамавік ездзіць на конях» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша. Параўнаць вобраз Вадзяніка, створаны паэтам М. Багдановічам, з міфалагічным вобразам вадзяніка. Падрыхтаваць вусную замалёўку пра дамавіка (з апорай на фальклорную легенду «Дамавік ездзіць на конях»)

1	2	3	4
13	Якуб Колас. «Жывая вада» (1 гадзіна)	Садзейнічаць спасціжэнню вучнямі мастацкай ідэі твора, яго філасофскага падтэксту. Абагульніць і паглыбіць веды шасцікласнікаў пра жанравыя адметнасці алегарычнай літаратурнай казкі (на матэрыяле казак «Жывая вада» і «Крыніца», якія вывучаліся ў пятым класе) — спалучэнне казачнага і рэальнага, алегарычны сэнс, філасофскі падтэкст, незвычайныя героі, элегічнасць аповеду, лірызм, афарыстычнасць мовы, спецыфіка выяўлення аўтарскай пазіцыі	Тэкст алегарычнай казкі Я. Коласа «Жывая вада» і метадычны апарат да твора Д/з. Перачытаць казку Я. Коласа «Жывая вада», адказаць на пытанні, падабраць назвы да кожнай часткі, скласці план і падрыхтаваць падрабязны пераказ твора (асобую ўвагу звярнуць на аўтарскую характарыстыку вобразаў, арыгінальную мову)
14	Казімір Камейша. «Камень ля вёскі Камень» (1 гадзіна)	Пазнаёміць вучняў з арыгінальнай трактоўкай міфалагічнага сюжэта ў паэтычнай легендзе К. Камейшы, прааналізаваць вобразны лад твора. Паглыбіць веды вучняў пра міфалагічныя сюжэты і вобразы, спецыфіку іх узнаўлення ў мастацкіх тэкстах. Развіваць творчае ўяўленне падлеткаў, удасканальваць іх аналітычныя і маўленчыя ўменні (выразна чытаць і расказваць легенды, карыстаючыся адпаведнай лексікай і захоўваючы вобразны лад і эмацыянальную афарбоўку твораў)	Верш К. Камейшы «Камень ля вёскі Камень», метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыя карціны Эдуарда Рымаровіча «Камяні» Д/з. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша К. Камейшы і адказы на пытанні да твора. Самастойна прачытаць легенду «Палешукі і палевікі»

1	2	3	4
15	**Урок развіцця маўлення** «Мой свет загадак і цудаў» (1 гадзіна)	Абагульніць і сістэматызаваць веды вучняў, набытыя пры вывучэнні раздзела вучэбнага дапаможніка «Свет загадак і цудаў». Пазнаёміць шасцікласнікаў з рэпрадукцыямі карцін на міфалагічныя сюжэты, дапамагчы асэнсаваць прапанаваныя творы жывапісу	**Д/з.** Падрыхтаваць вусную замалёўку пра міфалагічнага бога або духа (з апорай на літаратурныя і жывапісныя творы) або расказаць легенду пра паходжанне назвы сваёй мясцовасці (горада, вёскі, паселішча, рэчкі), прачытаную самастойна ці пачутую ад сваякоў і знаёмых
Раздзел вучэбнага дапаможніка «Сэрцам народжаны спеў» (5 гадзін)			
16	Народныя песні. Каляндарна-абрадавыя песні «Прыехала Каляда на белым кані...», «Вы, калядачкі, бліны-ладачкі...» (1 гадзіна)	Узнавіць і сістэматызаваць веды вучняў пра фальклор і яго жанры. Расказаць пра ўзнікненне народных песень, іх ролю і месца ў жыцці чалавека, даць уяўленне пра тэматычную разнастайнасць, жанравае багацце і мастацкія вартасці народных песень. Пазнаёміць вучняў з беларускімі народнымі калряднымі песнямі, дапамагчы зразумець іх месца ў кантэксце пэўнага свята	Артыкул «Народная песня», тэксты каляндарна-абрадавых калядных песень і метадычны апарат да твораў. Рэпрадукцыя карціны Эдуарда Рымаровіча «Каляды» Д/з. Перачытаць артыкул «Народная песня» і тэксты саміх песень. Расказаць пра традыцыю святкавання Калядаў

1	2	3	4
17	Каляндарна-абрадавыя песні «Благаславі, маці, вясну заклікаці...», «А на Купалу рана сонца іграла...», «Добра жаць — шырокая ніўка...» (1 гадзіна)	Пазнаёміць вучняў з беларускай народнай каляндарна-абрадавай паэзіяй, дапамагчы зразумець яе месца ў кантэксце пэўнага земляробчага абраду ці свята, садзейнічаць спасціжэнню тэматычнай і настраёвай разнастайнасці народных песень, іх вобразнасці і выразнасці, глыбокага лірызму, меладычнасці	Тэксты каляндарна-абрадавых песень і метадычны апарат да іх. Рэпрадукцыя карціны Віктара Барабанцава «На Купалле» **Д/з**. Распавесці, карыстаючыся літаратурай (па рэкамендацыі настаўніка), пра народны каляндарны абрад, свята (Гуканне вясны, Сёмуху, Купалле і інш.)
18	Народныя песні «Каля месяца, каля яснага...», «Рэчанька» (1 гадзіна)	Раскрыць сувязь сямейна-абрадавай паэзіі з асноўнымі этапамі жыццёвага шляху чалавека — нараджэннем, шлюбам, смерцю, з яго побытам і працоўнай дзейнасцю, паказаць прызначэнне песень: паўплываць на лёс чалавека, яго здароўе і дабрабыт, абараніць ад злога і шкоднага, спрыяць шчасліваму жыццю. Паглыбіць уяўленні вучняў пра асноўны мастацкі прыём абрадавых песень — паэтычную ідэалізацыю, пра неад'емныя элементы абрадавай паэзіі — велічанне і заклінанне. Расказаць шасцікласнікам пра адметнасці лірычных песень, скіраваць увагу на лексічнае і інтанацыйнае багацце народных песень, іх музычнае афармленне	Тэксты народных песень «Каля месяца, каля яснага...», «Рэчанька» і метадычны апарат да твораў **Д/з**. Перачытаць тэксты песень, адказаць на пытанні. Падрыхтаваць замалёўку пра святкаванне беларускага вяселля, падабраць тэксты вясельных песень ці іх фоназапісы (у выкананні ансамбля «Песняры», гуртоў «Троіца», «Палац», «Ліцвіны» і інш.), каб праслухаць на ўроку

1	2	3	4
19	Літаратурная песня. Алесь Ставер. «Жураўлі на Палессе ляцяць» (1 гадзіна)	Даць пачатковае ўяўленне пра літаратурную песню, пра адметнасці літаратурных (аўтарскіх) песень. Выклікаць у вучняў эмацыянальны водгук на адну з песенных візітак Беларусі, створаную на верш А. Ставера. Абудзіць у падлеткаў патрыятычныя пачуцці, прааналізаваць аўтарскія перажыванні, выказаныя ў вершы, вучыць за словам бачыць мастацкі вобраз, спасцігаць аўтарскі настрой, адчуваць інтанацыю, разумець функцыянальную ролю тропаў у мастацкім тэксце	Артыкул «Літаратурная песня». Верш А. Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць» і метадычны апарат да яго Д/з. Прачытаць артыкул «Літаратурная песня». Вывучыць верш А. Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць» на памяць
20	Генадзь Бураўкін. «Малітва». Алесь Бачыла. «Радзіма мая дарагая...» (1 гадзіна)	Данесці да вучняў шчырасць і вышыню чалавечых помыслаў у вершы Г. Бураўкіна, выразную грамадзянскую пазіцыю аўтара. Дапамагчы спасцігнуць думкі і пачуцці, выказаныя ў вершы-споведзі А. Бачылы «Радзіма мая дарагая...»: любоў і пяшчоту да сваёй зямлі, захапленне яе прыгажосцю, пажаданне ёй росквіту і шчасця. Пазнаёміць вучняў з музычным афармленнем вершаў, выклікаць эмацыянальны водгук, лірычнае ўзрушэнне	Тэксты вершаў Г. Бураўкіна «Малітва», А. Бачылы «Радзіма мая дарагая...», метадычны апарат да іх Д/з. Выразнае чытанне вершаў, вусны аналіз аднаго з іх (на выбар). Прыгадаць вядомыя песні на словы беларускіх паэтаў, падрыхтаваць іх выкананне або праслухоўванне фаназапісаў на ўроку

1	2	3	4
III. БІБЛІЯ (4 гадзіны) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Біблія – вечная і дзівосная кніга»**			
21	Біблія. Біблейскае паданне «Стварэнне свету» (1 гадзіна)	Даць агульнае ўяўленне пра Біблію – найвыдатнейшы старажытны помнік сусветнай культуры (з выкарыстаннем ілюстрацый Г. Дарэ, рэпрадукцый твораў беларускага іканапісу, карцін на біблейскія сюжэты Мікеланджэла, Рэмбранта, Рафаэля, А. Іванова, І. Крамскога і інш.). Пазнаёміць вучняў з некаторымі біблейскімі сюжэтамі са Старога Запавету (кніга «Дзіцячая Біблія»), прааналізаваць іх змест	Артыкул «Біблія – вечная і дзівосная кніга», тэкст біблейскага падання «Стварэнне свету» і метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыя беларускага абраза «Узнясенне» (мастак Сілініч) **Д/з.** Перачытаць артыкул «Біблія – вечная і дзівосная кніга» і біблейскае паданне «Стварэнне свету», адказаць на пытанні да твора
22	Біблейскае паданне «Прытча пра блуднага сына» (1 гадзіна)	Прааналізаваць змест і вобразы біблейскага падання «Прытча пра блуднага сына»; звярнуць увагу на маральную ацэнку паводзін герояў біблейскага сюжэта, на спрадвечныя маральныя каштоўнасці, прынятыя ў чалавечым грамадстве са старажытных часоў; дапамагчы вучням усвядоміць выхаваўчую ролю біблейскіх сюжэтаў і іх персанажаў	Біблейскія паданні «Прытча пра блуднага сына», «Ной будуе каўчэг. Патоп», метадычны апарат да твораў **Д/з.** Перачытаць біблейскае паданне «Прытча пра блуднага сына», падрыхтаваць яго пераказ. Самастойна прачытаць паданне «Ной будуе каўчэг. Патоп», адказаць на пытанні да твора

1	2	3	4
23	Францыск Скарына. «Біблія» (урывак з прадмовы ў паэтычным узнаўленні Алеся Разанава) (1 гадзіна)	Пашырыць веды вучняў пра Ф. Скарыну — беларускага першадрукара Біблії, асветніка і вучонага; дапамагчы ім спасцігнуць глыбіню выказаных думак, мастацкую вартасць вобразаў, яркасць і арыгінальнасць тропаў, адметнасць формы, своеасаблівасць мелодыкі верша	Ф. Скарына. «Біблія» (урывак з прадмовы ў паэтычным узнаўленні А. Разанава) і метадычны апарат да твора **Д/з.** Самастойна прачытаць і прааналізаваць вершы Я. Коласа «Не дай Божа сэрцам знікнуць...» і М. Танка «Божа мой шчодрасці...»
24	Біблейскія вобразы ў батлейцы. «Цар Ірад» (1 гадзіна)	Даць звесткі пра беларускі народны лялечны тэатр — батлейку, пазнаёміць вучняў з персанажамі і асноўнымі кампанентамі батлейкі; засяродзіць увагу на біблейскай аснове п'есы «Цар Ірад», адвольнай інтэрпрэтацыі біблейскага вобраза цара Ірада, яго статычнай абмалёўцы. Пашырыць веды вучняў пра жанравыя адметнасці п'есы, звярнуць увагу на спосабы абмалёўкі герояў; зацікавіць дзяцей батлейкай	Артыкул «Біблейскія вобразы ў батлейцы», тэкст урыўка з п'есы «Цар Ірад» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Перачытаць артыкул «Біблейскія вобразы ў батлейцы», падрыхтаваць выразнае чытанне біблейскай п'есы «Цар Ірад», адказаць на пытанні да твора
IV. МАСТАЦКАЕ СЛОВА: ВОБРАЗНАСЦЬ, ВЫРАЗНАСЦЬ, ХАРАСТВО (8 гадзін) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Каляндар прыроды»**			
25	Змітрок Бядуля. «Зямля». Метафара ў літаратурным творы (1 гадзіна)	Данесці да шасцікласнікаў патрыятычны пафас лірычнай мініяцюры З. Бядулі, абагульніць іх уяўленні пра родную зямлю. Вучыць «узірацца» і «ўслухоўвацца» ў мастацкі тэкст, развіваць вобразнае ўяўленне, творчыя здольнасці вучняў. Узнавіць веды вучняў пра мастацкія тропы — эпітэт і параўнанне,	Тэкст лірычнай мініяцюры З. Бядулі і пытанні да твора. Артыкул «Пра метафару». Рэпрадукцыя карціны Уладзіміра Масленікава «Зямля дзядоў» **Д/з.** Перачытаць артыкул

1	2	3	4
		растлумачыць на канкрэтных прыкладах сутнасць больш складанага паняцця – метафары, паказаць яе ролю ў стварэнні мастацкага вобраза. Пазнаёміць з рэпрадукцыямі карцін вядомых беларускіх мастакоў (альбом «Мая зямля» і інш.), краявідамі з фотаальбомаў. Удасканальваць уменне вучняў параўноўваць літаратурныя тэксты і творы жывапісу	«Пра метафару». Падрыхтаваць выразнае чытанне лірычнай мініяцюры З. Бядулі «Зямля», знайсці ў тэксце метафары і растлумачыць іх мастацкую ролю. Падрыхтаваць вусную замалёўку «Мая зямля» (з апорай на творы літаратуры і жывапісу)
26	Паўлюк Трус. «Падаюць сняжынкі...» (урывак з паэмы «Дзясяты падмурак») (1 гадзіна)	Выклікаць у вучняў эмацыянальнае ўзрушэнне ад сустрэчы з высокамастацкім творам, захапленне прыгажосцю і гармоніяй карціны зімовай прыроды; дапамагчы адчуць стан душы аўтара; засяродзіць увагу на вобразным і інтанацыйным ладзе верша. Удасканальваць уменне вучняў выразна чытаць паэтычныя творы	Тэкст твора П. Труса «Падаюць сняжынкі...» (урыўка з паэмы «Дзясяты падмурак») і метадычны апарат да яго. Рэпрадукцыя карціны Мацвея Беляніцкага «Мосцік» **Д/з**. Вывучыць на памяць урывак «Падаюць сняжынкі...» з паэмы «Дзясяты падмурак» П. Труса
27	Рыгор Барадулін. «Уцякала зіма ад вясны». Увасабленне ў літаратурным творы (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на паэтычнай адухоўленасці прыродных з'яў. Развіваць рэпрадуктыўнае і творчае ўяўленне вучняў, дапамагчы спасцігнуць вобразы і карціны прыроды, створаныя паэтам, багацце сродкаў мастацкага выяўлення ў вершы. Паглыбіць веды пра мастацкія тропы (эпітэт, параўнанне, метафару), растлумачыць сутнасць разнавіднасці метафары –	Верш Р. Барадуліна «Уцякала зіма ад вясны» і метадычны апарат да твора. Рэпрадукцыя карціны Мікалая Ліханенкі «Сакавік». Артыкул «Пра ўвасабленне» **Д/з**. Перачытаць артыкул

1	2	3	4
		увасаблення, на канкрэтных прыкладах прааналізаваць яго мастацкую функцыю	«Пра ўвасабленне», знайсці ўвасабленні ў вершы і патлумачыць іх мастацкую ролю. Падрыхтаваць выразнае чытанне твора (або вывучыць яго на памяць)
28	Янка Брыль. «Над зямлёй – прыгажосць неба...» (1 гадзіна)	Выклікаць у вучняў яркія зрокавыя і слыхавыя ўражанні ад сустрэчы з адлюстраваннем веснавой прыроды ў лірычнай мініяцюры Я. Брыля; дапамагчы заўважыць сувязь мастацкага апісання прыроды з характарам і настроем аўтара, вучыць шасцікласнікаў адрозніваць нюансы ў выяўленні аўтарскіх пачуццяў. Удасканальваць уменне вучняў выразна чытаць пейзажныя апісанні ў празаічным творы. Прааналізаваць рэпрадукцыі пейзажных палотнаў беларускіх мастакоў, сугучныя агульнаму настрою твора Я. Брыля (паводле настраёвасці, танальнасці, аўтарскай пазіцыі)	Тэкст лірычнай мініяцюры Я. Брыля і метадычны апарат да твора. Рэпрадукцыя карціны Фердынанда Рушчыца «Вясна» **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне тэксту, вытлумачыць ролю тропаў у стварэнні мастацкіх вобразаў. Самастойна прааналізаваць рэпрадукцыю карціны Ф. Рушчыца, супаставіць яе з літаратурным тэкстам Я. Брыля (па тэматыцы, настраёвасці, аўтарскай пазіцыі, мастацкай ідэі і інш.)
29	Анатоль Вялюгін. «Спелы бор» (1 гадзіна)	Выхоўваць эмацыянальную чуйнасць шасцікласнікаў, фарміраваць іх творчае ўяўленне, вобразнае ўспрыманне, вучыць адчуваць танальнасць, настраёвасць верша, спасцігаць пачуцці паэта. Паглыбіць уяўленні вучняў пра мастацкі вобраз у паэтычным творы, пра ролю вершаванага памеру, рытму, інтанацыі, моўных выяўленчых сродкаў у яго раскрыцці. Удасканальваць уменне выразна чытаць прыродаапісальныя вершы	Тэкст верша А. Вялюгіна «Спелы бор» і метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць выразнае чытанне верша А. Вялюгіна «Спелы бор» (або вывучыць на памяць). Скласці невялікую вусную замалёўку пра свае ўражанні ад наведвання лесу

1	2	3	4
30	Іван Мележ. «Першы іней» (урывак з рамана «Подых навальніцы») (1 гадзіна)	Далучыць вучняў да мастацкага свету пейзажнай прозы, звярнуць увагу на «фатаграфічную» дакладнасць апісання восеньскай прыроды ў творы; вучыць «бачыць» карціны навакольнага свету паводле аўтарскіх апісанняў; развіваць уменне шасцікласнікаў аналізаваць празаічныя пейзажныя замалёўкі, супастаўляць іх з творамі жывапісу, сугучнымі па тэматыцы і настроі	Тэкст урыўка з рамана І. Мележа «Подых навальніцы» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне ўрыўка. Скласці вусную пейзажную замалёўку з элементамі апісання паводле ўласных назіранняў за зімовай прыродай
31	Аляксей Коршак. «Кляновы ліст» (1 гадзіна)	Дапамагчы вучням уявіць карціну восені, створаную паэтам А. Коршакам. Развіваць увагу вучняў да слова і вобраза; вучыць супастаўляць вершаваныя і празаічныя пейзажы, блізкія па настраёвасці, танальнасці, пафасе. Звярнуць увагу шасцікласнікаў на спосабы выяўлення аўтарскіх пачуццяў у паэтычным і празаічным творах, вучыць супастаўляць літаратурныя творы з жывапісным палатном	Верш А. Коршака «Кляновы ліст», пытанні і заданні да яго. Рэпрадукцыя карціны Эдуарда Рымаровіча «Золата восені» **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне твора. Параўнаць верш А. Коршака «Кляновы ліст» з празаічным апісаннем восені ў творы І. Мележа «Першы іней»
32	Іван Грамовіч. «Воблакі» (1 гадзіна)	Настроіць вучняў на ўспрыманне маляўнічага пейзажнага апісання, дапамагчы ім спасцігнуць карціны, вобразы, фарбы, дэталі, таленавіта апісаныя аўтарам. Дапамагчы шасцікласнікам раскрыць мастацкую ролю вобразных сродкаў мовы ў апісанні прыроды і выяўленні пачуццяў пісьменніка	Тэкст апавядання І. Грамовіча «Воблакі», пытанні і заданні да яго. Рэпрадукцыя карціны Паўла Масленікава «Поўдзень» **Д/з.** Падрыхтавацца да выразнага чытання твора. Скласці вусную замалёўку з элементамі апісання «Воблакі — мары пра нязведанае»

1	2	3	4
33	**Урок развіцця маўлення** (1 гадзіна)	Арганізаваць экскурсію (звычайную ці завочную) у прыроду. Фарміраваць у вучняў уменні эмацыянальна ўспрымаць навакольную прыроду, заўважаць у ёй выразныя падрабязнасці і дэталі, колеры і фарбы, маляваць словамі цэласную карціну, перадаваць свае ўражанні праз канкрэтныя вобразы. Дапамагчы шасцікласнікам падрыхтаваць калектыўную вусную замалёўку на падставе ўласных назіранняў	**Д/з.** Падрыхтаваць вуснае сачыненне-мініяцюру (на падставе ўласных назіранняў ці з апорай на творы літаратуры і жывапісу). Прыкладныя тэмы: «Усход сонца», «Летняя раніца (у горадзе, лесе, полі, на лузе, возеры)», «Першы гром», «Зімовая казка» і інш.
V. ЛІТАРАТУРА ЯК ЧАЛАВЕКАЗНАЎСТВА (8 гадзін) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Чалавек – гэта цэлы свет»**			
34	Алена Васілевіч. «Сябры». Апавяданне як літаратурны жанр (2 гадзіны)	Развіваць уменні вучняў уважліва чытаць вострасюжэтны твор, сачыць за развіццём дзеяння, вызначаць асноўныя эпізоды і эпізоды, важныя для характарыстыкі герояў; звяртаць увагу падлеткаў на спосабы абмалёўкі чалавечых характараў і выяўлення аўтарскіх адносін да герояў і падзей. Узнавіць і паглыбіць веды вучняў пра жанр апавядання і пра сюжэт у літаратурным творы	Тэкст твора А. Васілевіч «Сябры» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Перачытаць твор, скласці яго план, адказаць на пытанні. Вызначыць эпізоды, важныя для характарыстыкі Лёні і Грышы, і ўмець падрабязна пераказаць іх
35		Прааналізаваць ключавыя эпізоды апавядання, звярнуць увагу вучняў на характары Лёні і Грышы, іх паводзіны і адносіны паміж сабой і з сябрамі, на спосабы абмалёўкі вобразаў у творы, пазіцыю аўтара. Прапанаваць шасцікласнікам прыкладны план характарыстыкі героя ў празаічным творы, дапамаг-	Тэкст апавядання А. Васілевіч «Сябры» і метадычны апарат да яго. Артыкул «Пра апавяданне» **Д/з.** Прачытаць артыкул вучэбнага дапаможніка

1	2	3	4
		чы ахарактарызаваць кожнага з герояў паводле іх паводзін, перажыванняў, разважанняў, мовы, аўтарскіх адносін	«Пра апавяданне». Падрыхтаваць параўнальную характарыстыку Лёні і Грышы (звярнуць увагу на паводзіны хлопцаў, узаемаадносіны з бацькамі, аднакласнікамі і настаўнікамі, на стаўленне да вучобы і іншых абавязкаў і г. д.)
36	Кузьма Чорны. «Насцечка». Аповесць як літаратурны жанр (5 гадзін)	Зацікавіць вучняў падзеямі, апісанымі ў аповесці, выклікаць да актыўнага суперажывання героям, дапамагчы асэнсаваць і ацаніць паводзіны Насцечкі, Сержа, старога Закрэўскага (звяртаючы ўвагу на апісанні знешняга выгляду персанажаў, іх манеры трымацца, гаварыць і г. д.), зразумець аснову канфлікту паміж героямі	Тэкст двух першых раздзелаў аповесці К. Чорнага «Насцечка», пытанні і заданні да іх **Д/з.** Перачытаць раздзелы 1—2 аповесці, вызначыць эпізоды, важныя для разумення характараў Насцечкі, Сержа, старога Закрэўскага
37		Засяродзіць увагу вучняў на аналізе падзей, адлюстраваных у трэцім раздзеле аповесці. Назапашваць матэрыял для аналізу паводзін Сержа, разгледзець яго стасункі са старым Закрэўскім і Мішкам. Засяродзіць увагу на адносінах Сержа з бацькамі, выявіць сапраўдныя прычыны паводзін Сержа дома, у школе, на вуліцы	Тэкст аповесці К. Чорнага «Насцечка» (раздзел 3), метадычны апарат да яго **Д/з.** Прачытаць раздзел 3 аповесці, расказаць, як паводзіў сябе Серж дома, як складваліся ў яго адносіны з бацькамі

1	2	3	4
38		Разгледзець раздзелы 4—5 тэксту, сачыць за развіццём падзей, вылучыць ключавыя эпізоды, у якіх раскрываюцца характары герояў. Дапамагчы вучням зразумець значэнне ўспамінаў Сержавага бацькі пра сваю маладосць у наладжванні яго адносін з сынам. Удасканальваць набытыя раней уменні працаваць з празаічным тэкстам, назапашваць матэрыял для пісьмовай працы	Тэкст аповесці К. Чорнага «Насцечка» (раздзелы 4—5), метадычны апарат да іх **Д/з**. Прачытаць раздзелы 4—5, адказаць на пытанні. Апісаць знешні выгляд Насцечкі, паразважаць над яе характарам і паводзінамі, прааналізаваць адносіны з сяброўкамі і дзядулем
39		Прыгадаць і разгледзець асноўныя эпізоды раздзелаў 6—7 аповесці, падрабязна прааналізаваць фінал твора — з'яўленне Сержа і яго бацькоў у кватэры Закрэўскіх. Звярнуць увагу на паводзіны кожнага з герояў — старога Закрэўскага, Сержа і яго бацькоў, Насцечкі і яе матулі	Тэкст аповесці К. Чорнага і метадычны апарат да твора **Д/з**. Дачытаць тэкст аповесці і адказаць на пытанні да двух апошніх раздзелаў. Перачытаць артыкул «Пра аповесць», ведаць асноўныя прыкметы аповесці як літаратурнага жанру
40		Падвесці вынікі вывучэння аповесці К. Чорнага «Насцечка», высветліць адносіны вучняў да твора, узгадаць эпізоды, якія больш зацікавілі шасцікласнікаў, ахарактарызаваць учынкі Сержа, параўнаць яго ўласную ацэнку сваіх «подзвігаў» з ацэнкай бацькоў, настаўніцы, Закрэўскага, дзяўчатак. Засяродзіць увагу на жанравых уласцівасцях і мастацкіх адметнасцях твора	Тэкст аповесці К. Чорнага і метадычны апарат да твора **Д/з**. Падрыхтаваць вусную характарыстыку Сержа (апісаць знешні выгляд, манеру трымацца, раскрыць яго стасункі з аднакласнікамі, настаўніцай, бацькамі, старым Закрэўскім), выказаць свае адносіны да героя

1	2	3	4
41	**Урок развіцця маўлення** (1 гадзіна)	Даць вусную характарыстыку аднаму з герояў аповесці К. Чорнага «Насцечка» (апісаць знешні выгляд, паводзіны, узаемаадносіны з іншымі дзейнымі асобамі, выявіць аўтарскае стаўленне да героя і свае адносіны). Развіваць і ўдасканальваць уменне вучняў самастойна працаваць над тэкстам	Тэкст аповесці К. Чорнага і метадычны апарат да твора
42	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка або вучняў)	
VI. ТЭМЫ І ВОБРАЗЫ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (20 гадзін) **Гістарычная тэма (5 гадзін)** **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Покліч мінулых стагоддзяў»**			
43	Уладзімір Бутрамееў. «Славутая дачка Полацкай зямлі» (1 гадзіна)	Пашырыць веды вучняў пра славутую палачанку Рагнеду, пра далёкія часы і падзеі айчыннай гісторыі. Пазнаёміць з празаічным апісаннем жыццёвага лёсу гераіні, звярнуць увагу шасцікласнікаў на ўзаемаадносіны Рагнеды са сваякамі, мужам Уладзімірам і сынам Ізяславам. Удасканальваць уменне аналізаваць твор жывапісу	Тэкст твора У. Бутрамеева «Славутая дачка Полацкай зямлі». Рэпрадукцыя карціны Алега Карповіча «Рагнеда і Ізяслаў» **Д/з.** Перачытаць твор У. Бутрамеева, адказаць на пытанні
44	Лявон Случанін. «Рагнеда» (урыўкі з паэмы) (1 гадзіна)	Параўнаць паэтычнае апісанне жыцця Рагнеды з празаічным (творы У. Бутрамеева і Л. Случаніна), стварыць з дапамогай літаратурных тэкстаў і твораў жывапісу цэласнае ўяўленне пра Рагнеду; звярнуць увагу вучняў на спосабы абмалёўкі гераіні (гераізацыя і рамантызацыя асобы, псіхалагічная матывіроўка паводзін і ўчынкаў, спалучэнне пэўнай долі мастацкага	Тэкст урыўка з паэмы Л. Случаніна «Рагнеда», пытанні да твора **Д/з.** Знайсці дадатковыя звесткі пра Рагнеду (скарыстаць адпаведныя літаратурныя крыніцы, даведнікі і інш.).

1	2	3	4
		вымыслу з дакументальна пацверджанымі фактамі і інш.)	Асэнсаваць і абагульніць атрыманую інфармацыю пра Рагнеду і падрыхтаваць вуснае паведамленне пра яе
45	Сяргей Тарасаў. «Еўфрасіння Полацкая» (2 гадзіны)	Прааналізаваць час і месца дзеяння ў творы. Засяродзіць увагу вучняў на вобразе ігумені Еўфрасінні Полацкай. Узнавіць і пашырыць веды вучняў пра беларускую асветніцу і святую. Разгледзець і прааналізаваць рэпрадукцыю карціны Сяргея Лагуновіча-Чарапко «Еўфрасіння Полацкая»	Тэкст апавядання С. Тарасава «Еўфрасіння Полацкая» і метадычны апарат да твора. Рэпрадукцыя карціны С. Лагуновіча-Чарапко «Еўфрасіння Полацкая» **Д/з.** Перачытаць апавяданне С. Тарасава «Еўфрасіння Полацкая», адказаць на пытанні падручніка
46		Пазнаёміць вучняў з мастацкім увасабленнем Еўфрасінні ў творах жывапісу і выявіць непасрэдныя вучнёўскія ўражанні; супаставіць вобраз Еўфрасінні Полацкай у творах літаратуры і жывапісу. Дапамагчы вучням асэнсаваць веліч постаці асветніцы, яе ролю ў беларускай гісторыі і культуры	**Д/з.** Самастойна прачытаць апавяданне С. Тарасава «Фрэскі». Падрыхтаваць вуснае выказванне (на падставе літаратурных твораў, рэпрадукцый карцін жывапісу, іншых крыніц) пра Еўфрасінню Полацкую

1	2	3	4
47	Генрых Сянкевіч. «Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны» (урыўкі з рамана «Крыжакі») (1 гадзіна)	Выклікаць эмацыянальную рэакцыю вучняў на мастацкае апісанне Грунвальдскай бітвы; пашырыць набытыя на ўроках гісторыі веды пра падзею тых далёкіх часоў пры дапамозе створанай пісьменнікам мастацкай карціны славутай бітвы; засяродзіць увагу на спосабах стварэння вобразаў яе герояў — ліцвінскага князя Вітаўта Вялікага і вялікага магістра Тэўтонскага ордэна барона Ульрыка фон Юнгінгена; паказаць ролю сродкаў мастацкага выяўлення (выразнасць і дакладнасць апісанняў, псіхалагічная матывіроўка паводзін ваяроў, багацце гукаў і фарбаў у апісанні бітвы, экспрэсія ў перадачы падзей і інш.)	Тэкст урыўка з рамана «Крыжакі» Г. Сянкевіча «Незабыўная старонка славянскай мінуўшчыны», метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне твора, адказы на пытанні. Знайсці ў тэксце і пракаменціраваць апісанні знешняга выгляду і паводзіны галоўных кіраўнікоў бітвы пад Грунвальдам Вітаўта Вялікага, Ульрыка фон Юнгінгена і польскага караля Ягайлы
Ваенная тэма (6 гадзін)			
Раздзел вучэбнага дапаможніка «Вайна — боль і памяць народа»			
48	Мікола Сурначоў. «У стоптаным жыце» (1 гадзіна)	Расказаць пра жыццёвы лёс аўтара верша — паэта Міколу Сурначова. Давесці да вучняў шчырасць, цеплыню, задушэўнасць лірычнага ўспаміну пра вайну, выклікаць эмацыянальную рэакцыю на падзеі тых далёкіх часоў, суперажыванне лёсу героя	Верш М. Сурначова «У стоптаным жыце», метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша або вывучыць твор на памяць

1	2	3	4
49	Аляксей Пысін. «Проня» (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на спасціжэнні ідэйна-мастацкага зместу верша, на сродках перадачы пачуццяў аўтара (экспрэсіўнасць выказвання, арыгінальнасць формы, адметнасці рытму, багацце сродкаў мастацкага выяўлення). Удасканальваць уменне вучняў параўноўваць сюжэтныя вершы, блізкія па тэматыцы (на прыкладзе вершаў М. Сурначова і А. Пысіна)	Верш А. Пысіна «Проня» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Параўнаць вершы М. Сурначова «У стоптаным жыце» і А. Пысіна «Проня» (па тэматыцы, праблематыцы, будове, вобразах, моўных выяўленчых сродках, гучанні, аўтарскай пазіцыі). Вывучыць адзін з вершаў на памяць
50	Анатоль Вярцінскі. «Два полі» (1 гадзіна)	Удасканальваць уменне вучняў аналізаваць паэтычныя сюжэтныя творы (вызначыць тэму, ідэю, пафас, асноўныя вобразы, сродкі мастацкага выяўлення, аўтарскую пазіцыю). Дапамагчы вучням прааналізаваць верш «Два полі» А. Вярцінскага, абапіраючыся на пытанні, змешчаныя ў падручніку	Верш А. Вярцінскага «Два полі», метадычны апарат да яго **Д/з.** Падрыхтаваць параўнальны аналіз праграмных вершаў пра вайну (М. Сурначова «У стоптаным жыце», А. Пысіна «Проня», А. Вярцінскага «Два полі»)
51	Вячаслаў Адамчык. «Салодкія яблыкі». Мастацкі вобраз у літаратурным творы (3 гадзіны)	Пазнаёміць вучняў з героямі твора, звярнуць увагу на час і месца дзеяння, прасачыць за развіццём сюжэта, выдзеліць ключавыя эпізоды і эпізоды, важныя для характарыстыкі Тоніка (дзіцячыя забавы на рэчцы, наведванне хлопчыкам Жолудзевай хаты, прыход да Тоніка паліцаяў)	Тэкст апавядання В. Адамчыка «Салодкія яблыкі», метадычны апарат да твора **Д/з.** Прачытаць раздзелы 1—2 апавядання, адказаць на пытанні, умець сцісла пераказаць асноўныя эпізоды згаданых раздзелаў твора

1	2	3	4
52		Прааналізаваць змест трох наступных раздзелаў апавядання, разгледзець асноўныя эпізоды твора, вучыць вызначаць ролю асобнага эпізоду ў раскрыцці галоўнай ідэі твора. Паглыбіць веды вучняў пра ролю апісанняў і бытавых дэталяў у раскрыцці характару героя літаратурнага твора	Тэкст апавядання В. Адамчыка «Салодкія яблыкі» і метадычны апарат да яго **Д/з.** Дачытаць твор, скласці падрабязны цытатны план апавядання, назапашваць матэрыял для характарыстыкі Тоніка
53		Паглыбіць веды вучняў пра мастацкі вобраз у літаратурным творы, удасканальваць іх уменні характарызаваць героя паводле яго паводзін, учынкаў, перажыванняў. Паказаць ролю мастацкіх дэталяў, дыялогаў, аўтарскіх апісанняў у раскрыцці характару героя. Засяродзіць увагу шасцікласнікаў на характарыстыцы вобразаў твора і спосабах іх абмалёўкі	Тэкст апавядання В. Адамчыка «Салодкія яблыкі». Артыкул «Пра мастацкі вобраз» **Д/з.** Перачытаць і асэнсаваць тэарэтычны артыкул пра мастацкі вобраз у літаратурным творы. Падрыхтаваць вусную разгорнутую характарыстыку Арсеніка
54	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка)	
Экалагічная тэма (7 гадзін) Раздзел вучэбнага дапаможніка «Зямля мая — зялёны дом»			
55	Пімен Панчанка. «Сармацкае кадзіла» (1 гадзіна)	Данесці да вучняў галоўную думку, увасобленую ў творы: занядбанне, спусташэнне прыроды, абыякавасць да яе — непазбежнае збядненне чалавека; спрыяць спасціжэнню патрыятычнага і гуманістычнага пафасу верша. Пашырыць уяўленні вучняў пра свет	Верш П. Панчанкі «Сармацкае кадзіла» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Выразнае чытанне верша П. Панчанкі «Сармацкае

1	2	3	4
		роднай прыроды, яе прыгажосць, багацце, непаўторнасць, шматколернасць	кадзіла». Падрыхтаваць замалёўку на тэму «У чым праяўляецца любоў чалавека да прыроды, да роднай зямлі?»
56	Іван Пташнікаў. «Алені» (3 гадзіны)	Увесці вучняў у мастацкі свет твора (знаёмства з часам і месцам дзеяння, падзеямі, героямі), асноўную ўвагу скіраваць на майстэрства пісьменніка ў абмалёўцы прыроды. Данесці да шасцікласнікаў гуманістычны пафас твора, ідэю дабрыні, духоўнай шчырасці і прыгажосці, міласэрнасці чалавека да прыроды (на прыкладзе адносін Іркі да аленяў)	Тэкст апавядання І. Пташнікава «Алені», метадычны апарат да твора **Д/з**. Прачытаць першую палову твора, адказаць на пытанні, вызначыць эпізоды, важныя для характарыстыкі галоўнай гераіні твора — дзяўчынкі Іркі
57		Прааналізаваць другую палову апавядання, разгледзець асноўныя эпізоды, звярнуць увагу на паводзіны дарослых, высветліць прычыны іх душэўнай чэрстваспі. Разгледзець рэпрадукцыю карціны Галіны Шапялевіч «У пушчы», параўнаць свет прыроды, створаны мастаком і пісьменнікам	Тэкст апавядання І. Пташнікава «Алені», метадычны апарат да твора. Рэпрадукцыя карціны Галіны Шапялевіч «У пушчы» **Д/з**. Дачытаць апавяданне, прааналізаваць рэпрадукцыю карціны Г. Шапялевіч
58		Акрэсліць тэму і асноўную ідэю апавядання; прасачыць, як паказвае пісьменнік перажыванні і хваробу Іркі, як раскрываецца пазіцыя аўтара, яго стаўленне да герояў і падзей. Выхоўваць у вучняў гуманныя, беражлівыя адносіны да прыроды	Тэкст апавядання І. Пташнікава «Алені» **Д/з**. Падрыхтаваць вусную замалёўку на адну з тэм: «Ірка і яе алені», «Ірчына пушча», «Свет Ірчыных захапленняў»

1	2	3	4
59	Алесь Жук. «Стары бабёр» (урывак з аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля») (1 гадзіна)	Высветліць уражанні вучняў ад твора (што ўсхвалявала, што асабліва ўразіла і запомнілася); прыгадаць гісторыю старога бабра (яго ранейшае жыццё, як апынуўся ў новай мясцовасці, чаму вымушаны на старасці шукаць сабе новае жытло, што змянілася ў прыродзе на яго памяці), пракаменціраваць паводзіны бабра падчас яго вандроўкі. Звярнуць увагу вучняў на адухоўленасць аўтарскіх апісанняў, адносіны аўтара да свайго героя	Тэкст твора А. Жука «Стары бабёр» (урывак з аповесці «Паляванне на Апошняга Жураўля») і метадычны апарат да твора **Д/з**. Прачытаць тэкст, адказаць на пытанні, падрыхтаваць вусны аповед пра старога бабра
60	Янка Маўр. «Багіра». Кампазіцыя літаратурнага твора (2 гадзіны)	Выклікаць эмацыянальны водгук шасцікласнікаў на твор Я. Маўра, прыгадаць паводзіны Багіры на вуліцы і ў хаце, ацаніць дзеянні людзей, што аказаліся побач з Багірай. Выхоўваць любоў і пашану да ўсяго жывога на зямлі, падвесці вучняў да думкі, што кожная жывая істота мае права на жыццё	Тэкст апавядання Я. Маўра «Багіра» і метадычны апарат да твора **Д/з**. Перачытаць апавяданне Я. Маўра «Багіра». Падрыхтаваць вусную замалёўку «Лёс Багіры»
61		Засяродзіць увагу падлеткаў на будове апавядання, прааналізаваць размяшчэнне эпізодаў, дыялогаў, апісанняў у тэксце. Даць пачатковае ўяўленне пра кампазіцыю літаратурнага твора	Тэкст апавядання Я. Маўра «Багіра» і метадычны апарат да яго. Артыкул «Пра кампазіцыю» **Д/з**. Перачытаць артыкул «Пра кампазіцыю». Прааналізаваць будову апавядання Я. Маўра «Багіра»

1	2	3	4
62	Пімен Панчанка. «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...» (1 гадзіна)	Удасканальваць уменні вучняў аналізаваць лірычныя творы, успрымаць іх вобразны лад, спасцігаць аўтарскія перажыванні, выразна чытаць вершы, каб данесці да слухачоў агульны пафас твора і выявіць сваё разуменне тэксту, перадаць свае адносіны	Верш П. Панчанкі «Вясёлай маланкаю ластаўка бліскае...», метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае чытанне верша. Скласці вусную замалёўку пра свайго хатняга сябра (кошку, сабаку, іншую жывёліну)
63	**Урок развіцця маўлення** (1 гадзіна)	Падрыхтаваць вуснае сачыненне з элементамі апісання і разважання пра свае стасункі з любой жывой істотай або даць свае прапановы (распрацаваць план), як зберагчы куточак прыроды (лес, луг, рэчку, вуліцу, парк, сад) у сваёй мясцовасці	
Алегарычныя і сатырычныя вобразы (2 гадзіны) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «І досціп, і мудрасць»**			
64	Якуб Колас. «Конь і сабака» (1 гадзіна)	Прааналізаваць змест байкі, звярнуць увагу на вобраз Рудзькі, ацэнку яго паводзін малымі дзецьмі. Пашырыць уяўленне вучняў пра байку як літаратурны жанр, раскрыць асноўныя састаўныя кампаненты байкі, паказаць пераемнасць тэм, сюжэтаў, вобразаў у байках розных народаў	Байка Я. Коласа «Конь і сабака», метадычны апарат да твора. Артыкул «Пра байку» **Д/з.** Перачытаць артыкул «Пра байку». Падрыхтаваць выразнае чытанне байкі Я. Коласа «Конь і сабака»
65	Уладзімір Корбан. «Малпін жарт». Байка як літаратурны жанр (1 гадзіна)	Разгледзець калізію байкі «Малпін жарт» У. Корбана, прааналізаваць учынак Малпы, сфармуляваць галоўную думку байкі. Удасканальваць уменне шасцікласнікаў выразна чытаць байкі і інсцэніраваць асобныя эпізоды, разумець іх падтэкст, каменціраваць мараль	Байка У. Корбана «Малпін жарт», метадычны апарат да твора. Тэкст апавядання Я. Брыля «Ветэрынар» **Д/з.** Падрыхтаваць выразнае

1	2	3	4
			чытанне байкі. Самастойна прачытаць і прааналізаваць апавяданне Я. Брыля «Ветэрынар»
VII. ФАНТАСТЫКА (4 гадзіны) **Раздзел вучэбнага дапаможніка «Святло далёкай зоркі»**			
66	**Фантастыка** Раіса Баравікова. «Гальштучнік» (урывак з «Аповесці чатырох падарожжаў» (2 гадзіны)	Даць агульнае ўяўленне пра фантастыку (далучыць да тлумачэння фантастычнага жанру літаратуры рэпрадукцыі карцін Язэпа Драздовіча, іншых беларускіх мастакоў). Увесці вучняў у кола падзей «Аповесці чатырох падарожжаў», прасачыць за фантастычнымі падзеямі, што разгортваюцца ў прапанаваным фрагменце твора, – вяртанне астранаўтаў з касмічнага падарожжа, наведванне імі невядомай Зялёнай планеты, сустрэча з яе жыхарамі	Тэкст урыўка з «Аповесці чатырох падарожжаў» Р. Баравіковай. Артыкул «Пра фантастыку». Рэпрадукцыя карціны Я. Драздовіча «Пейзаж на Сатурне» **Д/з**. Перачытаць артыкул «Пра фантастыку». Прачытаць вызначаную настаўнікам частку твора, падрыхтаваць яе падрабязны пераказ
67		Засяродзіць увагу на гуманістычным пафасе твора, яго займальным сюжэце, незвычайных, фантастычных героях, якія дзейнічаюць поруч з доктарам Савічам, на тых пераменах, што адбыліся ў яго паводзінах пасля міжпланетнай вандроўкі і сустрэчы з гуманоідамі. Прааналізаваць вобраз загадкавай	Тэкст урыўка з «Аповесці чатырох падарожжаў» Р. Баравіковай **Д/з**. Дачытаць твор. Выказаць свае адносіны да герояў і падзей. Падрыхтаваць

1	2	3	4
		істоты, яе чароўнае пераўвасабленне на Зямлі ў птушку з дзіўнай палоскай-гальштукам	вусную замалёўку на адну з тэм: «Таямніца дзіўнай птушкі», «Вандроўка доктара Савіча» (на выбар)
68	Дзінтрэ Шулцэ. «Роберцік» (1 гадзіна)	Засяродзіць увагу вучняў на апісанні незвычайнай планеты Фаіс, на вобразе робата Роберціка – штучнага механізма, створанага чалавекам, – на яго адносінах з Увісам і іншымі астранаўтамі, на пераўвасабленні робата (пасля вандроўкі на Зямлю) у істоту з тонкай душэўнай арганізацыяй, абвостранымі пачуццямі, іншым стаўленнем да сваіх ранейшых абавязкаў	Тэкст апавядання Д. Шулцэ «Роберцік» і метадычны апарат да твора **Д/з.** Падрыхтаваць вусную замалёўку пра Роберціка, улічваючы традыцыйныя прыёмы стварэння мастацкага вобраза (партрэт, учынкі, паводзіны, мова, адносіны з іншымі персанажамі, аўтарская характарыстыка)
69	**Урок пазакласнага чытання** (1 гадзіна)	Разгляд твора, прапанаванага праграмай для пазакласнага чытання (на выбар настаўніка або вучняў)	
70	**Абагульняльны ўрок** (1 гадзіна)	Падвесці вынікі навучальнага года, высветліць уражанні шасцікласнікаў ад курса літаратуры, акрэсліць будучыя перспектывы, даць вучням парады для чытання ўлетку	

Рэкамендаваная вучэбна-метадычная літаратура

Беларуская мова

Тумаш, Г. В. Беларуская мова. 5 клас. Рабочы сшытак / Г. В. Тумаш. — Мінск : Аверсэв, 2012.

Тумаш, Г. В. Беларуская мова. 6 клас. Рабочы сшытак / Г. В. Тумаш. — Мінск : Аверсэв, 2012.

Міхайлаў, П. А. Беларуская мова. 6 клас. Дыктанты, пераказы, пераклады / П. А. Міхайлаў [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2005.

Міхайлаў, П. А. Беларуская мова. 5 клас. Карткі-заданні / П. А. Міхайлаў [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2009.

Новікава, Г. Д. Беларуская мова. 5 клас. Апорныя канспекты. — Мінск : Аверсэв, 2011, 2012.

Бадзевіч, З. І. Пішам па-беларуску. Даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі / З. І. Бадзевіч [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2010, 2011.

Слоўнікі

Бардовіч, А. М. Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2004, 2006.

Бардовіч, А. М. Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2006.

Кандраценя, І. У. Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў / І. У. Кандраценя [і інш.] ; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск : Аверсэв, 2010, 2011.

Бандарэнка, Н. Д. Разам, асобна, праз злучок. Даведнік / Н. Д. Бандарэнка [і інш.] ; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск : Аверсэв, 2011.

Беларуская літаратура

Верціхоўская, В. У. Вывучэнне творчасці Ф. Скарыны ў школе / В. У. Верціхоўская, М. І. Верціхоўская. — Мінск : Аверсэв, 2006.

Грамадчанка, Т. К. Школьныя творы : Кароткі змест і аналіз / Т. К. Грамадчанка. — Мінск : Аверсэв, 2010.

Бельскі, А. І. Сучасная літаратура Беларусі / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2000.

Ішчанка, Г. М. Вывучэнне творчасці пісьменніка : У. Караткевіч у школе / Г. М. Ішчанка. — Мінск : Аверсэв, 2005.

Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці пісьменніка : Іван Мележ у школе / В. Я. Ляшук. — Мінск : Аверсэв, 2006.


Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Янкі Брыля ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2004.
Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2008.
Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Максіма Танка ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2009.
Ляшук, В. Я. Вывучэнне творчасці Францыска Багушэвіча ў школе / В. Я. Ляшук. – Мінск : Аверсэв, 2009.

Для запісаў

www.aversev.by

Выдавецтва «АВЕРСЭВ»

прапануе наступныя выданні:



**Беларуская мова.
5 клас.
Апорныя канспекты**

Г.Д. Новікава

3-е выданне


Дапаможнік складзены на аснове тэарэтычнага матэрыялу параграфаў школьнага падручніка і адпавядае вучэбнай праграме. Адрасуецца вучням і настаўнікам.

*Рэкамендавана
Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

У кнігарнях рэспублікі!

Выдавецтва «АВЕРСЭВ»

прапануе наступныя выданні:



Беларуская мова. Навучальныя і кантрольныя дыктанты. 5–9 класы

Г. М. Валочка, Л. М. Гамеза, І. У. Булаўкіна, В. У. Зелянко, І. М. Саматыя, С. С. Міхнёнак, С. М. Якуба

Зборнік змяшчае тэксты ўсіх відаў навучальных, а таксама кантрольных дыктантаў, якія прадугледжаны для напісання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання.

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь




Беларуская літаратура. Зборнік творчых заданняў для тэматычнага кантролю. 5–9 класы

І. М. Гоўзіч, М. У. Грынько, А. В. Руцкая, В. У. Праскаловіч, В. І. Русілка, В. В. Кушнярэвіч

Беларуская літаратура. Зборнік творчых заданняў для тэматычнага кантролю. 10–11 класы

І. М. Гоўзіч, М. У. Грынько, А. В. Руцкая, В. У. Праскаловіч, В. І. Русілка, В. В. Кушнярэвіч



У зборніках упершыню даюцца творчыя заданні да кожнага з блокаў-раздзелаў вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для 5–11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. Прапанаваныя ў кнігах заданні могуць быць выкарыстаны настаўнікам для ажыццяўлення розных відаў кантролю і ацэнкі якасці засваення вучнямі асноўнага вучэбнага матэрыялу, а таксама выяўлення дынамікі змянення ўзроўню сфарміраванасці ў іх вопыту літаратурна-творчай дзейнасці.

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

У кнігарнях рэспублікі!


Выдавецтва «АВЕРСЭВ»

прапануе наступныя выданні:

Дапаможнікі прызначаны для выкарыстання на факультатыўных занятках па беларускай мове ў 5–9 класах. Змешчаны ў кнігах тэарэтычны і практычны матэрыял накіраваны на замацаванне і сістэматызацыю ведаў, удасканаленне ўменняў і навыкаў па адпаведных раздзелах вучэбнай праграмы, развіццё культуры вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў.

Адрасаваны вучням і настаўнікам беларускай мовы.

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь




Беларуская мова. 5 клас.
Грані слова: ад гука да сказа

Дапаможнік для вучняў

Л. М. Гамеза

2-е выданне




Беларуская мова. 6 клас.
Сакрэты словазмянення і формаўтварэння

Дапаможнік для вучняў

С. М. Якуба

3-е выданне



Беларуская мова. 5–9 класы.
Вывучаем беларускі правапіс

Дапаможнік для вучняў


Г. М. Валочка, В. У. Зелянко

3-е выданне

У кнігарнях рэспублікі!

Выдавецтва «АВЕРСЭВ»


прапануе наступныя выданні:



Беларуская мова. 5 клас. Рабочы сшытак

Г. В. Тумаш


11-е выданне



Беларуская мова. 6 клас. Рабочы сшытак

Г. В. Тумаш

10-е выданне




Беларуская мова. 7 клас. Рабочы сшытак

Л. Ф. Леўкіна, Г. В. Тумаш

9-е выданне

Рабочыя сшыткі з'яўляюцца неад'емнай часткай вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай мове. Матэрыял у іх размешчаны ўадпаведнасці з паслядоўнасцю тэм падручнікаў і служыць карысным дадаткам для паспяховага авалодання мовай. Заданні і практыкаванні прапануюцца розных узроўняў складанасці, маюць творчы характар, развіваюць здольнасці вучняў.



Беларуская мова. 8 клас. Рабочы сшытак

Г. В. Тумаш

7-е выданне

Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

У кнігарнях рэспублікі!

2012/2013
навучальны год

Беларуская мова і літаратура

5-6 *класы*

Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне

ISBN 978-985-19-0154-4

